WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

7 чэрвеня 2011 г.
АЎТОРАК
№ 104 (26968)
Кошт 750 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

УРАД ЗАЦВЕРДЗІЎ ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЗБАЛАНСАВАНАГА РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ

У БЕЛАРУСІ БУДУЦЬ АДМЕНЕНЫ ЛЬГОТЫ ПА АБАВЯЗКОВЫМ ПРОДАЖЫ ЗАМЕЖНАЙ ВАЛЮТЫ

Такое рашэнне павінна быць прынята Нацыянальным банкам Беларусі і Міністэрствам эканомікі да 15 чэрвеня. Гэта прадугледжана ў плане дзеянняў урада Беларусі па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курсу беларускага рубля. План быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 662 ад 25 мая 2011 года. Цяпер гэта пастанова і план размешчаны на афіцыйным сайце беларускага ўрада.

У адпаведнасці з раздзелам плана, які змяшчае меры па рэгуляванні сітуацыі на валютным рынку, у Беларусі прадугледжана «адмена льгот па абавязковым продажы замежнай валюты ў мэтах пашырэння доступу суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці да набыцця замежнай валюты для абслугоўвання знешняга карпаратыўнага доўгу».

Дакументам таксама прадугледжана прадастаўленне магчымасці выплаты падаткаў і збораў (пошлін) у замежнай валюце. Адказныя выканаўцы па гэтым рашэнні — Мінфін і Мінэканомікі, якія павінны падрыхтаваць адпаведны дакумент да 10 чэрвеня. Акрамя таго, плануецца ўнесці змяненні ў дзеючы парадак уліку курсавых розніц у мэтах мінімізацыі іх уплыву на фінансавы стан арганізацый.

СТАР. 2

Беларусь атрымае крэдыт з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС у памеры $3 млрд

Адпаведнае рашэнне было адобрана на праведзеным 4 чэрвеня ў Кіеве пасяджэнні Савета Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Крэдыт будзе выдзелены часткамі на працягу 3 гадоў. Ён выдаецца на 10 гадоў з ільготным перыядам адтэрміноўкі пагашэння на 3 гады. У 2011 годзе будзе выдзелена $1,24 млрд, у тым ліку першы транш у памеры $800 млн паступіць на працягу 10-15 дзён. Да канца года па прадастаўленых урадам Беларусі індыкатарах стабільнасці фінансавай сітуацыі будзе выдзелены другі транш у памеры $440 млн. Стаўка выдзеленага крэдыту плаваючая, яна будзе вызначацца з улікам знешніх пазык Расійскай Федэрацыі і Казахстана, зыходзячы з рэйтынгаў гэтых краін. Як адзначыў кіраўнік Мінфіна Расіі Аляксей Кудрын, стаўка, якая складае каля 4 працэнтаў, на сёння вельмі нізкая.

Сяргей Румас абмяркоўвае з місіяй МВФ пытанні стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы Беларусі

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Румас абмяркоўвае з місіяй МВФ, якую ўзначальвае ў нашай краіне Крыс Джарвіс, пытанні стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы Беларусі, перадае БЕЛТА.

«Я хачу абмеркаваць, як развіваецца сітуацыя ў Беларусі, што змянілася ў параўнанні з папярэдняй місіяй», — сказаў ён. Звяртаючыся да прадстаўнікоў МВФ, Сяргей Румас адзначыў: «Вы ведаеце, што ў суботу антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС прыняў станоўчае рашэнне. Я нават ведаю, што ў вас ёсць матрыца, якую мы падпісалі з антыкрызісным фондам, і два пісьмы, якія ішлі разам з ёй».

СТАР. 2

белагропромбанк
традиции будущего

В соответствии с условиями
договоров срочного банковского вклада (депозита)
ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
СООБЩАЕТ ОБ УВЕЛИЧЕНИИ С 07 ИЮНЯ 2011 ГОДА
ДО 23% ГОДОВЫХ
РАЗМЕРА ОСНОВНОЙ ПРОЦЕНТНОЙ СТАВКИ
ПО ДОГОВОРАМ СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА
(ДЕПОЗИТА) «ДВАДЦАТКА»,
заключенным в период с 21.03.2011 по 06.06.2011 года.

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
Время работы Контакт-центра Банка: 8.00–20.00 в будние дни;
8.00–18.00 в выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

ОАО «Белагропромбанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 № 2. УНП 100693551

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА

ПА МАЛАДОЕ СЕНА

Жыхары вёскі Багамолаўка Буда-Кашалёўскага раёна Валянціна ШКРАБАВА і Міхаіл ЦІТКОЎ запрагаюць адзінага вясковага коніка на сена.

белагропромбанк
традиции будущего

ТАБЛИЦА ПРОЦЕНТНЫХ СТАВОК ПО СРОЧНОМУ БАНКОВСКОМУ ВКЛАДУ (ДЕПОЗИТУ) ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»
с 07 июня 2011 г.

Сумма депозита, ед. валюты	Вклады (депозиты) с плавающими процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000	3 000	Вклады (депозиты) с фиксированными процентными ставками, % годовых: Срок, дни 100	200	300	500	1 000	2 000
Белорусские рубли													
1 – 1 000 000	18,00	19,00	20,00	23,00	23,40	23,60	23,80	12,50	13,00	13,50	14,00	14,50	15,00
1 000 001 – 10 000 000	18,50	19,50	20,50	23,20	23,50	23,70	23,90	12,75	13,25	13,75	14,25	14,75	15,25
10 000 001 и более	19,00	20,00	21,00	23,40	23,60	23,80	24,00	13,00	13,50	14,00	14,50	15,00	15,50
Доллары США													
1 – 500	7,60	8,20	8,80	9,40	9,60	9,80	9,90	5,00	5,80	6,40	6,80	7,20	7,60
501 – 5 000	7,80	8,40	9,00	9,50	9,70	9,85	9,95	5,30	6,00	6,60	7,00	7,40	7,80
5 001 и более	8,00	8,60	9,20	9,60	9,80	9,90	10,00	5,60	6,20	6,80	7,20	7,60	8,00
Евро													
1 – 500	7,60	8,20	8,80	9,40	9,60	9,80	9,90	5,00	5,80	6,40	6,80	7,20	7,60
501 – 5 000	7,80	8,40	9,00	9,50	9,70	9,85	9,95	5,30	6,00	6,60	7,00	7,40	7,80
5 001 и более	8,00	8,60	9,20	9,60	9,80	9,90	10,00	5,60	6,20	6,80	7,20	7,60	8,00
Российские рубли													
1 – 15 000	8,60	9,20	9,80	10,40	10,60	10,80	10,90	6,00	6,80	7,40	7,80	8,20	8,60
15 001 – 150 000	8,80	9,40	10,00	10,50	10,70	10,85	10,95	6,30	7,00	7,60	8,00	8,40	8,80
150 001 и более	9,00	9,60	10,20	10,60	10,80	10,90	11,00	6,60	7,20	7,80	8,20	8,60	9,00

Подробные условия вклада «Линия роста» в газетах: «Советская Белоруссия» № 49 от 16.03.2006, «Звязда» № 50 от 04.03.2006, на сайте банка в сети Интернет – www.belapb.by и в офисах ОАО «Белагропромбанк».
Информация о размере процентов, выплаченных по привлеченным средствам физических лиц в течение последнего финансового года, – в офисах и на сайте банка.
Полная сохранность и возврат денежных средств физических лиц, размещенных в ОАО «Белагропромбанк», гарантируются государством и осуществляются в соответствии с законодательством РБ.
Сведения о выплаченных процентах по привлеченным средствам физических лиц в 2010 году в эквиваленте, тыс. бел. руб.:

	Январь	Февраль	Март	Апрель	Май	Июнь	Июль	Август	Сентябрь	Октябрь	Ноябрь	Декабрь	Итого
Срочные вклады (депозиты)	22 150 017	22 217 382	26 283 012	23 570 773	24 305 769	23 429 778	24 105 505	25 734 923	23 504 004	21 902 005	22 376 779	20 939 428	280 519 376
До востребования	109 717	112 167	154 527	147 164	130 440	153 009	175 320	208 613	207 977	209 476	234 959	253 869	2 097 239

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
Время работы Контакт-Центра Банка: 8.00 - 20.00 - рабочие дни; 8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.06.2011 г. (для б/н разлікаў)

▼1 долар ЗША	4 966,00	1 чэшская крона	298,56
▲1 еўра	7 265,75	1 польскі злоты	1830,78
1 латвійскі лат	10 233,90	▲1 расійскі рубель	178,79
1 літоўскі літ	2 103,03	1 украінская грыўня	621,92

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	27,7752
10 UAH	34,7755
1000 BYR	55,7511
EUR	40,6879

Нелегальны канал спынены

У Брэсце перакрыты нелегальны канал паставак імпартнага мяса.

Паводле папярэдняй інфармацыі следства, арганізатарам паставак быў 28-гадовы жыхар Жабінкі. У склад групы таксама ўваходзілі два яго землякі і адзін брастаўчанін. Мяса яны прывозілі з Польшчы ў тайніках, якімі ўмела абсталявалі свае машыны. Затым тавар збывалі на рынках Брэстчыны. Такім чынам, паводле падлікаў спецыялістаў, кантрабандысты зарабілі прыкладна 700 мільёнаў рублёў. Справа, хутчэй за ўсё, будзе заведзена за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць.

Яна СВЕТАВА.

КІРАЎНІКІ СНД ЗБЯРУЦЦА ДВОЙЧЫ ДА КАНЦА 2011 ГОДА: У ПАЧАТКУ ВЕРАСНЯ Ў ДУШАНБЭ І 21 СНЕЖНЯ Ў МАСКВЕ

Аб гэтым ішла размова 6 чэрвеня на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з першым намеснікам старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчым сакратаром СНД Уладзімірам Гаркуном, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік беларускай дзяржавы быў праінфармаваны аб падрыхтоўцы пасяджэнняў Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД. У прыватнасці, Аляксандру Лукашэнку быў прадстаўлены парадак дня чарговага пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД, што адбудзецца ў пачатку верасня ў Душанбэ. Папярэднічаць яму будзе пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў СНД.

Як адзначыў Уладзімір Гаркун, на разгляд кіраўнікоў дзяржаў прапанаваны «даволі аб'ёмны і цікавы парадак дня». Перш за ўсё лідарамі краін СНД будзе разгледжана Заява аб 20-годдзі Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а таксама аналітычны даклад «20 гадоў СНД. Вынікі і перспектывы». У прыватнасці, у праекце заявы даецца характарыстыка вынікам развіцця СНД у эканамічнай, гуманітарнай сферах, у пытаннях бяспекі, палітычным узаемадзеянні, падкрэсліваецца, што Садружнасць вытрымала выпрабаванне часам, і ставяцца задачы на будучае.

Да канца 2011 года адбудзецца яшчэ адно пасяджэнне на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў СНД. Нефармальны саміт пройдзе 21 снежня ў Маскве, дзе, як чакаецца, будуць падведзены вынікі 20-годдзя Садружнасці, а таксама вызначана краіна, да якой пяройдзе старшынства ў СНД.

Акрамя таго, Прэзідэнту было даложана аб ходзе падрыхтоўкі да навукова-практычнай канферэнцыі, таксама прысвечанай вынікам 20-годдзя Садружнасці, што будзе праходзіць у Мінску 28-29 верасня.

Прэзідэнт падкрэсліў нязменнасць курсу Беларусі на падтрымку інтэграцыйных працэсаў у Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На сустрэчы размова ішла аб ролі нашай краіны і яе ўкладзе ў развіццё гэтых працэсаў. Кіраўнік дзяржавы таксама падрабязна цікавіўся работай штаб-кватэры Выканаўчага камітэта ў Мінску.

ДЗЯРЖАЎНЫМІ ЎЗНАГАРОДАМІ Ў БЕЛАРУСІ АДЗНАЧАНЫ 34 РАБОТНІКІ РОЗНЫХ СФЕР

Работнікі розных сфер узнагароджаны дзяржаўнымі ўзнагародамі Беларусі за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё будаўнічага комплексу, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры і спорту. Адпаведны ўказ 3 чэрвеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Ордэна Пашаны ўдастоены начальнік механічнага цэха ААТ «Керамін» Мар'ян Бубен. Ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны вядучы майстар сцэны тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір Гасцюхін і загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзімір Зінкевіч. Медаля «За працоўныя заслугі» ўдастоены 16 работнікаў. Яшчэ 8 чалавек узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» прысвоена вядучым майстрам сцэны тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзіміру Грыцэўскаму, Анатолю Цярпіцкаму і Пятру Юрчанкову. Таксама чатыром работнікам прысвоены ганаровыя званні «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь», «Заслужаны трэнер Рэспублікі Беларусь». Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім Падзяка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб'яўлена 6 работнікам розных сфер.

ІНТАРЭСАМ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І ШВЕЦЫІ АДПАВЯДАЕ ДАЛЕЙШАЕ ПАШЫРЭННЕ ДВУХБАКОВАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Караля Швецыі Карла XVI Густава і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём шведскага сцяга. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Перакананы, што інтарэсам нашых народаў адпавядае далейшае пашырэнне і ўмацаванне беларуска-шведскага супрацоўніцтва на аснове канструктыўнага міждзяржаўнага дыялога і ўзаемапавагі», — гаворыцца ў віншаванні.

Сяргей Румас абмяркоўвае з місіяй МВФ пытанні стабілізацыі сітуацыі ў эканоміцы Беларусі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сувязі з гэтым віцэ-прэм'ер пацікавіўся, наколькі МВФ лічыць дастатковымі меры, выкладзеныя ў гэтай матрыцы. І хоць гэта місія не разглядае заяўку па прадастаўленні дапамогі, хацелася б вызначыць агульныя падыходы, наколькі МВФ падзяляе тыя меры, што ўзгоднены з антыкрызісным фондам, падкрэсліў Сяргей Румас. Пры гэтым ён дадаў, што са свайго боку гатовы адказаць на ўсе пытанні аб мерах, якія цяпер рэалізуе ўрад Беларусі для стабілізацыі становішча на спажывецкім і валютным рынках.

З 1 па 14 чэрвеня ў Мінску працуе місія, у ходзе якой ідуць кансультацыі адносна адпаведнай праграмы дзеянняў урада і Нацыянальнага банка Беларусі. У ходзе работы місіі разглядаюцца пытанні бягучай эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы, абмяркоўваюцца меры, што прымаюцца ўрадам і Нацыянальным банкам па стабілізацыі сітуацыі на ўнутраным валютным рынку, а таксама вызначаецца магчымасць падтрымкі Міжнародным валютным фондам праводзімай у краіне макраэканамічнай палітыкі.

31 мая ўрад і Нацыянальны банк Беларусі накіравалі ў Міжнародны валютны фонд зварот аб прадастаўленні рэспубліцы стабілізацыйнага крэдыту. Як паведаміў раней прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч, Беларусь разлічвае прыцягнуць $3,5-8 млрд у рамках новай праграмы з МВФ.

В. Януковіч вызваліў з пасады пасла Украіны ў Беларусі Р. Бяссмертнага

Адпаведны ўказ ад 3 чэрвеня абнародаваны на афіцыйным сайце кіраўніка дзяржавы. Прычыны рашэння не называюцца. На пасаду пасла ў Беларусі Рамана Бяссмертнага назначыў ранейшы прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка ўказам ад 24 лютага 2010 года.

УРАД ЗАЦВЕРДЗІЎ ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЗБАЛАНСАВАНАГА РАЗВІЦЦЯ ЭКАНОМІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Планам таксама прадугледжана часовае пашырэнне сферы выкарыстання замежнай валюты пры разліках з фізічнымі асобамі на тэрыторыі Беларусі.

З 25 мая ў мэтах прыцягнення ў эканоміку Беларусі валютных сродкаў насельніцтва (уключаючы фізічных асоб — нерэзідэнтаў) Нацыянальны банк па ўзгадненні з урадам пашырыў выпадкі выдачы дазволаў суб'ектам валютных аперацый на разлікі ў замежнай валюце з фізічнымі асобамі на тэрыторыі Беларусі па асобных напрамках. Гэта рэалізацыя паліва, нафтапрадуктаў, звадкаванага газу на аўтазаправачных станцыях; турыстычная дзейнасць; аказанне паслуг фізічным асобам — нерэзідэнтам у сферы гасцінічнага бізнэсу; аказанне паслуг аздараўленчымі ўстановамі (санаторыі, прафілакторыі, дамы адпачынку, турыстычныя базы) фізічным асобам — нерэзідэнтам; аказанне медыцынскіх паслуг фізічным асобам — нерэзідэнтам; аказанне паслуг фізічным асобам — нерэзідэнтам па навучанні, стажыроўцы і павышэнні кваліфікацыі і іншыя напрамкі. 1 чэрвеня Нацыянальны банк Беларусі дазволіў суб'ектам валютных аперацый рэалізоўваць новыя аўтамабілі фізічным асобам за замежную валюту.

ФІНАНСАВАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ІНВЕСТЫЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СКАРОЧАНА НА 30 ПРАЦЭНТАЎ

Гэта прадугледжана ў плане дзеянняў урада Беларусі па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курсу беларускага рубля. План быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 662 ад 25 мая 2011 года. Цяпер гэта пастанова і план размешчаны на афіцыйным сайце беларускага ўрада.

Дакументам прадугледжана такое скарачэнне аб'ёмаў фінансавання Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы з перадачай аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму паўнамоцтваў на размеркаванне фінансавых рэсурсаў і пошук дадатковых пазабюджэтных неэмісійных крыніц фінансавання. Адпаведны дакумент павінен быць прыняты да 1 ліпеня.

Мінфін Беларусі да 1 ліпеня ўдакладніць бюджэт 2011 года і знізіць яго дэфіцыт да памеру не больш як 1,5 працэнта ВУП.

Дакументам таксама (у раздзеле мер па рэалізацыі фінансавай палітыкі) прадугледжана абмежаванне чыстага эмісійнага крэдытавання дзяржаўных праграм у 2011 годзе ў памеры не больш як 4 працэнты ВУП.

Апублікаваным планам прадугледжана ўдакладненне аб'ёмаў уводу і фінансавання ў 2011 годзе жыллёвага будаўніцтва ў аб'ёмах, забяспечаных неэмісійнымі крыніцамі, і з улікам сфарміраваных у абласцях і Мінску калектываў забудоўшчыкаў.

МІНФІН І «БЕЛДЗЯРЖХАРЧПРАМ» АПТЫМІЗУЮЦЬ АКЦЫЗЫ НА АЛКАГОЛЬ І ТЫТУНЁВЫЯ ВЫРАБЫ ДЛЯ ЗБЛІЖЭННЯ З УЗРОЎНЕМ СТАВАК У РФ

Гэта прадугледжана ў плане дзеянняў урада Беларусі па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курсу беларускага рубля.

Раздзелам плана, у якім змешчаны меры па абароне ўнутранага спажывецкага рынку, таксама прадугледжана, што на працягу 2011 года Мінэканомікі, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам ліквідуюць дыспарытэт цэн з сумежнымі дзяржавамі на спажывецкія тавары. Гэта адбудзецца ва ўвязцы з комплексам мер па сацыяльнай абароне насельніцтва.

У краіне будзе праводзіцца пастаянны маніторынг рознічных цэн на спажывецкія тавары, будуць прымацца адпаведныя меры рэагавання па фактах нядобрасумленнага цэнаўтварэння ў гандлі. Прадугледжана вызначэнне пераліку аператараў па стварэнні стабілізацыйных фондаў тавараў, якія карыстаюцца павышаным попытам.

Акрамя таго, Мінэканомікі і Мінсельгасхарч на працягу года павінны забяспечыць павышэнне закупачных цэн на сельгаспрадукцыю з улікам парытэтнага росту цэн на харчовыя тавары на рознічным рынку.

Як адзначалася раней, у краіне будзе распрацаваны нарматыўны прававы акт па пытаннях удасканалення антыманапольнага рэгулявання. Акрамя таго, да 15 чэрвеня будзе забяспечана зніжэнне гандлёвых надбавак за кошт развіцця канкурэнцыі і насычэння ўнутранага рынку спажывецкімі таварамі.

БЕЛАРУСЬ ДА КАНЦА ГОДА ПАВІННА ВЫЙСЦІ НА 30-ПРАЦЭНТНУЮ КАМПЕНСАЦЫЮ НАСЕЛЬНІЦТВАМ ЗАТРАТ НА ПАСЛУГІ ЖКГ

Для дасягнення гэтага паказчыка на працягу года запланавана павелічэнне адпаведных тарыфаў на паслугі ЖКГ у два этапы. Гэта прадугледжана ў плане дзеянняў урада Беларусі па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курсу беларускага рубля. План быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 662 ад 25 мая 2011 года. Цяпер гэта пастанова і план размешчаны на афіцыйным сайце беларускага ўрада.

Раздзелам плана, які змяшчае меры па ўстараненні цэнавых дыспрапорцый у рэальным сектары эканомікі ў сувязі з ростам цэн на імпартуемыя энерганосьбіты, сыравіну і матэрыялы, прадугледжана індэксацыя тарыфаў на электрычную і цеплавую энергію для юрыдычных асоб і ІП.

На працягу года таксама будзе ажыццяўляцца аптымізацыя рознічных цэн на нафтапрадукты, якія рэалізуюцца на ўнутраным рынку, у мэтах устаранення дыспарытэту цэн з сумежнымі дзяржавамі.

Акрамя таго, у гэтым годзе адбудзецца ўдакладненне тарыфаў на паслугі гарадскога транспарту, прыгарадных аўтаперавозак, перавозак пасажыраў чыгуначным транспартам, паслугі сувязі.

Абмежаванне гандлёвых надбавак на сацыяльна значныя тавары апраўдана

АБМЕЖАВАННЕ гандлёвых надбавак на сацыяльна значныя тавары ў існуючых умовах апраўдана і накіравана на стабілізацыю цэнавай сітуацыі, спыненне манапольных дзеянняў вытворцаў і гандлю. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Міністэрства эканомікі, каментуючы пастанову Савета Міністраў Беларусі ад 28 мая 2011 года № 676, якой зацверджаны пералік сацыяльна значных тавараў, цэны на якія могуць рэгулявацца Міністэрствам эканомікі на працягу тэрміну не больш як 90 дзён.

У развіццё гэтага дакумента ўрада Міністэрства эканомікі прыняло сваю пастанову ад 28 мая 2011 года № 79, якой зацверджаны гранічныя гандлёвыя надбаўкі на названыя ў пераліку тавары.

«Прыняцце такіх мер у цяперашніх умовах апраўдана і накіравана перш за ўсё на стабілізацыю цэнавай сітуацыі, спыненне манапольных дзеянняў вытворцаў і гандлю, забеспячэнне сацыяльнай абароны малазабяспечаных слаёў насельніцтва, паколькі тавары, уключаныя ў пералік, зацверджаны вышэйназванай пастановай, уваходзяць у бюджэт пражытковага мінімуму», — адзначылі ў міністэрстве. У спажывецкім кошыку агульная доля тавараў, што ўвайшлі ў названы пералік, з'яўляецца нязначнай і складае каля 9 працэнтаў. У Мінэканомікі падкрэслілі, што пастанова ўрада № 676 мае абмежаваны тэрмін дзеяння і яе прыняцце не азначае адыходу ад рэалізацыі першачарговых мер, прадугледжаных Дырэктывай № 4. Варта таксама адзначыць, што вызначэнне пераліку тавараў, у адносінах да якіх дзяржавай можа ўводзіцца часовае цэнавае рэгуляванне, прымяняецца на практыцы ў іншых краінах. Разам з тым цяперашняя сітуацыя на спажывецкім рынку краіны, абумоўленая ростам сусветных цэн на важнейшыя сыравінныя рэсурсы і харчовыя тавары, і асабліва ўзнікшая ў красавіку-маі негатыўная сітуацыя на валютным рынку сталі прычынай росту спажывецкіх цэн на асноўныя харчовыя і нехарчовыя тавары. Так, за тры тыдні мая індэкс спажывецкіх цэн склаў 108,4 працэнта. Найбольшы рост цэн зафіксаваны органамі статыстыкі па такіх групах, як рыба і рыбапрадукты — 122,5 працэнта, крупы — 122 працэнты, чай — 134,6 працэнта, электратавары — 138,4 працэнта, мыйныя сродкі — 125,7 працэнта. Гэта і выклікала прыняцце аператыўных мер па стабілізацыі сітуацыі на спажывецкім рынку, у тым ліку па стрымліванні росту цэн, рэзюмавалі ў Міністэрстве эканомікі.

АБ'ЁМ АПЕРАЦЫЙ СУБ'ЕКТАЎ ГАСПАДАРАННЯ БЕЛАРУСІ НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ ПАСТАЯННА ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА

Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка краіны.

Тут адзначылі, што апошнім часам у шэрагу СМІ са спасылкай на «крыніцы ў банкаўскіх колах» перыядычна з'яўляецца інфармацыя аб нібыта поўным спыненні аперацый на пазабіржавым сегменце валютнага рынку краіны.

У сувязі з гэтым Нацыянальны банк заяўляе, што такая інфармацыя не адпавядае рэчаіснасці. Больш таго, даныя справаздачнасці аб аперацыях на валютным рынку, што кожны дзень накіроўваюцца банкамі ў Нацыянальны банк, сведчаць, што аб'ём аперацый суб'ектаў гаспадарання пастаянна павялічваецца. Так, у студзені—маі сярэднядзённы аб'ём продажу і куплі замежнай валюты суб'ектамі гаспадарання на ўсіх сегментах валютнага рынку склаў $140,3 млн, што на 11,3 працэнта вышэй, чым у аналагічным перыядзе 2010 года. У маі гэтага года названы паказчык склаў $139,9 млн, у тым ліку з 25 па 31 мая, гэта значыць пасля ўвядзення двухпрацэнтнага абмежавання на адхіленні курсаў заключаемых здзелак ад афіцыйнага курсу і зніжэння курсу нацыянальнай валюты, — $161 млн.

Пры гэтым на пазабіржавым сегменце валютнага рынку па аперацыях суб'ектаў гаспадарання сярэднядзённы абарот у студзені—маі склаў $80,1 млн, у маі — $85,8 млн, з 25 па 31 мая — $102,4 млн.

У Нацбанку растлумачылі, што рост аб'ёмаў аперацый непасрэдна звязаны з павелічэннем валютнай выручкі, якая паступае ў краіну. Паводле папярэдніх даных, аб'ём паступлення ў краіну валютнай выручкі за студзень—красавік адносна аналагічнага перыяду 2010 года вырас на 61 працэнт — з $7941,9 млн да $12789,5 млн у эквіваленце. У выніку ў красавіку, упершыню за працяглы час, аб'ём валютнай выручкі, якая паступіла ў краіну, перасягнуў аб'ём плацяжоў за імпарт тавараў і паслуг.

Зводная інфармацыя аб аб'ёмах аперацый на ўсіх сегментах валютнага рынку рэгулярна публікуецца Нацыянальным банкам у статыстычных зборніках і на афіцыйным сайце ў інтэрнэце (http://www.nbrb.by/statistics/ForexMarket/).

Факт

У Беларусі ў студзені—красавіку зафіксаваны самы высокі рост рознічнага тавараабароту ў СНД

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Міждзяржаўным статыстычным камітэце Садружнасці.

У параўнанні з аналагічным мінулагоднім перыядам гэты паказчык павялічыўся ў Беларусі на 21,2 працэнта. Другое месца заняла Украіна — 14,9 працэнта, трэцяе — Казахстан (11,8 працэнта).

У Азербайджане рознічны тавараабарот узрос на 8 працэнтаў, у Таджыкістане — на 7,9 працэнта, у Расіі — на 5 працэнтаў, у Арменіі — на 1,2 працэнта. У Кыргызстане гэты паказчык знізіўся на 0,3 працэнта.

У сярэднім па СНД у студзені—красавіку 2011 года ў параўнанні з першымі чатырма месяцамі 2010 года рознічны тавараабарот павялічыўся на 6,6 працэнта. У Статыстычным камітэце адсутнічаюць звесткі аб сітуацыі ў Малдове, Узбекістане і Туркменістане.

«БЕЛАРУСНАФТА» АБМЕЖАВАЛА ВОДПУСК АЎТАМАБІЛЬНАГА ПАЛІВА ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК НА АЗС

ВА «Беларуснафта» з 3 чэрвеня ўвяло абмежаванні на водпуск АІ-92 і дызельнага паліва за наяўны разлік у беларускіх рублях на аўтазапраўках. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе аб'яднання.

Для легкавых аўтамабіляў водпуск нафтапрадуктаў абмежаваны да 25 л, для велікагрузных — да 100 л.

Як растлумачылі ў прэс-службе «Беларуснафты», рашэнне прынята для таго, каб захаваць раўнамернае забеспячэнне насельніцтва неабходнай колькасцю АІ-92 і дызельнага паліва ва ўмовах ажыятажнага попыту.

На працягу мая ў цэлым па рэспубліцы на АЗС «Беларуснафты» прададзена маторнага паліва ў 1,5 раза больш, чым у маі мінулага года, а на прыгранічных аўтазапраўках яго рэалізацыя вырасла больш як у 2,3 раза. Абмежаванні на водпуск АІ-92 і дызельнага паліва фізічным асобам увялі некаторыя прыватныя АЗС. Паводле інфармацыі канцэрна «Белнафтахім», нафтаперапрацоўчыя заводы Беларусі выпрацоўваюць дастатковую колькасць паліва для ўнутранага рынку нават з улікам павелічэння попыту, але, адзначылі ў прэс-службе «Беларуснафты», ва ўмовах значнага павелічэння рэалізацыі яго на запраўках аб'яднанне проста не паспявае дастаўляць паліва на ўласныя АЗС. ВА «Беларуснафта» (уваходзіць у склад канцэрна «Белнафтахім») належыць 484 АЗС, праз якія на беларускім рынку рэалізуецца амаль 75 працэнтаў светлых нафтапрадуктаў.

Увялі абмежаванні на пастаўку прадукцыі жывёлагадоўлі з Літвы, Расіі і Германіі

Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі.

З 3 чэрвеня ўведзены часовыя абмежаванні на ўвоз у Беларусь з Літоўскай Рэспублікі жывых свіней, з тэрыторыі Каўнаскай акругі — мяса свініны і прадуктаў яе перапрацоўкі, скураной і кішачнай сыравіны, шчаціння са свіней, спермы кныроў, кармоў і кармавых дабавак, у склад якіх уваходзіць сыравіна са свініны, паляўнічых трафеяў, якія атрыманы ад дзікоў. Адначасова адменены і выдадзеныя раней дазволы на ўвоз у рэспубліку з Літвы ўказаных тавараў.

Гэта рашэнне Дэпартамент ветэрынарнага і харчовага нагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі прыняў у сувязі з рэгістрацыяй выпадку захворвання класічнай чумой свіней на тэрыторыі Ёнаўскага раёна Каўнаскай акругі.

Дэпартамент таксама даў указанні прыняць дадатковыя меры, каб узбуджальнік класічнай чумы свіней не трапіў на свінагадоўчыя аб'екты Беларусі. Такое ж рашэнне прынята і ў дачыненні да Цвярской вобласці Расійскай Федэрацыі — у сувязі з тым, што там, у горадзе Таржок, зарэгістраваны выпадак афрыканскай чумы свіней.

Акрамя таго, на тэрыторыі зямлі Паўночная Вестфалія зарэгістравалі выпадак захворвання птушак слабапатагенным грыпам (H7). У сувязі з гэтым Галоўны дзяржаўны ветэрынарны інспектар увёў часовую забарону і адмяніў усе выдадзеныя раней дазволы на ўвоз адтуль на тэрыторыю Беларусі: жывой птушкі, інкубацыйнага яйка, пуху і пяра, мяса птушкі і ўсіх відаў птушкагадоўчай прадукцыі, кармоў і кармавых дабавак з птушкі, а таксама абсталявання для ўтрымання, забою і раздзелкі птушкі, якое было ў карыстанні.

Надзея ДРЫЛА.

ОБЪЯВЛЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ХОЗЯЙСТВЕННЫМ СУДОМ ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОДО «ДОМЕСТИК», находящегося по адресу:
г. Витебск, ул. Чкалова, д. 50, к. 2 (цоколь).

Информация о перечне и начальной цене имущества выставляемого на торги содержится на сайте хозяйственного суда Витебской области **http://court.by.**

Торги будут проводиться по адресу:
г. Витебск, ул. Правды, 32.
Время проведения торгов – 20 июня 2011 года в 10.30.

Минимальная величина первого шага торгов составляет 5 % стоимости лота.

Лицо, желающее принять участие в торгах, не позднее последнего рабочего дня перед торгами обязано:

- подать заявку на участие в торгах;
- дать подписку об отсутствии препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества;
- внести задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости лота на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области р/с № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «СБ Беларусбанк» г. Витебска, код 259, УНП 300007670.

Сумма, внесенная лицом, купившим с торгов имущество, зачисляется в счет покупной цены. Остальным участникам торгов внесенные ими суммы возвращаются в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов. Победитель торгов обязан возместить затраты суда на организацию и проведение торгов.

По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться в хозяйственный суд Витебской области (г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 304), также по телефонам: тел. 8 (0212) 491341, тел. м. 8 (029) 3664011 судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, 8 (0212) 491340 старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович. Дополнительная информация содержится на сайте хозяйственного суда Витебской области http://court.by.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского райпо (продавец) проводит очередной открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: здание магазина, об. пл. 128,5 кв.м, **Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Закружка**.

Начальная цена с НДС – 87 408 551 бел. рубль.

Лот № 2: здание магазина, об.пл. 94,2 кв.м, **Минский р-н, Самохваловичский с/с, д. Углы.**

Начальная цена с НДС – 33 600 000 бел. руб. (снижена на 50%).

Лот № 3: здание магазина, об. пл. 94,1 кв.м, **Минский р-н, Крупицкий с/с, д. Дубинки.**

Начальная цена с НДС – 63 600 000 бел. рублей.

Лот № 4: здание магазина «Хозтовары», об. пл. 187,0 кв.м, **Минский р-н, Ждановичский с/с, д. Ждановичи.**

Начальная цена с НДС – 218 880 000 бел. руб. (снижена на 20%).

Задаток 10 % от начальной цены.

Подробное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 07.10.2010.

Аукцион состоится **15.06.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.06.2011** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.

«Белагра-2011»

ДА СУСТРЭЧЫ НА ВЫСТАВЕ!

З 7 па 12 чэрвеня ў Беларусі пройдзе 21-я па ліку міжнародная выстава «Белагра-2011». У ёй прыме ўдзел больш за 350 фірмаў з 16 краін свету.

Афіцыйнае адкрыццё самай буйнай у нашай краіне сельскагаспадарчай выставы адбудзецца сёння а 12 гадзіне. Прычым чырвоную стужку перарэжуць адначасова на дзвюх выставачных пляцоўках. Адна з іх, як і летась, размесціцца на дэманстрацыйным полі ААТ «Гастэлаўскае» Мінскага раёна. Другая — у Футбольным манежы, што на сталічным праспекце Пераможцаў, 20/2 (перанос месца правядзення выставы абумоўлены рэканструкцыяй выставачнага павільёна «БелЭкспа»).

На выставе будзе магчымасць пазнаёміцца з дасягненнямі ў сферы жывёлагадоўлі, раслінаводства, сельскагаспадарчай тэхнікі як беларускіх, так і замежных прадпрыемстваў і навукоўцаў. Наведнікаў чакаюць выступленні творчых калектываў, шмат дэманстрацый, прэзентацый, дэгустацый і падарункаў. Таксама яны змогуць прыняць удзел у бясплатных семінарах, кансультацыях і набыць лепшую прадукцыю, якую выпускаюць айчынныя прадпрыемствы харчовай прамысловасці, у «Гандлёвым гарадку» (размесціцца на дэманстрацыйным полі ААТ «Гастэлаўскае». — **Аўт.**). З 7 па 10 чэрвеня арганізатары запрашаюць усіх ахвотных прыняць удзел у латарэі і пагуляць у гольф на выставачным стэндзе ТАА «Франдэса» ў будынку Футбольнага манежа. А 11 чэрвеня з 10.00 да 14.00 на дэманстрацыйным полі за горадам адбудзецца конкурс племянных коней беларускай запражной пароды «Беларускі скарб».

Да выставачнага павільёна на праспекце Пераможцаў можна даехаць ад чыгуначнага вакзала на маршрутным аўтобусе № 1 (прыпынак «Футбольны манеж»). Да дэманстрацыйнага ж поля за горадам (размяшчаецца ў Слуцкім кірунку, у раёне вёскі Сеніца), будуць хадзіць заказныя аўтобусы ад будынка Футбольнага манежа. Карацей, шаноўныя чытачы, да сустрэчы на выставе! Тым жа, хто не зможа туды трапіць, мы абяцаем расказаць пра самае важнае і цікавае на беларускім аграпрамысловым тыдні ў бліжэйшых нумарах.

Надзея ДРЫЛА.

АНІШЧАНКА НЕ ВЕРЫЦЬ У ВЕРСІЮ ЕЎРОПЫ ПРА КІШЭЧНУЮ ІНФЕКЦЫЮ: СІТУАЦЫЯ ЗНАЧНА ГОРШАЯ І НЕБЯСПЕЧНАЯ

Кіраўнік Распажыўнагляду, галоўны санітарны ўрач Расіі Генадзь Анішчанка заявіў, што кішэчная інфекцыя, якая распаўсюджваецца ў Германіі, больш небяспечная, чым думалі раней, і выказаў недавер версіі пра тое, што ўспышку эпідэміі выклікала соя.

Нагадаем, у якасці крыніцы смяротна небяспечнай інфекцыі нямецкія навукоўцы западозрылі ферму пад Гамбургам — як аказалася, бактэрыя выяўлена там у парастках бабовых (фасолі, соі, сачавіцы і гароху). Таксама ў ежу заклікалі не ўжываць парасткі брокалі, часнаку, радыскі і рэдзькі, пад падазрэннем застаюцца агуркі і памідоры.

Анішчанка, аднак, настойвае на тым, што гэта толькі «адна з версій, пакуль яшчэ не афіцыйная і не даказаная». Галоўны санітарны ўрач РФ падкрэсліў, што незразумела, як адна ферма магла стаць прычынай вострай кішэчнай інфекцыі, якая ўжо загубіла 22 чалавекі і зафіксавана ў 13 краінах Еўропы ў 2300 чалавек.

«Гаворка ідзе пра эпідэмію», — напісаў ён у артыкуле, апублікаваным у панядзелак у «Расійскай газеце». «Нямецкія навукоўцы, спецыялісты Сусветнай арганізацыі аховы здароўя адзначаюць, што прычынай стала разнавіднасць бактэрыі, якая ніколі раней не сустракалася, і якая ўяўляе сабою смяротны штам вельмі небяспечнай кішачнай палачкі», якая муціравала, — нагадаў ён.

У той жа час Анішчанка лічыць, што ехаць у ЕС у адпачынак можна. «Нічога страшнага ў гэтым няма. Калі едзеце на кароткі час, паспрабуйце адмовіцца ад агародніны».

«ГАЗПРАМ» НЕ ЗБІРАЕЦЦА ЗМЯНЯЦЬ ФОРМУЛУ КОШТУ НА ПАЛІВА ДЛЯ УКРАІНЫ

«Вынаходзіць новую формулу ці прывязваць яе да якіх-небудзь іншых энерганосьбітаў мы не будзем», — перадаюць словы кіраўніка «Газпрама» Аляксея Мілера інфарм-агенцтвы.

У сярэдзіне мая агенцтва Reuters са спасылкай на прэм'ер-міністра Украіны Мікалая Азарава паведамляла, што Масква і Кіеў пачалі перамовы пра змену формулы кошту імпартуемага расійскага газу. Украінскі бок прапанаваў прывязаць яе да кошту вугля, які досыць стабільны. Паводле слоў Мілера, формула кошту на газ для Кіева застанецца рынкавай. У чацвёртым квартале гэтага года кошт расійскага паліва складзе для Украіны 500 долараў за тысячу кубаметраў без уліку дзейнай 100-доларавай зніжкі.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СУСВЕТНЫЯ КОШТЫ НА ВОЎНУ ДАСЯГНУЛІ ГІСТАРЫЧНАГА МАКСІМУМУ

Сусветныя кошты на воўну за мінулы год падвоіліся, дасягнуўшы гістарычнага максімуму. Пра гэта піша The Financial Times.

Да пачатку чэрвеня кошт на воўну ў Аўстраліі, якая з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам гэтага матэрыялу, падняўся да 14,85 долара за кілаграм. З-за неспрыяльных умоў надвор'я вытворчасць воўны ва ўсім свеце дасягнула мінімальнай адзнакі за 85 гадоў, у той час як попыт на тавар не перастае расці.

У свеце таксама чакаецца рост цэн на шарсцяныя гарнітуры да канца года — у сярэднім, на 10 адсоткаў.

ГРАНАТАВЫ СОК — ЛЕПШЫ СРОДАК АД СТРЭСУ НА ПРАЦЫ І АТЛУСЦЕННЯ

Сок граната дапамагае справіцца з працоўным стрэсам, паказала даследаванне. Падчас эксперыменту навукоўцы высветлілі, што гэты сок дазваляў паменшыць частату сэрцабіцця і палепшыць працоўны настрой.

Навукоўцы сачылі за групай добраахвотнікаў, якія выпівалі штодня на працягу двух тыдняў па 500 мілілітраў соку. На пачатку і ў канцы даследавання фіксавалася частата пульса, а таксама запаўняўся апытальнік, мэтай якога было высветліць эмацыйны настрой і стаўленне да працы. У выніку аказалася, што пераважная большасць добраахвотнікаў, якія пілі сок, да канца заяўленага тэрміну паведамлялі пра паляпшэнне эмацыйнага стану. Таксама павялічвалася актыўнасць, фіксаваўся большы запал да працы і паніжаны пульс. Кіраўнік даследавання доктар Эмад Ал-Дужайлі з Універсітэта Каралевы Маргарэт у Эдынбургу канстатуе: «З'яўляецца ўсё больш доказаў карысці соку. І гэта заслугоўвае далейшага даследавання». Трэба сказаць, летась тая ж група навукоўцаў паказала, што гранатавы сок дазваляе зменшыць ступень атлусцення.

ЭЛІСО І АРКЕСТР

Яна не была ў Мінску з 1996 года. І толькі сёлета, праз 15 гадоў, народная артыстка СССР, вялікая піяністка, якая выкладае ў самых прэстыжных акадэміях Расіі і Італіі, дае канцэрты па ўсім свеце, ад Бухарэста да Фларэнцыі, прыехала ў Беларусь па запрашэнні дырыжора Яўгена Бушкова, каб даць адзіны канцэрт у Белдзяржфілармоніі 6 чэрвеня.

Элісо Вірсаладзэ называюць адной з самых віртуозных выканаўцаў Р. Шумана ў свеце. Юрый Гільдзюк, мастацкі кіраўнік Белдзяржфілармоніі, распавёў, што калі днямі расійскага піяніста Мікалая Пятрова пасля перанесенага на гастролях у Мінску інсульту праводзілі дадому ў Маскву, Юрый Мікалаевіч пахваліўся канцэртам Вірсаладзэ ў Мінску. Адзінае, што сказаў Пятроў: «Геніяльна іграе Шумана!» Адзіны мінскі канцэрт Элісо Вірсаладзэ, дарэчы, без Шумана не абыдзецца. Праграма складаецца з яго канцэрта для фартэпіяна з аркестрам ля мінор і сімфоніі № 4 «Італьянка» Ф. Мендэльсона.

Элісо Вірсаладзэ пачала вучыцца граць на фартэпіяна, калі ёй было 8 гадоў. «Лічыце, гэта ўжо стары ўзрост для вучобы на музычным інструменце», — смяецца Элісо Канстанцінаўна. Але піяністцы пашчасціла: яе настаўнікам была яе бабуля — славуты прафесар Грузінскай кансерваторыі Анастасія Вірсаладзэ.

68-гадовая піяністка цудоўна выглядае. Яна поўная дабрыні і пазітыву. Грае без нот, па памяці. Планаў у яе безліч. Вось зусім нядаўна ў невялікім грузінскім горадзе Тэлаві быў адноўлены музычны фестываль, які курыруе Элісо. «І наогул, — радуецца піяністка, — для майго інструмента столькі ўсяго напісана (гэта не скрыпка ці віяланчэль — для іх увесь час пішуць нешта новае), столькі шыкоўных класічных твораў, што ёсць яшчэ безліч музыкі, якую я не сыграла, але планую».

Гаворыць Элісо Вірсаладзэ:

— Калі вы размаўляеце з публікай шчыра, жадаючы не проста спадабацца, а менавіта гаворыце з ёй на мове музыкі, то гэта даходзіць. Нягледзячы на тое, у якой краіне вы іграеце. Для мне, напрыклад, з самага дзяцінства ніколі не існавала розніцы паміж клубным канцэртам і вялікім. Канцэрт ёсць канцэрт. Трэба заўжды выкладвацца па поўнай. Тады вы атрымаеце аддачу, тады гэта не будзе ў пустэчу. Часта бачу, як сёння граюць маладыя. Як робаты! У іх ніводная жылка нідзе не ўздрыгне. Бездакорна тэхнічна. Але ніводная жылка, разумееце? А калі ў музыкі ніводная жылка, то і ў слухача таксама...

— Мая бабуля, якая была маім педагогам, казала мне, што трэба займацца, але я, вядома, гэтага не разумела. Прымушаць яна мяне не прымушала. Я не столькі займалася, колькі проста сядзела за інструментам і найгравала ўсё, што чула ад бабулі раней. У мяне заўжды было жаданне іграць, і па сёння ў мяне не знікла любоў да музыкі. Таму што ніхто мяне не прымушаў. Я да гэтага прыйшла сама. Даволі позна. Але тады, на шчасце, быў іншы час. Зараз крыху па-іншаму. Зараз час стаў неверагодна жорсткі, канкурэнцыя жудасная. Я сказала б не проста канкурэнцыя, а анамальная канкурэнцыя. Не толькі паміж выканаўцамі, а паміж педагогамі, школамі, краінамі. Нешта агіднае адбываецца сёння. Вельмі шмат маладых людзей, адораных неверагодна. Яны пачынаюць з вялікай ахвотай, ім гэта падабаецца — музыка, поспех. А потым яны страчваюць любоў. Музыка становіцца проста прафесіяй — спосабам зарабіць грошай больш і больш. Калі вы здзіўляецеся таму, што вы за вашу прафесію нейкія грошы атрымліваеце — гэта добра. А калі гэта рамяство, ад якога вы чакаеце ўсё большых даходаў, як гэта на сёння адбываецца з маладымі, на жаль, — гэта жудасна.

— Мне шкада сённяшнюю моладзь, музыкаў-пачаткоўцаў. Таму што яны вельмі добрыя. Калі ў іх няма фінансавай падтрымкі — гэта вельмі дрэнна. Нават калі яны трапляюць у нейкія фонды, якія дапамагаюць таленавітай моладзі — гэтага замала. Я мяркую па сваіх студэнтах, якія вучацца ў Маскоўскай кансерваторыі. Яны ўсе, у прынцыпе, адчуваюць нястачу. А стыпендыя ў нас максімальная 3000 расійскіх рублёў у месяц. Вы ж самі разумееце, што гэта за грошы... А вось адна мая студэнтка з Японіі, нягледзячы на тое, што ў іх там здарылася нядаўна такая трагедыя, атрымала 30 тыс. еўра на гадавое навучанне. Вы ўяўляеце, якая дапамога! У нас гэта практычна немагчыма, і гэта адзін з негатыўных момантаў жыцця маладога музыканта. Не кажучы пра тое, што кожны конкурс каштуе грошай. Для таго, каб паўдзельнічаць у нейкім конкурсе, трэба аплаціць усё: дарогу, візу, знаходжанне, унёскі нейкія. І з ўсёй гэтай матэрыяльнай бездапаможнасцю захаваць у сабе любоў да музыкі.

— У Грузіі з музыкай усё ў парадку. Тбілісі — адзін з нешматлікіх гарадоў, дзе, калі праходзіць даволі вядомы конкурс, з першага тура да апошняга — поўныя залы народу. Тое, чаго няма, напрыклад, у Італіі ды некаторых іншых краінах і паспяховых «разбэшчаных» турыстычных гарадах. У Італіі вы іграеце на конкурсе — там у кожнай вёсцы конкурс! — і ў зале сядзяць два чалавекі, журы і два чалавекі. Можа не быць наогул нікога. Краіны былога сацыялістычнага лагера не такія разбэшчаныя мерапрыемствамі такога кшталту, таму публіка ў іх, як ні дзіўна, больш цягнецца да музыкі.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Аляксандр БОЙКА:

«Прынцып дзейнасці прафсаюза — дасягаць найбольш важных для работнікаў і навучэнцаў сацыяльных гарантый»

— Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі заўсёды спрабаваў знайсці паразуменне з органамі заканадаўчай і выканаўчай улады і па большасці прынцыповых пытанняў яму гэта ўдавалася. Даводзілася прафсаюзу і канструктыўна апаніраваць уладам. Нашы прапановы дэпутацкаму корпусу, звароты ў адрас Савета Міністраў даказалі сваю ўзважанасць і актуальнасць, — пра гэта заявіў на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 90-годоваму юбілею Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі **старшыня Цэнтральнага камітэта Аляксандр БОЙКА**. — Толькі па пытанні вяртання ранейшай працягласці адпачынкаў педагагічным работнікам прафсаюз звяртаўся ва ўрад пяць разоў з моманту прыняцця папярэдняга рашэння. Вынікам сумеснай з Міністэрствам адукацыі працы стала прыняцце Саветам Міністраў пастановы № 679 ад 31 мая, якая вярнула работнікам дашкольных устаноў ранейшую працягласць іх адпачынку. Прыемна, што пазіцыя сацыяльных партнёраў, найперш работнікаў, Савета рэктараў ВНУ ў большасці выпадкаў салідарная з прапановамі прафсаюза. Гэта дапамагае дасягаць пастаўленых задач — так было з даплатамі за вучоныя ступені і званні, з захаваннем працягласці адпачынкаў, рашэннем пытанняў занятасці пры пераходзе школы на 11-гадовы тэрмін навучання...

Аляксандр Бойка паведаміў, што сёлета спаўняецца 20 гадоў з моманту заключэння першага галіновага пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі і прафсаюзам, якое ператварылася за два дзесяцігоддзі ў важкі пакет сацыяльных гарантый. Ці гэта не лепшае пацвярджэнне якасці і стабільнасці сацыяльнага партнёрства ў галіне?

Адным з самых складаных часоў у жыцці прафсаюза былі 90-я гады, калі работнікі адукацыі трапілі ў катэгорыю малазабяспечаных, а прафсаюзы засталіся практычна адзінай масавай арганізацыяй,

Здольнасць знаходзіць кампраміс, канструктыўна спрачацца, пагаджацца на рэальнае, дасягаць найбольш важных для работнікаў і навучэнцаў сацыяльных гарантый уласцівыя практычна ўсяму перыяду дзейнасці самастойнага галіновага прафсаюза...»

якая абараняла інтарэсы людзей працы. У верасні 1990 года адбыўся І з'езд прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Беларусі. У 1991 годзе ён быў зарэгістраваны Міністэрствам юстыцыі і ўпершыню заключыў галіновае пагадненне з Міністэрствам народнай адукацыі. Падмацаваныя масавымі забастоўкамі, мітынгамі і пікетамі патрабаванні па ўзмацненні сацыяльна-эканамічнай абароны былі накіраваныя ва ўрад і Вярхоўны Савет. І прафсаюз дамогся задавальнення часткі патрабаванняў. Так пачынаўся новы перыяд яго дзейнасці. Час паказаў, што зацікаўленыя ў развіцці галіны сацыяльныя партнёры не могуць быць увесь час па розныя бакі барыкад. Здольнасць знаходзіць кампраміс, канструктыўна спрачацца, пагаджацца на рэальнае, дасягаць найбольш важных для работнікаў і навучэнцаў сацыяльных гарантый уласцівыя практычна ўсяму перыяду дзейнасці самастойнага галіновага прафсаюза.

— Прафсаюз — гэта пастаянная рэальная дапамога работнікам галіны, — падкрэсліў у сваёй прамове на ўрачыстым сходзе Аляксандр Бойка. — Так, толькі за 2010 год па патрабаванні прафсаюза работнікам установаў адукацыі было выплачана каля 1,5 млрд рублёў, на працы было адноўлена 10 чалавек і папярэджана звальненне яшчэ 94-х работнікаў. Да 15,2 працэнта знізілася колькасць кантрактаў, заключаных з работнікамі нашай галіны тэрмінам на адзін год, і да 37 працэнтаў павялічылася колькасць пяцігадовых кантрактаў. На сённяшні дзень прафсаюз работнікаў адукацыі аб'ядноўвае больш як 605 тысяч чалавек: работнікаў галіны, ветэранаў і моладзь. Увага патрабуецца ўсім. Мы з вялікай павагай ставімся да ветэранаў працы, якія самі сабе называюць «настаўнікамі запасу», заўсёды імкнёмся падтрымаць іх маральна і матэрыяльна, і галоўнае — прыцягнуць да актыўнай работы з моладдзю. У радах прафсаюза 175 тысяч студэнтаў і навучэнцаў — будучых кіраўнікоў арганізацый не толькі адукацыйнай галіны, але і іншых галін народнай гаспадаркі. І ад таго, якую «школу» яны пройдуць, якімі будуць прафсаюзнымі актывістамі, што вынесуць з работы прафсаюза, залежыць, якімі яны стануць пазней прафсаюзнымі кіраўнікамі, працадаўцамі, як яны будуць ставіцца да людзей працы.

«Не сакрэт, што педагагічныя калектывы складаюцца пераважна з жанчын, якія прыносяць у нашу прафесію мацярынскі пачатак, любоў да дзяцей і дабрыню, таму наш прафсаюз можна разглядаць як саюз прафесіяналізму, інтэлекту і прыгажосці,» — з задавальненнем дадаў Аляксандр Бойка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Абзац

◢ Споўнілася 170 гадоў з дня нараджэння Элізы Ажэшкі, вядомай польскай пісьменніцы. «Каралевай жывога слова і пакутлівай праўды» называў яе беларускі паэт Францішак Багушэвіч. Нарадзілася на Гродзеншчыне ў маёнтку Мількаўшчына. Апошнія гады жыла ў Гродне. Беларускаму чытачу добра вядомыя яе цудоўныя раманы «Над Нёманам», «Хам», «Апошняе каханне», «Дзюрдзі». Інсцэніроўкі яе твораў ішлі ў тэатрах Беларусі, па аповесці «Хам» пастаўлены аднайменны шматсерыйны фільм. У Гродне ёсць помнік пісьменніцы, адна з галоўных вуліц носіць яе імя.

◢ **У Нараўлянскім раёне ў выніку няшчаснага выпадку загінуў хлопчык 2002 г. н., вучань 4-га класа. Цела дзіцяці з нажавым раненнем шыі было знойдзена на пустцы каля дома бацькоў. Высветлена, што за дзень да гэтага раненне хлопчыку падчас гульні нанёс аднавясковец, вучань 3-га класа, 2003 г. н.**

◢ У аддзяленні рэанімацыі Петрыкаўскай раённай бальніцы знаходзіцца сямігадовае дзіця з Рэчыцы. 4 чэрвеня хлопчык выпаў з акна трэцяга паверха жылога корпуса дзіцячага аздараўленчага лагера «Пціч». Гомельскія нейрахірургі правялі хлопчыку трэпанацыю чэрапа. Яго стан ацэньваецца як стабільна цяжкі. Міліцыя высвятляе абставіны здарэння. Паводле папярэдняй інфармацыі, НЗ адбылося ў першы дзень заезду дзяцей. Выхавальніца хадзіла па пакоях і адчыняла вокны. У адным з пакояў, дзе жанчына паспела адчыніць акно, знаходзіўся сямігадовы хлопчык. Сеўшы на падаконнік, ён абапёрся на маскітную сетку, якая парвалася, і хлопчык зваліўся.

◢ **У пятніцу каля 17.30 на вуліцы Шаранговіча ў Мінску джып пераехаў дзяўчыну. Маладая мінчанка загарала каля футбольнага поля ў спальным раёне. Месца ДТЗ знаходзіцца ўдалечыні ад праезнай часткі, у траве метровай вышыні. Пацярпелая ў цяжкім стане дастаўлена ў бальніцу, кіроўца джыпа знік з месца здарэння. Мяркуецца, што кіроўца не заўважыў дзяўчыну і наехаў на яе.**

◢ У Маскве ў раёне Новагірэева з-за няўважлівасці кіроўцы тралейбуса загінула 79-гадовая жанчына. Яна выходзіла з салона, а дзвярыма зацісnула яе сумку. 30-гадовы кіроўца не паглядзеў у люстэрка задняга віду, пачаў рух, а жанчына не адпусціла сумку. Толькі праз некалькі дзясяткаў метраў, калі яму сталі актыўна сігналіць іншыя машыны, кіроўца тралейбуса ўбачыў, што цягне жанчыну па асфальце. Урачы, што прыехалі па выкліку, канстатавалі смерць пенсіянеркі.

Поўны абзац

◢ **Жыхар Вільні Міндаўгас Пуоджус устанавіў рэкорд хуткасці паядання марозіва. 21-гадовы літовец змог з'есці 350 г ласунку за 29 секундаў. Дасягненне было зафіксавана падчас святкавання дня марозіва ў гандлёва-забаўляльным цэнтры літоўскай сталіцы. У бліжэйшыя дні арганізатары свята адправяць матэрыялы ў прадстаўніцтва Кнігі рэкордаў Гінэса, каб дасягненне Міндаўгаса зарэгістравалі афіцыйна. Папярэдні рэкорд хуткасці паядання марозіва быў устаноўлены ў 2006 г. у ЗША. Там мясцовы жыхар справіўся з 342-грамовай порцыяй за 30 сек.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЗНОЎ УЦЕЧКА АМІЯКУ

Здарэнні

Яна адбылася на ААТ «Барысаўскі малочны камбінат», пра што ў 20.22 паступіла паведамленне ў Барысаўскае падраздзяленне МНС.

На месцы выратавальнікамі было ўстаноўлена, што ўцечка аміяку адбываецца ў месцы ўстаноўкі засаўкі з трубаправода — дыяметрам 200 мм (210 ад паверхні зямлі), што вёў ад ёмістасці да рэсівера, які не працаваў. Апошні знаходзіўся на адкрытай пляцоўцы каля будынка аміячнай кампрэсарнай. Ліквідацыя аварыі праводзілася сіламі дзяжурнай змены самога прадпрыемства і падраздзяленнямі МНС. На ліквідацыю аварыі спатрэбілася 15 хвілін. Канцэнтрацыя пароў аміяку на адлегласці 15 м (другі рубеж) ад памяшкання аміячнай кампрэсарнай не перавысіла гранічна дапушчальнай канцэнтрацыі. Пацярпелых не было, падчас аварыі два рабочыя і тры ахоўнікі самастойна пакінулі небяспечную зону. Як мяркуецца, прычына ўцечкі — натуральны знос абсталявання.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПЯЦЬ ДЗІЦЯЧЫХ АХВЯР НА ВАДЗЕ ЗА ПЕРШЫ ТЫДЗЕНЬ КАНІКУЛ

Міністэрства аховы здароўя выказвае занепакоенасць у сувязі з пачашчэннем выпадкаў гібелі дзяцей на вадзе. Так, толькі за адзін мінулы тыдзень у краіне патанула 5 дзяцей ва ўзросце 10—11 гадоў у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Выпадковыя ўтапленні як прычына смерці лідзіруюць сярод няшчасных выпадкаў, траўмаў і атручэнняў у дзяцей ва ўзросце да 17 гадоў: іх доля складае ад 22 да 24 працэнтаў сярод вонкавых прычын смерці. Напрыклад, у 2009 годзе на вадзе загінула 79 дзяцей і падлеткаў, а ў 2010 годзе — 83. Для папярэджання ў далейшым выпадкаў гібелі дзяцей на вадзе ў Міністэрстве аховы здароўя лічаць неабходным падчас правядзення летняй аздараўленчай кампаніі арганізаваць навучанне дзяцей плаванню і правілам бяспечных паводзін на вадзе, у тым ліку пры катанні на лодках і занятках воднымі відамі спорту, прыняць меры па абмежаванні доступу дзяцей да небяспечных вадаёмаў, а купанне дапускаць толькі ў спецыяльна адведзеных месцах пад наглядам дарослых...

Надзея НІКАЛАЕВА.

У СЛОНІМЕ ЭКСКАВАТАРШЧЫК ВЫКАПАЎ СНАРАДЫ

На вуліцы Косаўскі тракт у Слоніме, недалёка ад вайсковай часці, падчас будаўніцтва гаражоў экскаваторшчык выкапаў тры артылерыйскія снарады. Адразу былі выкліканыя сапёры.

Сяргей ЧЫГРЫН.

ГРОДЗЕНСКІ ПРАДПРЫМАЛЬНІК НЕДАПЛАЦІЎ ПАДАТКАЎ БОЛЬШ ЯК НА BR1,3 МЛРД

Жыхар Гродна за чатыры гады ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ўхіліўся ад выплаты падаткаў і збораў у бюджэт у суме больш як Br1,3 млрд. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ва ўпраўленні Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі па Гродзенскай вобласці.

Следчым аддзелам упраўлення скончана расследаванне крымінальнай справы адносна гродзенскага бізнэсмена. З'яўляючыся індывідуальным прадпрымальнікам, ён заніжаў падаткаабкладальную базу шляхам унясення ў падатковыя дэкларацыі заведама несапраўдных звестак аб складзе затрат, а таксама ўхіляўся ад выплаты падаткаў і збораў. Так, не маючы магчымасці законным шляхам атрымліваць дакументы першаснага бухгалтарскага ўліку, праводзіць аперацыі па сваім разліковым рахунку, у 2006—2009 гадах пры адгрузцы тавараў контрагентам прадпрымальнік выкарыстоўваў дакументы першаснага бухгалтарскага ўліку чатырох іншых суб'ектаў гаспадарання. Ён атрымліваў выручку з разліковых рахункаў гэтых суб'ектаў, аб чым звесткі ў падатковыя дэкларацыі аб сваёй дзейнасці як ІП у 2006 годзе не ўносіў, а ў 2007—2009 гадах ухіляўся ад падачы падатковых дэкларацый у ІМПЗ.

Суд Кастрычніцкага раёна Гродна прыгаварыў вінаватага да пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 4 гады з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, з канфіскацыяй маёмасці, а таксама пазбаўленнем права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю тэрмінам на 5 гадоў.

МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 7 июля 2011 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАН РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В МИНСКОМ РАЙОНЕ

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Горанский с/с, д. Тейки	623681317601000033	0,1502 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 306 324	11 000 000	1 100 000
2	Горанский с/с, д. Тейки	623681317601000034	0,1354 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 210 518	10 000 000	1 000 000
3	Горанский с/с, д. Тейки	623681317601000035	0,1355 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 211 165	10 000 000	1 000 000
4	Горанский с/с, д. Жуки	623681305101000044	0,1398 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 420 208	11 000 000	1 100 000
5	Горанский с/с, д. Жуки	623681305101000045	0,1473 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 478 476	11 000 000	1 100 000
6	Горанский с/с, д. Жуки	623681305101000046	0,1525 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 518 880	12 000 000	1 200 000
7	Горанский с/с, д. Жуки	623681305101000047	0,1453 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 462 940	11 000 000	1 100 000
8	Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал № 705, участок № 4	623683403101007065	0,1037 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 363 388	67 000 000	6 700 000
9	Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал № 7122, участок № 16	623683403101007064	0,1496 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 363 388	61 000 000	6 100 000
10	Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал № 7125, участок № 32	623683403101007063	0,1600 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 363 388	65 000 000	6 500 000
11	Колодищанский с/с, п. Колодищи, квартал № 720, участок № 9	623683403101007066	0,1539 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 363 388	62 000 000	6 200 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **07.07.2011 г.** в 9.30. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **01.07.2011 г.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–7 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 8–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Футбол. Беларусь—Францыя

НЕ CATASTROPHIC

Каманда Францыі ў наймацнейшым складзе не здолела абыграць нашу зборную

ПЕРАД матчам са зборнай Францыі, у якім, як мы ведалі, наша каманда будзе выступаць ледзь не другім складам з-за вялікай колькасці траўмірованых і дыскваліфікаваных, толькі самыя вялікія аптымісты не прадракалі нам пройгрышу з разгромным лікам. Усё было супраць нас, у тым ліку і раззлаваная зборная Францыі, якая прыехала браць рэванш за верасень-2010 і свае тры ачкі ў скарбонку на Еўра-2012.

Стадыён быў амаль перапоўнены — толькі на сектарах, адведзеных для французскіх заўзятараў, былі рэдкія «праплешыны». Нягледзячы на незадаволенасць пільнасцю міліцыі падчас такіх матчаў, нашы балельшчыкі не сталі байкатаваць матч і раскупілі ўсе білеты, нават па 70 тысяч. А за два дні да матча ў такое не верыў нават аптыміст Штанге. Галоўны трэнер ушчуваў, што зараз у беларусаў іншыя праблемы, ім не да футбола...

Аднак беларусы прыйшлі паглядзець на Саміра Насры і Ко. Верылі ў нашу перамогу фанаты з групы B-12. Падчас гучання «Марсельезы» фанацкі сектар разгарнуў вялізны банер з надпісам Catastrophic — тым самым, які быў загалоўкам у французскіх газетах пасля нашага сенсацыйнага выйгрышу на «Стад дэ Франс». Але падчас 20-хвіліннага камбінацыйнага футбола, з якога пачала беларуская каманда, мы спадзяваліся на лепшае, але рыхтаваліся да горшага. Франк Рыберы («Баварыя»), Карым Бензема («Рэал»), Самір Насры (Арсенал»), Фларан Малуда («Чэлсі»), Эрык Абідаль («Барселона») — французскі трэнерскі штаб выставіў каманду ў наймацнейшым складзе. Калегі дзяліліся прагнозамі: 0:2 ці 0:3? А на 20-й хвіліне падчас розыгрышу штрафнога мяч трапіў у французскія вароты ад Эрыка Абідаля. 30-тысячны стадыён зайшоўся ў экстазе! Балельшчыкі побач скандзіравалі: «Абідаль! Абідаль!» Пасля гэтага кур'ёзнага моманту з трыбун пасля нярэдка даводзілася чуць: «Аддайце мяч Абідалю! Наш хлопец».

Радавацца, як вядома, наканавана было нядоўга: на 22-й хвіліне французы лік зраўнялі, падлавіўшы беларусаў на контратацы. Гол забіў Фларан Малуда. Здавалася, што ўджаленыя «трохкаляровыя» зараз «адгрузяць» нам поўную авоську, аднак ні ў другой палове першага тайма, ні ў другім адрэзку паядынка падапечныя Ларана Блана нічога сур'ёзнага паказаць не змаглі: у футбалістаў скончыўся сезон і настрой на адпачынак браў сваё.

— Беларусь гуляла добра і цалкам заслужыла гэтую нічыю, — каментарый пасля матча ад трэнера «Арсенала» **Арсена ВЕНГЕРА**, які прыехаў у Мінск і каментаваў паядынак для французскага канала TF-1, цалкам адпавядае ўбачанаму на полі. Арсен Венгер хутка ўцёк ад прэсы, што не ўдалося **Аляксандру ГЛЕБУ**. Паўабаронца на кастылях накіроўваўся на сустрэчу з трэнерам «Арсенала» і падзяліўся сваім меркаваннем:

— Пасля фінальнага свістка не паверыў, што мы ўзялі ачко. Але гэта футбол, такое нярэдка здараецца. Лік абсалютна справядлівы. Мне вельмі спадабалася наша каманда, асабліва ў першым тайме. Хлопцы біліся самааддана, вельмі дысцыплінавана згулялі. Калі балельшчыкі ці прэса раскрытыкуюць матч, то мне ўвогуле будзе незразумела, што ім трэба. Мне самому хацелася выбегчы на поле і дапамагчы камандзе, перажываць на трыбуне нашмат складаней. Што магу сказаць пра французаў? Ну, не ведаю, крыху вяленькія яны былі. Так што мы набылі адно ачко, а супернік два страціў.

Бернд ШТАНГЕ пасля матча здзівіў: здавалася, нічыёй з Францыяй трэнер не задаволены, а, хутчэй, засмучаны:

— У нас была цяжкая зыходная пазіцыя: усё было супраць нас. Але мы гэтай сітуацыяй скарысталіся: з першых хвілін пачалі атакаваць французаў. І вялі ў ліку абсалютна заслужана, але хутка атрымалі гол у адказ. У другой палове нашы фізічныя кандыцыі значна аслаблі. Але нам удалося завяршыць матч унічыю: 1:1. Французская каманда, якая выступіла ў наймацнейшым складзе, згуляла добра, але нам удалося ёй супрацьстаяць. Мы ганарымся гэтым. Але сапраўдную каштоўнасць гэты вынік набудзе, калі мы пераможам Люксембург. Мы будзем змагацца да апошняй секунды за гэты чэмпіянат Еўропы, — паабяцаў Бернд Штанге.

— Мы расчараваны вынікам: мы хацелі атрымаць тры ачкі, але калі ацэньваць увесь матч, то мы не нашмат пераўзыходзілі суперніка. Атрымалася прыблізна такая ж гульня, як і ў Парыжы. Нам не хапала хуткасці, перадачы наперад.На міжнародным узроўні, калі нашмат не пераўзыходзіць суперніка, складана выйграць такі матч. Калі мы аднавілі раўнавагу, была ўпэўненасць, што зможам пераламаць ход гульні. Магчымасці былі, але мы іх не скарысталі. Брава камандзе Беларусі, — падзяліўся **Ларан БЛАН**.

Сапраўды, на тварах французскіх футбалістаў, якія пакідалі поле, чытаўся сум па страчаных ачках. Не catastrophic, вядома, але непрыемна...

Алена АЎЧЫННІКАВА.
Фота БЕЛТА.

ВЫПРАБАВАННЕ ЛЮКСЕМБУРГАМ

Сёння наша зборная згуляе супраць аўтсайдара групы

Сёння ўвечары на стадыёне «Дынама» зноў вялікі футбол. Пасля нічыйнага выніку з Францыяй, у двух матчах з якой наша каманда ўзяла чатыры ачкі, нас чакае Люксембург. На першы погляд, усё вельмі проста — аўтсайдар групы D, які ў сваім актыве пасля шасці гульняў мае 1 ачко. Складанае пачынаецца, калі ўзгадаць нашы асабістыя сустрэчы з гэтым супернікам. Усе мы памятаем гэтую футбольную апляўху падчас першых трэнерскіх эксперыментаў Бернда Штанге — пройгрыш у Гомелі 0:1 13 кастрычніка 2007 года ў матчы да Еўра-2008. А ў гэтым адборачным цыкле нулявая нічыя з гэтай камандай на выездзе, якой толькі мы і падарылі ачко. У чым складанасць гульні супраць Люксембурга, мы пацікавіліся ў **Бернда ШТАНГЕ**.

— Усе ў Еўропе ведаюць, што зборная Люксембурга гуляе з чатырма абаронцамі, перад якімі ланцугом стаіць яшчэ пяць гульцоў. Такая эшаланіраваная абарона: дзевяць гульцоў сканцэнтравана ў штрафной. Яны не імкнуцца дамінаваць ці самі гуляць у футбол. У лепшым выпадку стараюцца дасягнуць выніку праз стандарты. У першым матчы супраць Люксембурга мы дамінавалі — у нас 80 адсоткаў валодання мячом. Потым чырвоную картку атрымаў Карніленка. Мы пастараліся ўдзесяцёх выйграць, аднак не змаглі. Цяпер у нас час для рэваншу.

Як гуляць супраць Люксембурга, Бернд таксама ведае:

— З такім супернікам трэба быць цярплівым і мець добрыя нервы. Я немец, і вы ведаеце нямецкі менталітэт: мы людзі цярплівыя. Немцы забівалі Францыі і на 90-й хвіліне. Каманда павінна несці ўпэўненасць у сабе, і мы выйграем.

Праўда, з такой абаронай, як у каманды Люксембурга, аднаго цярпення недастаткова. Патрэбны яшчэ і нападаючыя, каб яе прайсці. Ці рызыкне Бернд згуляць з двума нападаючымі?

— З Люксембургам трэба гуляць, магчыма, не з двума, а з чатырма нападаючымі. Мы не павінны даваць прасторы суперніку. Аднак трэба і яшчэ штосьці памятаць. Наш нападаючы Андрэй Варанкоў прайшоў складаны чэмпіянат Украіны, адгуляў 90 хвілін з Францыяй, зараз згуляе з Люксембургам, а 11 чэрвеня пачынаецца моладзевы чэмпіянат Еўропы. Мы не павінны знішчыць Андрэя, трэба і гульцам даваць паўзы.

Нападаючы **Андрэй ВАРАНКОЎ** быў дэбютантам зборнай на тым злашчасным матчы ў Гомелі, прайграным Люксембургу. Мы спыталі ў Андрэя пра ўражанні і папрасілі ахарактарызаваць суперніка:

— Я тады дэбютаваў у камандзе, спадзяваўся на станоўчы вынік. Але пазітыўных эмоцый не атрымаў. Я быў расстроены і незадаволены, доўга раздумваў, чаму так усё атрымалася. Зараз хочацца даказаць, што гэта была выпадковасць. Цяжка ахарактарызаваць Люксембург. Яны найперш у мяне выклікаюць асацыяцыі з абаронай, а не з сілай. Але ёсць да іх павага.

Наша каманда рыхтавалася да матчу ўсе выхадныя: у суботу і нядзелю гульцы трэніраваліся, праўда, мелі і вольны час для таго, каб адысці ад спраў футбольных у коле сям'і і сяброў. У панядзелак камандзе прадэманстравалі відэанарэзку гульняў Люксембурга і ўказалі на моцныя і слабыя бакі суперніка.

Напрыканцы Бернд Штанге ўзгадаў прыемную для сябе статыстыку сустрэч з Францыяй:

— У якасці нацыянальнага трэнера я гуляў супраць Францыі 6 разоў. Адну гульню прайграў, тройчы выйграў, і дзве нічыя.

Але нас больш цікавіла статыстыка з Люксембургам:

— Таксама пазітыўная. Здаецца, 2 перамогі, 1 нічыя, 1 паражэнне — збольшага пазітыўная, — не жадаючы ўзгадваць пра непрыемнае, коратка адказаў Бернд.

Яшчэ адзін фактар, які можа згуляць не на карысць нашай каманды сёння ўвечары — паўпустыя трыбуны. Калі на матчы з Францыяй было прададзена толькі білетаў 29,5 тысячы, а з улікам запрашэнняў атрымалася больш за 30 тысяч балельшчыкаў, то з Люксембургам усё не так аптымістычна. Нягледзячы на тое, што білеты ўдвая таннейшыя, чым на зборную Францыі, ці пажадаюць нашы заўзятары ісці на матч з аўтсайдарам групы? Бернд Штанге таксама адзначыў ролю балельшчыкаў:

— У матчы з Францыяй былі цяжкія фазы ў гульні. Але гледачы апладзіравалі камандзе, нават калі мяч выбівалі на трыбуны. Дзякуючы заўзятарам з дабаўленых 2 хвілін мы згулялі толькі 1.45 — так свісталі гледачы. На матч з Люксембургам я адкрыў бы стадыён для вольнага ўваходу, а тыя, хто набыў білеты, змаглі б па іх прайсці на Боснію. Але я павінен быць сканцэнтраваны на футболе, маркетынг — не мая справа...

Нам жа застаецца перажываць за сваіх і верыць: пасля зорнай зборнай Францыі не перайграць Люксембург мы проста не можам.

Становішча ў групе D: Францыя — 13 ачкоў (6 матчаў, розніца мячоў 9-2), Беларусь — 9 (6; 4-2), Румынія — 8 (6; 8-6), Албанія — 8 (5; 4-4), Боснія і Герцагавіна — 7 (5; 6-7), Люксембург — 1 (6; 1-11).

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ШТУРХАЛЬНІЦА ЯДРА НАДЗЕЯ АСТАПЧУК ВЫЙГРАЛА 4-Ы ЭТАП БРЫЛЬЯНТАВАЙ ЛІГІ Ў ЮДЖЫНЕ

Надзея Астапчук, для якой гэтыя спаборніцтвы сталі першым стартам у сезоне, штурхнула снарад на 20,59 м, прадэманстраваўшы лепшы вынік сезона ў свеце і ўстанавіўшы рэкорд турніру. Яшчэ адна беларуска Наталля Міхневіч паказала пяты вынік (18,48 м).

МАКСІМ МІРНЫ І ДАНІЭЛЬ НЕСТАР ВЫЙГРАЛІ ПАРНЫ ТУРНІР «РАЛАН ГАРОС»

Беларус Максім Мірны і канадзец Даніэль Нестар выйгралі парны турнір адкрытага чэмпіянату Францыі па тэнісе, які завяршыўся 5 чэрвеня на кортах «Ралан Гарос» у Парыжы, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

У фінальным матчы пасеяны пад другім нумарам беларуска-канадскі дуэт узяў верх над парай Хуан Себасцьян Кабаль (Калумбія) / Эдуарда Шванк (Аргенціна) — 7:6 (7:3), 3:6, 6:4.

Для Максіма Мірнага гэта ўжо трэцяя перамога ў парным разрадзе «Ралан Гарос». У 2005 і 2006 гадах ён перамагаў у Парыжы разам са шведам Юнасам Б'ёркманам.

Усяго ж на рахунку Максіма Мірнага пяць парных перамог на турнірах «Вялікага шлема»: тры — на «Ралан Гарос» і дзве — на адкрытым чэмпіянаце ЗША.

БЕЛАРУСКІ ЗАВАЯВАЛІ БРОНЗУ КАМАНДНАГА КУБКА ЕЎРОПЫ Ў БЕГУ НА 10 000 М

Беларуская жаночая каманда (Святлана Кудзеліч, Вольга Мініна, Святлана Коўган) заваявала бронзавыя медалі на 15-м камандным Кубку Еўропы ў бегу на 10 000 метраў у г.Осла (Нарвегія), паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі.

Золата дасталася зборнай Італіі, серабро — камандзе Партугаліі.

Нагадаем, у 2010 годзе беларуская жаночая дружына (Святлана Кудзеліч, Вольга Мініна, Святлана Коўган) таксама заняла трэцяе месца на Кубку Еўропы ў бегу на 10 000 м і была прызнана трэнерскім саветам Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі лепшай жаночай камандай 2010 года.

У асабістым заліку беларускі ў г. Осла занялі наступныя месцы: Святлана Кудзеліч (Мінск) — 7-е (32 мін. 40,60 сек.), Святлана Коўган (Мінск) — 16-е (33 мін. 24,68 сек.), Вольга Мініна (Магілёўская вобл.) — 23-е (33 мін. 48,26 сек.), Настасся Старавойтава (Мінская вобл.) — 26-е (34 мін. 16,83 сек).

У мужчынскім забегу Сцяпан Рагаўцоў (Магілёўская вобласць) фінішаваў 11-м — 29 мін. 05,58 сек.

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 29 июня 2011 г. в 15.00 СОСТОЯТСЯ
ОТКРЫТЫЕ АУКЦИОННЫЕ ТОРГИ (повторные) по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лотов (предмет торгов):

Лот № 1 – Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-2961 (здание нежилое, двухэтажное, кирпичное) общей площадью 578,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Бахарова, 41/30, *находящееся в стадии реконструкции под жилой многоквартирный дом с подвалом общей площадью 358,7 кв.м (общая площадь по проектно-сметной документации 837,9 кв.м), строительство которого не завершено, не законсервировано и не зарегистрировано, процент готовности составляет 19,49 %*

Лот № 2 – Недостроенное одноэтажное здание из белого кирпича общей площадью 876,9 кв.м, процент готовности 26,1 %, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Пушкина, 270. *Здание как незавершенный строительством объект недвижимого имущества – не законсервирован и не зарегистрирован*

Лот № 3 – Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-399 (помещение (незавершенное строительство)) общей площадью 2 768,7 кв.м, процент готовности 98,92 %, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Ульяновская, 60, в том числе установленное оборудование: кондиционер Panasonic CS-A18GKD/CU-A18GKG, кондиционер Gree KFR-120TW/B (1241 Т), система пожарной сигнализации и пожаротушения

Лот № 4 – Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-3658 (помещение аптеки) общ. пл. 203,1 кв.м и Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-3657 (помещение) общ. пл. 515,4 кв.м, расположенные по адресу: г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 43/35, *находящиеся в стадии реконструкции под двухэтажное кирпичное здание с мансардой общей площадью 1 614 кв.м, строительство которого не завершено, не законсервировано и не зарегистрировано, процент готовности 44,97 %*

Организатор торгов	**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, УНП 102353509**			
Место проведения торгов и подачи документов	**г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»**			
Номер расчетного счета для перечисления задатка	**Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» р/с 3012105618010 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Банк» код 369, ОКПО 55484006, УНП 102353509**			
Общие сведения	**Лот № 1**	**Лот № 2**	**Лот № 3**	**Лот № 4**
Начальная цена продажи	**236 970 684 рубля**	**274 218 696 рублей**	**9 246 322 718 рублей**	**1 205 920 548 рублей**
Размер задатка	**23 697 090 рублей**	**27 421 870 рублей**	**924 632 270 рублей**	**120 592 050 рублей**
Площадь земельного участка	**0,0537 га,** кадастровый № 741000000006000876, правовой режим – постоянное пользование	**0,1526 га**, кадастровый № 741000000006000294, правовой режим – аренда	**0,2769 га**, что составляет 3701/10000 долей зем. участка с кадастровым № 741000000003000115, правовой режим – право общего долевого постоянного пользования без разграничения границ на местности	**0,0960 га**, кадастровый № 741000000006000225, правовой режим – постоянное пользование
Условия продажи	Аукцион без условий			
Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество	В течение 60 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами			
Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка	**включительно с 07 июня 2011 г. по 28 июня 2011 г. до 16.00**			

Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона не позднее 5 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов в размере 3 % от продажной цены лотов № 1 и № 2; в размере 0,5% от продажной цены лота № 3; в размере 1% от продажной цены лота № 4.

****Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 09 июня 2010 г. (по лотам № 1 и № 2), в газете «Рэспубліка» от 24 июля 2010 г. (по лотам № 3 и № 4)**

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 52 08 45, 52 86 96, 52 70 32, 8 (029) 654 79 06 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 624048-624050 считать недействительными.
УНП 101883943

Утерянный представительством Белгосстраха по Партизанскому району бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛ № 397154 считать недействительным.
УНП 101883943

Шмат гадоў былы журналіст, а цяпер пенсіянер Міхаіл Іванавіч Рылко са Слоніма, марыць адкрыць свой уласны музей-майстэрню «Беларускае мястэчка». Музей, праўда, ужо ёсць, і экскурсантаў у ім бывае шмат. Але экспанаты музея месцяцца ў яго асабістым доме на вуліцы Карла Маркса. А асветнік па духу Міхаіл Рылко даўно хоча, каб яму ў Слоніме далі спецыяльнае памяшканне пад музей, нейкі аклад, і чалавек шчыра працаваў бы, прымаў экскурсіі, асобных гасцей нашага горада, і яны глядзелі б на прадметы побыту мінулых гадоў і стагоддзяў, якія за сваё жыццё сабраў гэты калекцыянер. Але гады ідуць, а яму дапамагчы не можа ці не жадае ніхто: ні мясцовая ўлада, ні аблвыканкам, ні Міністэрства культуры... Гатовы музей, дзе паглядзець, шчыра скажу, ёсць што. Падобнай сабранай вялікай калекцыі ў Беларусі больш няма.

ПРА МУЗЕЙ, ДЗЕ ЁСЦЬ УСЁ:
ад кішэннага патэфона да аўтографа Уладзіміра Караткевіча

— Міхаіл Іванавіч, вы стварылі ў Слоніме некалі першы ў Беларусі прыватны музей. Гэта цяпер прыватныя музеі ёсць амаль у кожным раённым цэнтры. Але ваш музей вельмі багаты, своеасаблівы, цікавы, насычаны. Як пачыналася яго гісторыя?

— У гэтай гісторыі ёсць яшчэ перадгісторыя. Адлічваючы апошнія лісткі календара 1999-га, года наступіў знамянальны 2000-ы год, новае стагоддзе. «Что век грядущий нам готовит?». Людзі задумваліся, прыслухоўваліся, спадзяваліся на лепшыя перамены ў жыцці. А тыя, хто ніколі ні на каго не разлічвалі, не чакалі, прыспешвалі і набліжалі сваё «грядущее» самі. Такую радасць давялося паспытаць і мне — стварыць музей «Беларускае мястэчка» ў Слоніме. У слонімскага мясцовага начальства склалася думка, што ўжо здаўна існуе раённы музей. То навошта «гарадзіць» яшчэ адзін? Толькі на гэта будуць ісці дадатковыя расходы. Так што ініцыятыва з пашырэннем сферы культурнай дзейнасці не адразу атрымала падтрымку. Таму стварылася парадаксальная сітуацыя: створаны музей ужо карыстаецца вядомасцю, аб ім пісалі і пішуць газеты і часопісы, на кінастудыі «Беларусьфільм» выпусцілі дакументальны фільм, стала пашырацца кола наведвальнікаў з блізкага і далёкага замежжа, але заўсёды абмяркоўваецца думка аб яго немэтазгоднасці. Як жа так?..

На пачатку 1960-х гадоў я пачынаў з паштовак, прысвечаных мастацтву і народнаму промыслу. Пасля фарміраваліся бібліятэка і архіў, збіраліся прадметы культуры і побыту.

— Адзін з першых раздзелаў вашай кнігі мае назву «На ўваходзінах у каморніка». Відаць, у вашай калекцыі ёсць шмат рэчаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю каморніка?

— Землямер-каморнік быў заўсёды не з бедных людзей. Ён пражываў на добраўпарадкаванай сядзібе альбо ў асобнай кватэры з добрай мэбляю. У маёй калекцыі захоўваецца мэбля 20-30-х гадоў мінулага стагоддзя. Гэта вешалка-стаяк са здымным венчыкам для вопраткі, стол з точанымі ножкамі, набор крэслаў (сярод іх ёсць і венскае крэсла), трохдзверны буфет з «горкай» пад шклом для захавання сталовага посуду і прыбораў, настольная лямпа з чырвонага дрэва пад палатняным абажурам з бахрамой у стылі «мадэрн», стары халадзільнік, дзе проста выкарыстоўваўся лёд для холаду, і іншыя рэчы.

— Ваш дом знаходзіцца на вуліцы Карла Маркса, раней яна называлася Жыровіцкай вуліцай. Але вы пра Карла Маркса і згадваць не хочаце. Можа, трэба вярнуць старую назву вуліцы Жыровіцкая, якая вядзе проста на Жырава і на якой жывяце вы?

— Гэта так. Але больш дакладна і абагульняючы тут варта сказаць пра цэлае скрыжаванне дарог, якія збягліся ў гэтым памятным месцы, дзе я жыву. З аднаго боку, яны нагадваюць пра слаўныя паходы воінаў Вялікага Княства Літоўскага, дзе яны атрымалі перамогу ў бітве пад Грунвальдам у 1410 годзе. З другога боку, на гэтых дарогах-шляхах пакінуў свае апусташальныя сляды адзін з крымскіх татараў — хан Гірэй. Адсюль па дарозе ў 1812 годзе напалеонаўскія войскі ўцякалі на Захад. Мой дом на Жыровіцкай вуліцы амаль напрамую спрафіліраваны на аўтамагістраль, што злучае з аднаго боку Гродна, Брэст, Беласток, а з другога — Мінск. Адсюль можна лёгка збочыць на Ружаны, дзе знаходзіўся палац Сапегаў. Па Косаўскім тракце, які таксама пачынаецца адсюль, можна трапіць у Марачоўшчыну, дзе нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка. А калі ехаць на Баранавічы — то недалёка Мілавіды, дзе паўстанцы Кастуся Каліноўскага ў 1863 годзе ў баі ўстаялі перад царскімі карнікамі.

— Вы так распавядаеце пра месца, дзе стаіць ваш дом-музей, што здаецца, перавёз бы сюды і свой шматпавярховы. Ведаю, што ў вашым доме пабывалі шматлікія цікавыя і знаныя людзі Беларусі...

— Мой дом належыць майму цесцю Івану Саланевічу — былому вязню лагера ў Картуз-Бярозе і ўдзельніку Другой сусветнай вайны. Цікавых людзей тут было шмат. Прыгадваецца мне Аляксандр Самуйлік, якога ў нашым доме прымалі як роднага чалавека. Ён у гады вайны быў камандзірам партызанскага атрада, у якім ваяваў Іван Саланевіч. У доме на Жыровіцкай заўсёды гучалі ўспаміны ветэранаў, якія я запісаў на магнітафонную стужку і захоўваю цяпер у музеі пад назвай «Галасы гісторыі». А пра легендарны рэйд партызан у Іванаўскім раёне ў лістападзе 1942 года нават напісаў кнігу «Красный поезд» і выдаў яе ў Мінску ў 1984 годзе.

— Міхась Іванавіч, акрамя вядомых людзей Беларусі, у вашай кніжцы адведзена месца і простым слонімцам, з якімі вы знаёмы, сябруеце, якія часта бываюць у вашым музеі, дораць вам сувеніры, цікавыя музейныя рэчы і г.д.

— Без такіх людзей не было б «Беларускага мястэчка». Усіх слонімцаў і людзей з суседніх раёнаў нават немагчыма пералічыць: Міхась Літвінчык, Уладзімір Карасёў, Мікалай Сончык, Уладзімір Шышкоў, Юрый Крэтаў, Міхась Крысюк і дзясяткі іншых. Аднойчы Вячаслаў Качук з Ваўкавыска здабыў разумна сканструяваны страгальна-рэжучы спуск. На яго корпусе можна было прачытаць назву даўняй англійскай фірмы. Ручны станок з дзвюма накіроўваючымі станінамі, між імі замацаваны фігурныя нажы-заточкі, якія захоўваюцца ў пеналах (у кожным па 12 разцоў), а ўсяго — 48. Кожны з разцоў пакідае на дрэве непаўторны рэльефны малюнак. «Дзе адшукаць столькі адборнікаў для чырванадрэўшчыкаў?» — паказаў Вячаслаў, не хаваючы свайго задавальнення і перадаў гэты спуск у музей.

— Добра, што вы ў сваёй кнізе апублікавалі прыкладны спіс экспанатаў вашага хатняга музея. Тут ёсць іконы, творы жывапісу, фарфору, медалі, значкі, чаканкі, самавары, сувеніры з дрэва і шкла, музычныя інструменты, прасы, гадзіннікі, розныя прыборы, вагі, клямкі, кнігі, паштоўкі, куфэркі і г.д. Раскажыце трохі пра самыя цікавыя і каштоўныя экспанаты. Ну, напрыклад, пра музычныя інструменты.

— Найчасцей бывае так, што шукаеш — не можаш знайсці, а бывае і так, што вельмі пашанцуе. Ёсць у мяне скрыпка са смычком у футляры, пазначана друкарскай этыкеткай «Страдывары». Гэтая скрыпка была знойдзена ў вёсцы Вензавец Дзятлаўскага раёна. Доўгі час пад яе дэкай захоўваўся (ён зачароўвае) надпіс «Страдывары», абазначаны друкаванымі літарамі. Вядома, што гэта не сапраўднае кляймо цудатворца ў музыцы. Але, ва ўсякім разе, можна ўявіць сабе, як мог выглядаць сапраўдны Страдывары. Сярод шчыпковых музычных інструментаў можна выдзеліць мандаліну з касцянымі разбянымі накладкамі на грыфе і на механізме нацягвання струнаў, інкруставаную перламутравымі рамонкамі вакол слухавога галасніка. Яна была выраблена ў Варшаве больш за 100 гадоў таму. Ёсць у маім музеі і фісгармонія, якая гучыць з дапамогай нагнятальнага паветра. Зроблена яна была ў Санкт-Пецярбургу ў 1898 годзе. Здзіўляе і кішэнны патэфон, а таксама паходны грамафон з выведзенай звонку трубкай. Ён быў выраблены даўно на фабрыцы ў Маскве.

— Вельмі шмат у вашым музеі экспанатаў беларускага кавальства і сталярні. Згадайце што-небудзь цікавае.

— Некалі жыў у вёсцы Стараельня на Дзятлаўшчыне дзядзька Кастусь, які сам пра сябе іншы раз казаў, што ён «Кастусь — майстар на ўсю Беларусь». І за гэтай яго ганарлівасцю адкрываліся добрыя справы. З яго ўдзелам ў наваколлі ўзводзіліся самыя, як сёння кажуць, крутыя будоўлі. У сваёй справе ён абыходзіўся без цвікоў. Да яго прыязджалі адусюль, каб на дзіва паглядзець і зразумець, адкуль у працы такі спрыт бярэцца. У яго майстэрні доўга захоўваўся гадзіннік-ходзікі на гірах, усе дэталі якога былі зроблены з дрэва. І ў маім музеі ёсць яго работа — драўляны вобад, прызначаны для зборкі драўлянага веласіпеда. На такіх «колах», як мне казалі людзі, не адзін тутэйшы вясковец пакалясіў.

— У вашым музеі вялікая калекцыя гадзіннікаў. У некаторых з іх ёсць і свая гісторыя...

— Вось, напрыклад, насценны гадзіннік з точанай насадкай і завяршэннем на корпусе з чырвонага дрэва. Механізм на гірах, маятнік, спружына бою, фарфоравы цыферблат з секунднай стрэлкай і надпісам «Ганс Бекер». Гадзіннік быў знойдзены ў Міры. Яму шмат гадоў.

— Сярод цікавых экспанатаў вашага музея знаходзіцца калекцыя геаграфічных картаў з глобусамі.

— Ёсць карта Сібірскай чыгункі 1916 года, глобус настольны пад рэдакцыяй варшаўскага прафесара Ромера 1927 года і іншыя.

— Значнае месца ў «Беларускім мястэчку» адведзена архівам. Тут захоўваюцца розныя фотаздымкі, дакументы, даведкі, пісьмы, пасведчанні. І шмат якія непасрэдна звязаны з людзьмі і са Слонімшчынай. Раскажыце трохі пра нейкія асобныя і цікавыя дакументы.

— Вось ваенны білет радавога Мікіты Якаўчыка, выдадзены ў 1906 годзе слонімскім павятовым начальнікам. Ёсць пашпартная кніжка настаўніцы Ламашоўскага народнага вучылішча Слонімскага павета Надзеі Чарэшкі. Кніжка была выдадзена ў траўні 1913 года. А гэта дамова на карыстанне зямлёй з пячаткаю і за подпісам Палонскага — слонімскага старасты, 1914 год, і шмат іншых дакументаў...

З Міхаілам Іванавічам Рылко можна гутарыць доўга і пра ўсё. Верыцца, што знойдзецца ў Слонімскім райвыканкаме ці ў Міністэрстве культуры Беларусі неабыякавы чалавек, які зразумее не толькі прэстыжнасць гэтага прыватнага музея, але здолее дапамагчы апантанаму слонімцу здзейсніць тое, што задумана для ўзбагачэння духоўнай культуры нашага народа.

Сяргей ЧЫГРЫН, фота аўтара.

ПАЛЕССЕ ЛІДЗІРУЕ

МІНІСТЭРСТВА сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі падвяло вынікі рэспубліканскага спаборніцтва за дасягненне высокіх паказчыкаў у вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі ў мінулым годзе. Прадстаўнікі аграпрамысловага комплексу Гомельскай вобласці адзначаны ў шэрагу намінацый.

Так, лепшым у Беларусі па вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі прызнаны Мазырскі раён. У прэс-службе камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама таксама паведамілі, што першымі ў краіне сярод сельгаспрадпрыемстваў, якія маюць комплексы па вытворчасці свініны, стала сялянская гаспадарка Міхаіла Шруба з Жыткавіцкага раёна. Тут высокай ацэнкі працы дасягнулі другі год запар. Другім у рэспубліцы сярод сельгаспрадпрыемстваў, якія маюць комплексы па вытворчасці ялавічыны, стала КСУП «Слабадское імя Леніна» з Мазырскага раёна. Дыпломамі і буйнымі грашовымі прэміямі адзначаны сельгасарганізацыі «50 гадоў Кастрычніка» з Рэчыцкага раёна, КСУП «Камбінат «Усход» з Гомельскага і КСУП «Прагрэс-Агра» Светлагорскага раёна. Дыпломамі і грашовымі прэміямі ў памеры ад Br700 тыс. да Br1,5 млн адзначаны і лепшыя спецыялісты ў сельскай гаспадарцы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Транспарт

Трэніроўкі да парада скарэктуюць рух транспарту

У перыяд правядзення трэніровак ваеннай тэхнікі змяненні закрануць працу шэрагу маршрутаў гарадскога і прыгараднага транспарту ў сталіцы.

У прыватнасці, як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», у сувязі з вышэйсказаным да 23 чэрвеня па аўторках, серадах, чацвяргах з 9.00 да 9.45 і з 15.00 да 15.45 будзе закрыты рух усіх відаў транспарту па вуліцы Заснавальнікаў (раён ваеннага гарадка «Уручча»). Ва ўказаны перыяд часу рэйсы на гарадскіх і прыгарадных аўтобусных маршрутах №№ 31, 86, 155, 306, 399 выконвацца не будуць.

Таксама ў сувязі з правядзеннем трэніровак роты ганаровай варты ў раёне абеліска «Мінск — горад-герой» 15, 17-18, 24-25, 27, 29 чэрвеня з 22.00 да 24.00 будзе закрыты рух усіх відаў транспарту па праспекце Машэрава на ўчастку ад вуліцы Даўмана і да праспекта Пераможцаў. Ва ўказаны перыяд рух аўтобусаў гарадскіх маршрутаў №№ 29, 44, 136 арганізуецца ў абодвух напрамках па праспекце Машэрава, вуліцы Даўмана, Старавіленскім тракце, вуліцах В. Харужай, Чарвякова, Арлоўскай, праспекце Пераможцаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НЕБЯСПЕЧНАЯ КАЛЕКЦЫЯ КАНФІСКАВАНА

Апантаны стварэннем калекцыі зброі жыхар Рэчыцы затрыманы за сваё нелегальнае захапленне. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, непрацуючы грамадзянін шмат гадоў вёў раскопкі ў месцах правядзення баявых дзеянняў або набываў боепрыпасы ў сваіх знаёмых. У 42-гадовага мужчыны канфіскаваны прыдатныя для стральбы патроны, дзве гранаты, частка снарада. На тэрыторыі домаўладання таксама былі знойдзены абрэз вінтоўкі ўзору 1891 года і частка станковага кулямёта Гарунова ўзору 1943 года.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Ну і ну!

УЗЯЎ ГАРАЖ

У Оршы ў гарадскі аддзел унутраных спраў па дапамогу звярнуўся рабочы, які расказаў, што нехта адціснуў металічны профіль даху і трапіў у гараж. Злодзей скраў чатыры аўтамабільныя пакрышкі. Страту пацярпелы ацаніў у 600 тысяч рублёў. Высветлілася, што такім чынам «узяў гараж» 17-гадовы хлопец, раней судзімы за крадзеж. Скрадзенае канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Філасофія Уладзіміра Конана

У ноч з 5 на 6 чэрвеня пайшоў з жыцця вядомы беларускі філосаф, літаратуразнаўца і крытык Уладзімір Конан.

За 78 гадоў жыцця ён шмат паспеў зрабіць для беларушчыны. Напісаў цыкл калектыўных манаграфій па гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі, даследаваў тэарэтыка-метадыялагічныя праблемы філасофіі і культуралогіі, гісторыю эстэтычнай думкі, гісторыю беларускай культуры, беларускі фальклор. Сярод тых, чыё жыццё і творчасць даследаваў і аналізаваў Уладзімір Конан, імёны выбітных беларусаў: Францыска Скарыны, Адама Бабарэкі, Максіма Багдановіча і інш.

Гісторык па адукацыі, Уладзімір Конан з 1962 года працаваў у Інстытуце філасофіі і права АН Беларусі, з 1991 года быў загадчыкам кафедры гісторыі і тэорыі Нацыянальна-асветніцкага цэнтра імя Францыска Скарыны. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1984 года, доктар філасофскіх навук...

Уладзімір Конан нарадзіўся 23 красавіка 1934 года ў вёсцы Вераскава Навагрудскага раёна. Пэўны час пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1959 годзе працаваў настаўнікам, а пазней дырэктарам Стражоўскай васьмігадовай школы Вілейскага раёна. Філосафа заўжды цікавіла беларуская нацыянальная ідэя, і сваёй дзейнасцю ён таксама падтрымліваў і распрацоўваў яе. Грунтоўна і ўсебакова Уладзімір Конан разбіраўся ў пытаннях хрысціянскай рэлігіі і паганства. Сам каталік па веравызнанні, ён шмат сваіх твораў прысвячаў даследаванню каталіцкай дактрыны.

Філосаф пакінуў пасля сябе шмат цікавых разважлівых твораў на беларускай і рускай мовах. Найбольш вядомыя: «Ад Рэнесансу да каталіцызму» (1978), «Адам Бабарэка: крытыка-біяграфічны нарыс» (1976), «Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в.» (1985), «Ля вытокаў самапазнання: Сталенне духоўных каштоўнасцяў у святле фальклору» (1989), «Святло для людзей: Родная мова і культура ў эпоху перабудовы» (1989), «Боская і людская мудрасць: Францыск Скарына: жыццё, творчасць, светапогляд» (1990), «Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі» (2003).

«КАЛІ ЦАЦАК НЕ ХАПАЕ, МЫ ДАМОВІМСЯ З КІТАЕМ...»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Актуальны анекдот. Май, гарачыня. У такую б да вады... Аднак — не канікулы яшчэ: дзеці за партамі сядзяць, маладзенькая настаўніца-практыкантка сказ ім дыктуе: «Кракадзіл вылез з вады і ўлёгся на гальцы».

— А скажыце, слова «галька» з якой літары трэба пісаць, — пытаецца адна з вучаніц, — з вялікай ці з малой?

У настаўніцы мову адняло!.. (Што адказаць?). Але ж не разгубілася — вочкам адным па сшытках кінула. Бачыць: «галька» ўсе вучні напісалі з вялікай. Толькі адзін — з малой. Яна — як за саломінку:

— Вовачка, раскажы, чаму ты гэтае слова напісаў з маленькай літары?

Хлопчык (праз паўзу — на абдумванне):

— Ды таму, Марыя Іванаўна, што я гэту Гальку за чалавека не лічу — знайшла з кім любіцца?! З кракадзілам...

Не разумееце, пры чым гэты звер да чарговага конкурснага здымка, на якім (паглядзелі?) машына з малпай і хлопцамі ў салоне? Ды ні пры чым! А вось Гальку гэту (слова напісана з вялікай літары) спадар Гарачоў... згледзеў, хоць і за кадрам:

Я тут бачу: мужыкі
Дагадзілі Гальцы:
З яе лёгенькай рукі —
Абаім па ляльцы!

Значыцца, не кракадзілы яны. А чым дагадзілі?

Ну, ці мала чым?! Самая складная і нечаканая здагадка ў лісце з Мінска — ад сужэнцаў Астроўскіх:

Люд на дачы, люд на дачы,
Люд на дачы, каб рабіць!
Янка едзе — палайдачыць,
Сваю любую здзівіць.

На думку спадара Гаўрыша з Чавусаў, рабіць гэта варта і трэба — бо сам Бог загадаў:

Жоначкі-каханкі
Любяць абаранкі,
Розныя ласункі,
Кветкі-падарункі...
Маюць хлопцы галаву,
Што вязуць на рандзеву
Малпачку для Інкі,
Котку для Ірынкі.

Падарункі, трэба зазначыць, не дужа каштоўныя — не пярсцёнкі з брыльянтамі, не пуцёўкі ў Парыж... Але ж па сённяшнім часе і гэта радуе:

Мо зашмат было манеўраў?..
Зніклі долары і еўра,
Услед — паліцы нашых крамаў
Папусцелі гэтаксама...
На апошнія рублі
Хлопцы цацак намялі! —

піша спадар Гарачоў. Намялі — для любімых. Гэта ж, згадзіцеся, дарагога каштуе?! Прычым — у поўным сэнсе слова!

(Анекдот, у тэму, як кажуць. Не то ў сталічным ГУМе, не то ў ЦУМе, не то ў «Беларусі» дзед нядаўна шумеў, крычаў, што вось некалі — універмагі як універмагі былі! Людзі з усёй Беларусі з'язджаліся, каб абноўкі купляць! Не тое, што цяпер... Пенсіянерам да прылаўкаў ісці няма чаго... Бабулька яго спыніла. Абурылася: ну, як гэта «няма чаго»? А паабурацца?)

Чым? Падстаў для нервовых узрушэнняў больш чым дастаткова. З «падачы» чытачоў называем самыя асноўныя:

Шые Машка чабурашкаў,
Віцька — возіць на базар.
Толькі робіць ён прамашку:
Не расходзіцца тавар.
Не пра цацкі, не пра лялькі
Сёння думае народ —
Соль і цукар, рыс і манку —
Усё хапае напярод.

Піша так спадарыня Чыгрынава з Вілейшчыны. Дакладней — пісала: ліст датаваны 25-м траўня. Цяпер — ажыятажны попыт на названыя тавары ўжо як быццам знік. Але ж месца меў, як кажуць бюракраты... Альбо — «ціпа быў». І «пракцічаскі» паўсюль...

Гэта — будзем лічыць — прычына першая. Пра другую піша спадарыня Гудачкова з Жыткавічаў. Піша не ў брыво, як кажуць...

Часам наша прамысловасць —
Так спрацуе, — няма словаў:
Нешта злепіць —
страх глядзеці!
І згадай, куды ж падзеці?

У сэнсе — ці на продаж завезці? Ці лепш адразу на сметніцу (калі ведаеш, што не купіць ніхто)? Бо пакупнік (а тым больш цяпер) не будзе траціць грошы на розную бязглуздзіцу...

Ну, хіба ёй рэкламу зрабіць. Альбо... у моду ўвесці: «Некалі ў маёй знаёмай, — піша тая ж спадарыня Гудачкова, — быў цацачны кот. І акурат такі, як гэтая малпа. Яна сама яго купіла. Навошта? Ды, кажа, у многіх ёсць — значыць, гэта модна».

Адсюль — наступныя радкі:

— Што хлапцоў прынудзіла
Везці гэта пудзіла?
Плеш праела цешча зяцю:
«Не прыгожа ў цябе ў хаце!».

Прывязе вось, дома пасадзіць і адразу папрыгажэе.

Бываліца: адна гарадская кабета ў вёску на вяселле паехала. Нешта, безумоўна ж, ела, нешта піла (прымус — гэта святое — быў!), таму ў хуткім часе яе ў суседнюю хату завялі, спаць паклалі. Колькі там часу прайшло, — начлежніца прачынаецца. Навокал (уявіце) — прыцемак. І ў ім — акурат насупраць, перад вачыма дзве... нагі чалавечыя на сцяне вісяць. Маладзіца ў піск, маладзіца ў крык! Да дзвярэй (запёртыя), да вокнаў... Гаспадыня ледзьве спыніла яе: уключыла святло, сказала, што гэта гаспадар яе свае пратэзы павесіў.

Зрэшты — вернемся да нашай малпы. Ёю, мяркуючы па ўсім, цешчу не спалохаеш. А тым больш настолькі, каб яна адразу ў дзверы... Але ж паспрабаваць — можна. Калі з гумарам жанчына, — разам пасмеяцеся, а калі без...

Давядзецца апраўданні шукаць. Найбліжэйшае — сказаць кабеце (не пра яе, крый божа, — пра сябе! Трэба ж быць самакрытычным), што раней вы былі маладым, прыгожым і дурнаватым. Цяпер — засталося толькі апошняе. Цешчы гэта павінна спадабацца. Бо дурнаваты — гэта ж не дурны...

Але нават на іх нашы чытачы рукой не махнулі і ў сваіх подпісах да здымка бяруцца павучаць. Спадар Гарачоў, прынамсі, успомніў, як адзін з сыноў стаў жаліцца бацьку: маўляў, павёз ён жонку ў радзільню, а насустрач ім— чорны кот. «Дурань, не той дарогай павёз!, — крычыць жонка. — Цяпер з-за гэтага ката ў нас дзіцятка чорнае будзе!..» І сапраўды: нарадзіла, глянулі, — чорнае!

Выслухаў бацька сына свайго і пярэчыць не стаў, успомніў толькі, што, калі сам яго матулю ў радзільню вёз, ім асёл па дарозе сустрэўся.

А таму, павучае мужчын спадар Гарачоў, —

Трэба быць асцярожным
і пільным,
Калі жонку вязеш у радзільню:
Бо калі напаткаюць пачвары,
Будуць дзеткі —
страшненькія з твару.

Зрэшты, гэта не найгоршы варыянт. Спадар Старых з Гомеля досыць трапна заўважае:

Раней цацак не хапала,
Бо дзятвы было нямала.
Сталі цацкі выраблять!..
А за што дзяцей купляць?

Вострая праблема! Тым больш што цэны на іх, мусіць, таксама падскочаць? І тады сямейка, якая хацела «прыдбаць» сабе двух маленькіх, «купіць» (свят-свят!) толькі аднаго. А яно ж і так...

Спадар Гаўрыш з Чавусаў піша, што нядаўна чытаў прагнозы навукоўцаў-дэмографаў. На іх думку, калі сітуацыя не зменіцца і людзей у краіне будзе паміраць больш, чым нараджацца, да 2050 года стануць беларусы выміраючай нацыяй. З гэтым, лічыць Валерый Мікалаевіч, трэба нешта рабіць. А вось што? Пытанне для роздуму:

Калі цацак не хапае,
Мы дамовімся з Кітаем...
Тут бяда пад лічбай «раз»:
Мала дзетачак у нас.
Людцы,
да каго ж звяртацца,
Каб народам захавацца?

Ды з усімі яго адметнасцямі!..

У тым ліку — сваім вельмі своеасаблівым пачуццём гумару, якое каторы гадок дэманструюць як чытачы — удзельнікі звяздоўскага конкурсу на лепшы подпіс да здымка, так і яго героі. Паглядзеўшы на іх (два тварыкі на пярэднім сядзенні) сужэнцы Астроўскія ўсклікнулі:

Беларусы! Прыкалісты!
Светлыя галоўкі —
Малпа зверху?
Рві праз мытню!
І без размытнёўкі!

Чаму паблажка такая? Дык на мытні ж пакуль не робаты служаць — жывыя людзі: машын яны безліч бачылі! У тым ліку — з мігалкамі (ці сінімі дзіцячымі вядзерцамі зверху), а вось каб з прыматамі...

Не думайце толькі, што гэтыя «прыкалісты» на размытнёўцы шмат мільёнаў зэканомілі і, пераехаўшы мяжу, пры іх засталіся. Не!

Іх даішнікі спынялі,
Што на хабар спрытныя,
Пасажырка ў вас (казалі)
Дужа ж габарытная!..

З усімі адсюль наступствамі, як лічыць спадар Дубовік з Бярэзіншчыны. Ён жа, дарэчы, ведае, куды гэтую пасажырку вязуць...

Але ж перш — меркаванне мінчанкі Алы Тарасік, чаму пасадзілі:

Цюцька брэша,
вецер — носіць.
Ад яго —
Аж дахі зносіць...
Каб не крыць надвор'е
матам,
Пасадзі на дах прыматаў.

Што хлапцы і зрабілі:

Пасадзілі Станіславу
На фальксвагенаву лаву —
І гайда ў Аўцюкі —
Хай мазоляць языкі!

А гэта, між іншым, ужо ідэя: недзе там пасадзіць... Папрасіць тамтэйшых гумарыстаў (альбо тых, што некалі на фестываль, можа, з'едуцца) нешта прыдумаць... Поспех — гарантаваны!

Зрэшты, мы зноў адхіліліся (калі б гэтага фальксвагена так з боку ў бок ганяла, кіроўцу на экспертызу ўжо завезлі б!)...

То да здымка. Спадарыня Лабажэвіч з Клецка не ўбачыла на ім анічога дзіўнага — спрэс заканамернасці нашага жыцця. Мяркуйце самі:

Закаханы Ясь быў дужа —
На машыне вазіў ружы.
Прапанову зрабіў Вольцы —
Мацаваў на даху кольцы...
Шымпанзэ адкрыла рот —
Едзе, мабыць, на развод.

Ці, мо, здымак зроблены пазней? Пасля скасавання шлюбу? І на ім іншыя, з дазволу сказаць, мужчыны. Адзін з іх (спадарыня Лабажэвіч расказвае):

Маладзічку з дзіцем браў, —
Цацкі гэтыя купляў.
Да другой кіруе Ігнат?
І... усё чыстачкі назад!

Не лепшы і другі:

Падзяліў усю маёмасць
(Нават цацкі!) наш Адам.
А такім жа быў свядомым:
І душу, казаў, аддам...
У пачуццях прызнаюцца,
Абяцаюць век кахаць.
Пры разводах расстаюцца,
Скуру хочучы садраць!

Здараецца, на жаль. І вельмі часта!

Прычым вяртанне — таксама! Менавіта яго ўбачыла на здымку спадарыня Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна:

Едзе бацька да «сірот»
...Каб не рвала цешча рот,
«Намякае» ён здалёку:
Што ўжо пазычыў клёку,
Што не з голымі рукамі —
Дзецям цацкі во вязе,
Чым у справу выхавання
Сваю лепту ўнясе.

Як кажуць, з паршывай авечкі хоць поўсці клок. Але ж на гэтай самотнай ноце агляд завяршаць не будзем. Працытуем некалькі іншых. Ад сужэнцаў Астроўскіх:

Ці то ў школу, ці то ў садзік
Возіць цацкі гэты «ГАЗік».
За якія грошы ўзялі?
Ды з бацькоў ізноў садралі!
У нас паборы сталі нормай.
А камусь —
яшчэ й прыкормам.

Ад спадара Гарачова:

Без эскорту, без аховы
К нам — тэатр Абразцова!
Ідзі, здавалася б, глядзі...
Не, уключаюць дзівідзі.

Ад спадарыні Кусянковай з Рагачоўшчыны:

Цацкі — бізнэс стратэгічны,
І высновы тут лагічны:
Трэба люд абавязаць
Іх за еўры прадаваць.
Дзе валюта — там і слава...
І ўратуецца дзяржава!
І тады мартышку тую
Дружна мы ўганаруем.

Ад спадара Гаўрыша:

Ад вёскі да вёскі
машынка бяжыць —
Гандлююць мужчыны,
каб неяк пражыць
Бамбізы — у плуг бы...
І лёгка пацягнуць,
Ды хлопцы сягоння
такога не прагнуць.

Чаму? Адказ ад спадара Гарачова:

Скажыце,
ну хто з нас не любіць
Канцэртаў
ды розных забаў?!
А вокны —
забітыя ў клубе,
І выцвіла дошка аб'яў...

Ну што з гэтым рабіць — на здымку відаць не толькі вясёлае. «Хаджу вось, — піша спадарыня Гудачкова, — па цэнтральнай вуліцы сваіх Жыткавічаў. Усё прыгожа: кветкі, газоны, дамы пафарбаваныя...».

І далей дадае — ужо вершам:

Прыгажэюць гарады:
Скрозь —
драўляныя грыбы,
Разганяюць адзіноту
Матылькі,
стракозы з дроту.
Абмінеш мядзведзяў рад,
Выйдзеш
да каменных жаб...
Ці не здарыцца такое,
Што забудзецца жывое?!

Адкуль і радкі — у якасці подпісу да здымка:

Во... Вязуць
кудысьці зноў
Паралонавых звяроў.
Можа, у лесе
ці дзе ў садзе
Іх пад дрэвамі рассадзяць?

Ці здзівяць тым самым? Наўрад, як лічыць спадарыня Валянціна:

«Ездзілі мядзведзі
На веласіпедзе»...
Дзеці ўголас:
Ну і што?
Цяпер малпы — на аўто...

(Часам — нават з гранатамі).

Гэта, аднак, не пра нашу малпу (не з нашага здымка), бо тая, што з нашага, едзе, пуза чэша і крычыць:

Добра, хлопцы,
вы зрабілі,
Што на дах мяне
ўсадзілі:
Для «Звязды»
я — о-го-го! —
Супердзорка
«Хто каго?».

Чытачы пра яе што-кольвек напісалі. Хто найлепей, вызначаць таксама ім. І ім жа — на роздум — чарговы здымак.

Што да папярэдняга (там, нагадаем, была дзяўчына, танк і трое малайцоў), то па прызнанні вялікага чытацкага журы, аўтарамі найлепшых радкоў сталі сужэнцы Астроўскія з Мінска, спадары Гарачоў з Іўеўшчыны, Сільчанка з Гомеля, Барысёнак — з Ушаччыны, спадарыні Лабажэвіч з Клецка, Чыгрынава з Вілейшчыны, Кусянкова з Рагачоўшчыны...

Усе іх прапановы яшчэ раз перачытала рэдакцыйнае журы і, крыху паспрачаўшыся, выбрала найлепшую:

«Ехалі танкісты
ўвечары дадому,
Узяліся падвезці
прыгажуню Тому.
Мы, маўляў,
пакажам рычагі і кнопкі,
Мы табе раскажам,
як цаляць у «кропкі»...
Ой, не вер ім, Тома!
І не будзь дурная —
Падмануць, абдураць...
Потым — чорт іх мае.

Аўтар — спадарыня Кусянкова з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна. А гэта значыць, што менавіта туды накіроўваецца прыз за перамогу ў выглядзе бясплатнай падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» (на трэці квартал). Хочаце, каб да вас? Не пытанне! Здымак дадаецца — разглядайце, думайце, пішыце, перапісвайце, дасылайце. А потым...

Потым, дасць бог, будзе чарговы агляд. І чарговае імя пераможцы. Цалкам магчыма — ваша. Удачы!

Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж — словы шчырай удзячнасці ўсім, хто пісаў (і ў гэты раз, і раней), словы шчырых прабачэнняў тым, чые радкі не прайшлі заўсёдны «конкурсны адбор». Паверце, гэта зусім не азначае, што і на наступным этапе ім таксама «нічога не свеціць».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«СЯМЕЙНЫЯ» ДРЭВЫ НА НЁМАНСКАЙ НАБЯРЭЖНАЙ

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

На пачатку Дзён горада ў Гродне дзевяць сямейных пар, якія ўзялі шлюб у мінулую пятніцу, пасадзілі дрэўцы ў скверы маладажонаў у рамках акцыі «Вера, надзея, любоў».

Мяркуецца, што гэтая акцыя не будзе разавай, а пакладзе пачатак новай вясельнай традыцыі ў горадзе над Нёманам. Прычым не толькі на гэтай набярэжнай, але і ў іншых месцах горада. Больш за тое, у Гродне спадзяюцца, што кожная новая сямейная пара не толькі пасадзіць сваё дрэва, але і ў далейшым будзе яго даглядаць. З верай, надзеяй і любоўю. Як і берагчы свой сямейны ачаг.

— Народзяцца дзеці, і як будзе цудоўна, калі вы прыведзяце іх да свайго «сямейнага» дрэва, — сказаў маладажонам старшыня Гродзенскага гарвыканкама Барыс Казялкоў.

Закладка сквера маладажонаў стала далёка не адзіным сюрпрызам да Дзён горада, якія разам з гродзенцамі святкавалі госці з Мінска, абласных цэнтраў краіны і раёнаў Гродзеншчыны, а таксама прадстаўнікі гарадоў-пабрацімаў Гродна з Літвы, Польшчы і Расіі. На вуліцы Брыкеля адкрылі ўчастак рэканструяванай дарогі, адкуль на атрыманых горадам новых аўтобусах (увогуле іх на працягу года набылі 67, ды яшчэ 50 тралейбусаў) удзельнікі гэтай цырыманіі накіраваліся на яшчэ адну — адкрыццё лазневага комплексу па вуліцы Болдзіна. Адна са старэйшых гродзенскіх лазняў быццам зноў нарадзілася і цяпер мае нават міні-аквацэнтр з шырокім наборам аздараўленчых працэдур.

А потым на плошчы Савецкай узнагародзілі лепшых працаўнікоў, пераможцаў конкурсу сярод сродкаў масавай інфармацыі «Залаты Алень Гродна», назвалі імя яшчэ аднаго Ганаровага грамадзяніна горада — дырэктара інстытута «Гроднаграмадзянпраект» Уладзіміра Дзяшко і павіншавалі калектыў Гродзенскай капэлы пад кіраўніцтвам Уладзіміра Борматава з занясенне м у гарадскую Кнігу славы.

А колькі цікавага было ў выхадныя! Гэта і «Фарбы роднага горада» ў выкананні майстроў народнай творчасці, і ўжо традыцыйнае свята «Гродзенскай праўды» пад назвай «Дзень стрыжа» (стрыж — сімвал газеты), і гурман-шоу «Каўбаскі як у казцы» (дзе здзівілі сасіскай дваццаціметровай даўжыні), і розныя конкурсы, у тым ліку сярод асілкаў і... бландзінак. І, вядома, канцэрты, танцавальна-забаўляльныя праграмы...

Дарэчы, да Дзён горада ў Гродне высадзілі каля паўмільёна кветак. Упрыгожаць абласны цэнтр і творцы «Лясной казкі Гродзеншчыны» — 11 майстроў не толькі з Прынямоння, але і з Міншчыны, Брэстчыны, якія правялі пленэр рэзчыкаў па дрэве.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ДТЗ: машына ўрэзалася ў будынак

Учора раніцай — не было яшчэ шасці гадзін — здарылася аварыя на вуліцы Панамарэнкі, 27 у Мінску. Аўтамабіль урэзаўся ў будынак.

Як паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, у выніку ў салоне пакарабачанага аўтамабіля аказаўся заціснутым чалавек. Выратавальнікі, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, выразалі з дэфармаванага кузава аўтамабіля «Хундай-Лантра» пасажыра, асоба якога на момант падрыхтоўкі матэрыялу высвятлялася. Пасля гэтага вадзіцель і пасажыр былі дастаўлены ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАТРЫМАННЕ ЗА ЗАТРЫМАННЕМ

На працягу сутак аднаму нараду асобнага спецыяльнага ўзвода «Дэльта» ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама прыйшлося затрымліваць ліхачоў, якія не выканалі неаднаразовыя патрабаванні аб прыпынку. У мінулым нумары газеты паведамлялася пра выкарыстанне зброі для затрымання аўтамабіля, а 4 чэрвеня а трэцяй гадзіне ночы, прыняўшы меры праследавання, нараду давялося затрымліваць чарговага ліхача.

27-гадовы гродзенец, выпіўшы піва, узяў сваё «Рэно» і паехаў па горадзе. Убачыўшы на плошчы каля чыгуначнага вакзала жазло інспектара, вырашыў не спыняцца. Наадварот, рэзка націснуў на педаль газу і панёсся па вуліцы Будзённага ў кірунку аўтавакзала. Уключыўшы на патрульным «Опелі» гукавую і светлавую сігналізацыю, супрацоўнікі ДАІ паехалі за ім. А ліхач павярнуў на вуліцу Карбышава, затым — на Леніна, Ажэшкі. Выехаўшы з цэнтра горада, праз мікрараён «Дзевятоўка», па аўтадарозе «Гродна-Азёры» ён накіраваўся ў бок Шчучынскага раёна.

Перашкаджаючы сябе абагнаць, сам кіроўца «Рэно» здзяйсняў манеўры, лавіраваў па праезнай частцы. На вузкай дарозе ён часам разганяўся да 180 кіламетраў у гадзіну. Выязджаючы на паласу сустрэчнага руху, вымушаў іншых кіроўцаў рэзка тармазіць і мяняць кірунак руху. А інспектары фізічна не мелі магчымасці затрымаць парушальніка. Зрабілі гэта, калі шырыня праезнай часткі павялічылася.

Да таго часу да затрымання далучыўся яшчэ адзін нарад «Дэльты» на «Шкодзе». У раёне гарпасёлка Астрына Шчучынскага раёна апошняя абагнала «Рэно» ліхача, а «Опель» блакаваў яе ззаду. Затрыманы знаходзіўся ў стане ап'янення (утрыманне алкаголю ў яго арганізме амаль у тры разы перавышала норму). За апошнія тры з паловай гады яго чатыры разы затрымлівалі за рулём п'яным, і ў двух выпадках ён за гэта прыцягваўся да крымінальнай адказнасці. Менш за тры месяцы таму пасля пераздачы экзаменаў атрымаў на рукі сваё вадзіцельскае пасведчанне. На гэты раз зноў пазбавіцца яго.

Алег ДУК, старшы інспектар УДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама.

КОЖНЫ ГОД У РУЖАНАХ

вырашылі сустракацца ўдзельнікі першага фэсту «Ружанская брама»

Ружанская брама.

Рыштаванні Бацькаўшчыны

На першае абласное свята «Ружанская брама» на тэрыторыі былога велічнага сапегаўскага палаца сабралася столькі людзей, як прыкладна бывае на абласных дажынках у якім-небудзь з райцэнтраў. Нават і не чакалі арганізатары. Па-першае, лета, цёплы дзень. Ну, і вядома, спрацавала рэклама. Ды і ружанцы, па ўсім відаць, зачакаліся свята. На гару прыйшлі і старыя, і малыя.

Гістарычныя вехі палаца

З 80-гадовымі жыхаркамі гарадскога пасёлка Зінаідай Мікалаеўнай ЖЫРМОНТ і Марыяй Філіпаўнай ПЕТРАНЕВІЧ мы разгаварыліся пра гісторыю мясцовай славутасці. Жанчыны добра памятаюць, калі ў палацы яшчэ працавалі розныя прадпрыемствы. Зінаіда Жырмонт шмат гадоў пасля вайны хадзіла ва ўсходні флігель на працу. Тут была кантора сельгаспрадпрыемства. А потым людзі пакінулі векавыя муры. Яны пачалі разбурацца. Ахвотныя разбіралі цэглу, камень — што каму трэба.

Да нашага часу захаваліся толькі фрагменты сцен «беларускага Версаля». Варта нагадаць, што Сапегі мелі на тэрыторыі сучаснай Беларусі паўтара дзясятка маёнткаў. Але Ружанскі палац стаў галоўнай рэзідэнцыяй магутнага роду. Канцлер Вялікага Княства Літоўскага, складальнік Статута ВКЛ Леў Сапега ўзвёў раскошны палац. Тут быў знакаміты на ўсю Еўропу тэатр. Наведаць палац лічылі за гонар нават каранаваныя госці. Такія, як каралі Рэчы Паспалітай Жыгімонт I, Уладзіслаў IV, Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Але, як справядліва заўважыў падчас свята Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якімі б шыкоўнымі ні былі палацы, галоўнае — які дух тут лунаў, якімі каштоўнасцямі кіраваліся гаспадары, як выхоўвалі сваіх дзяцей. І ў гэтым сэнсе на першы план выходзіць бібліятэка — галоўны духоўны і інтэлектуальны складнік палаца. Так бывае на гэтым свеце: каменныя сцены разбурыліся, а бібліятэка выстаяла, захавалася. Праўда, у апошнім не наша заслуга. Унікальныя кнігазборы выратавалі іншыя краіны і народы. Нават гадаць страшна, што з імі магло стацца, каб засталіся яны тут, на сваёй гістарычнай радзіме. Але гэта ўжо іншая тэма.

Віртуальная бібліятэка

Менавіта кнігі, сабраныя некалькімі пакаленнямі Сапегаў, вярнуліся ў мінулую суботу ў Ружаны, няхай сабе і ў электронным выглядзе. І гэтую прыстойную віртуальную калекцыю, якая працяглы час стваралася шэрагам навукоўцаў і бібліятэкараў, не сорамна было прэзентаваць тут. У Ружанах аднавілі не толькі ўязную браму былога палаца, але і ўсходні флігель. Тут цяпер размясціўся музей, самы малады ў Брэсцкай вобласці. Пакуль не багата экспанатаў у новых залах музея, але гэта справа часу. Галоўнае, ёсць куды паставіць, пакласці нешта вартае, каб гэта змог убачыць любы наведвальнік. Дарэчы, адным з шыкоўных экспанатаў стаў дыск, створаны пры фінансавай падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве ў рамках міжнароднага праекта «Віртуальная рэканструкцыя бібліятэкі роду Сапегаў».

Цяпер дастаткова ўключыць кампакт-дыск, і можна чытаць адну з 30 поўнатэкставых копій з найбольш знакамітых кніг збору. Арыгіналы захоўваюцца ў Вільнюскім універсітэце, у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў С.-Пецярбургу, у іншых краінах. Калегі падзяліліся інфармацыяй. На дыску ёсць цікавыя навуковыя працы пра гісторыю кнігазбору доктара філалагічных навук з Расіі Мікалая НІКАЛАЕВА і кандыдата філалагічных навук з Брэста Генадзя ПРАНЕВІЧА. На старонках дыска таксама сабраны матэрыялы па генеалогіі роду Сапегаў. Дарэчы, Брэсцкая абласная бібліятэка склала бібліяграфію роду, поўны спіс навуковых і іншых твораў пра Сапегаў — усяго 600 прац. Варта зазначыць, што, у асноўным, публікацыі выходзілі ў Польшчы.

Юны ружанскі краязнаўца.

Разгадаць загадку Сапегаў

Работу па складанні бібліяграфіі ўзначаліла намеснік дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі па навуцы Ала МЯСНЯНКІНА. Ала Мікалаеўна, дарэчы, стаяла ля вытокаў ідэі стварэння віртуальнага кнігазбору Сапегаў. Як сказала яна, з самага пачатку ёй кіраваў блізкі да дэтэктыўнага інтарэс — разгадаць загадку Сапегаў. Гэта другі па магутнасці род у нашым краі пасля Радзівілаў. На працягу стагоддзяў Сапегі

Ала МЯСНЯНКІНА.

ўплывалі на эканоміку, палітыку, культуру сваёй краіны і нават суседзяў. Без інтэрнэта і СМІ яны стваралі грамадскую думку, праводзілі ў жыццё самыя розныя ідэі. Адным словам, рабілі гісторыю.

Паглыбіўшыся ў бібліяграфію «сапегіяны», Ала Мяснянкіна ў адной крыніцы нават сустрэла такую версію, што расійскі Лжэдзмітрый — прадукт палітычных інтрыг Паўла Сапегі. Усё можа быць. Проста названая версія, як і шмат іншых, патрабуе грунтоўнага вывучэння і даследавання. А наогул Ала Міхайлаўна не знайшла ніводнай навуковай дысертацыі, прысвечанай гэтай знакамітай фамілii. Так што для навукоўцаў «сапегіяна» — неўзаранае поле.

Тое, што збліжае народы

А сёння спадчына магутных Сапегаў — тое, што можа збліжаць і аб'ядноўваць розныя народы. Менавіта шыкоўны фаліянт каталога сапегаўскай бібліятэкі, якая захоўваецца ў Вільнюскім універсітэце, паднесла ў дар кіраўніку нашай дзяржавы Даля Грыбаўскайтэ, калі была ў Мінску з афіцыйным візітам. І на ружанскай прэзентацыі замежныя госці, тыя, хто меў дачыненне да выхаду дыска: і расійскі прафесар Нікалаеў, і літоўскі прафесар Альма Бразюнене — дарылі новаму музею кнігі — самы каштоўны падарунак.

Тамара ДАНІЛЮК, дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі, шчыра дзякавала навукоўцам, калегам за каласальную працу, якая наблізіла да нас хоць невялікую частку нашай багатай гісторыі. А старшыня Пружанскага райвыканкама Аляксандр ЮРКЕВІЧ аб'явіў, што свята «Ружанская брама» ад гэтага часу стане штогадовым. І запрасіў усіх у першую суботу чэрвеня сустрэцца ў Ружанах.

Як і на любым падобным святе, быў добры канцэрт з нумарамі сярэднявечнай музыкі, касцюмамі таго часу, быў кірмаш розных тавараў, выстава майстроў народнай творчасці. Для аматараў выпіць-закусіць разгарнулі міні-кавярні. Было вельмі многа моладзі, дзяцей. Запыні любога школьніка — не памылішся, ён раскажа пра гісторыю палаца, прыгадае легенды пра яго. Ружанцы ганарацца сваёй даўніной. Адзін з такіх юных краязнаўцаў расказаў мне самыя неверагодныя легенды, пра якія нідзе нават чытаць не даводзілася. Сказаў яшчэ, што гэта яго любімае месца адпачынку на канікулах. Яны з таварышамі для цікаўных турыстаў заўсёды гатовы правесці экскурсію, у тым ліку за сціплае ўзнагароджанне.

* * *

А позна ўвечары, як сцямнела, неба над Ружанскім палацам расквецілі агні феерверку з элементамі лазернага шоу. Такое відовішча руіны гэтых сценаў, відавочна, бачылі ўпершыню. Трэба прызнаць, што наогул нячаста ладзяцца феерверкі ў гонар бібліятэк і бібліятэкараў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота аўтара.

Імпартная гародніна — пад забаронай у летніках і дзіцячых садках

Турыстычная актыўнасць беларусаў можа стаць прычынай завозу і распаўсюджвання на тэрыторыі нашай краіны халеры і іншых небяспечных кішэчных захворванняў, — папярэджваюць спецыялісты рэспубліканскай санэпідслужбы.

Па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у апошнія гады пра выпадкі захворвання халеры на сваёй тэрыторыі паведамлялі 58 краін. У 2010 годзе эпідэмічныя ачагі небяспечнай інфекцыі рэгістраваліся ў Індыі, Пакістане, Самалі, Камеруне. Надзвычай небяспечная эпідэміялагічная абстаноўка склалася ў Цэнтральнай Афрыцы, а таксама ў краінах Карыбскага басейна. На востраве Гаіці працягваецца эпідэмія халеры, якая мае патэнцыял для пандэмічнага распаўсюджвання. Лік смяротных ахвяр у гэтым рэгіёне перавысіў ужо пяць тысяч чалавек. З Гаіці халера распаўсюдзілася ў Дамініканскую Рэспубліку, дзе ўжо зарэгістравана больш як 1,5 тысячы хворых, прычым адзначана і некалькі лятальных выпадкаў — як і выпадкі завозу інфекцыі ў Венесуэлу, ЗША і Канаду. Спецыялісты прагназуюць не проста працяг эпідэміі на Гаіці, але і нарастанне яе інтэнсіўнасці.

Паводле інфармацыі Міністэрства аховы здароўя Украіны, на 6 чэрвеня ў Марыупалі (Данецкая вобласць) дыягназ «халера» быў пацверджаны ўжо ў 14 чалавек. У двух выпадках установлена носьбіцтва халернага вібрыёна. Мяркуецца, што прычынай захворвання людзей магла стаць марская вада, якая трапіла ў арганізм падчас купання, ці спажыванне ў ежу заражанай рыбы з Азоўскага мора.

У Германіі таксама працягваюць шукаць крыніцу распаўсюджвання кішэчнай інфекцыі, выкліканай высокапатагенным штамам энтэрагемарагічнай кішэчнай палачкай. Гэтая інфекцыя ўжо стала прычынай смерці 22 чалавек. Да таго ж у Германіі ў бальнічных установах знаходзяцца каля 600 пацыентаў з вельмі небяспечным ускладненнем кішэчнай інфекцыі — гемалітыка-ўрэмічным сіндромам, які вядзе да паражэння нырак і цэнтральнай нервовай сістэмы. Нямецкія ўрачы звярнуліся з заклікам да грамадзян папоўніць запасы донарскай крыві, якая патрабуецца ахвярам кішэчнай інфекцыі, колькасць якіх працягвае расці... Адзінкавыя выпадкі небяспечнай кішэчнай інфекцыі адзначаны яшчэ ў 12 краінах. Дабралася гэтая інфекцыя і да ЗША. Практычна ўсе захварэлыя наведвалі Германію або кантактавалі з людзьмі, якія вярнуліся з гэтай краіны. Першапачаткова ў распаўсюджванні інфекцыі западозрылі іспанскія агуркі, але цяпер падазрэнні перакінуліся на прарошчаную сою з фермы пад Гамбургам. Менавіта ў гэтым рэгіёне і зафіксавана максімальная колькасць ахвяр кішэчнай інфекцыі.

Каб не дапусціць пранікненне на нашу тэрыторыю небяспечных кішэчных інфекцый і папярэдзіць групавыя выпадкі захворвання ВКІ Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь было прынята рашэнне прыпыніць транзіт у Расійскую Федэрацыю праз Беларусь гародніны з краін Еўрапейскага саюза і забараніць выкарыстанне імпартнай сырой гародніны (таматаў, агуркоў, лісця салаты) для прыгатавання гатовых страў ва ўстановах адукацыі, дзіцячых дашкольных установах, арганізацыях аховы здароўя, санаторна-курортных і аздараўленчых установах. За ўсімі пасажырамі, якія прыбываюць у Беларусь паветраным, чыгуначным і аўтамабільным транспартам, а таксама за ўсімі таварамі і грузамі ўзмоцнены санітарна-каранцінны кантроль. Пад асаблівай увагай санэпідслужб будуць знаходзіцца ўсе эпідэмічна значныя аб'екты: рынкі і іншыя арганізацыі, якія займаюцца рэалізацыяй насельніцтву харчовых прадуктаў, дзіцячыя летнікі, аздараўленчыя арганізацыі... Усе арганізацыі, што займаюцца арганізацыяй турыстычных паездак беларусаў за мяжу, забяспечваюцца аператыўнай інфармацыяй аб эпідэмічнай абстаноўцы ў замежных краінах, магчымай рызыцы заражэння там халерай і іншымі кішэчнымі інфекцыямі, мерах асабістай прафілактыкі і дзеяннях нашых грамадзян у выпадку інфіцыравання.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Наш адказ спякоце

У цэнтры Мінска каля тысячы чалавек з задавальненнем «падмачылі рэпутацыю»

Тазікі, лейкі, вёдры, водныя аўтаматы і звычайныя пластыкавыя бутэлькі пайшлі ў ход каля фантана сталічнага Тэатра оперы і балета, дзе ў выхадныя дні адбыліся «Мокрыя войны» — масавы флэшмоб, у якім узялі удзел каля тысячы чалавек. Пра гэта мерапрыемства моладзь дамовілася праз групу ў папулярнай сацсетцы «УКантакце». Трапны дэвіз флэшмоба — «Сухіх людзей не бывае!» падхапілі не толькі ўдзельнікі, але і ўсе тыя, хто праходзіў міма.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Да ведама

ТАЙНЫЯ КРЫНІЦЫ БОЛЮ

Наша жыццё немагчыма ўявіць без болю. Але большасць з нас таксама не можа сабе ўявіць, наколькі нечаканымі могуць быць яго прычыны і крыніцы.

Напрыклад, **пляжныя тапкі фліп-флопы** не забяспечваюць нагам дастатковай падтрымкі, што становіцца прычынай болю ў ступнях, шчыкалатках і каленях.

З-за **маленькіх кнопак смартфонаў,** з дапамогай якіх мы адпраўляем смс і лазім па інтэрнэце, можа пачацца артрыт.

Прычынай болю можа стаць нават... **партманет**! Калі вы засунеце яго ў заднюю кішэню штаноў, то ён можа легчы прама на сядалішчны нерв, які потым будзе сціскацца ўвесь дзень.

Большасць з нас, кіруючы аўтамабілем, сядзіць **у няправільных позах** (прыкметна нахіляючыся ўперад галавой), што можа выклікаць боль у шыі.

Актыўныя **відэагульні накшталт Wii,** якія сімулююць рухі, могуць прыводзіць да мноства чыста спартыўных траўмаў — расцяжэння, удару, вывіхаў.

Нават любімы намі **сыр** здольны стаць прычынай галаўнога болю, паколькі ён змяшчае тырамін.

Прычынай болю бывае і **немаўля, якога вы кожны дзень бераце на рукі.** Гэты штодзённы рытуал здольны прывесці да тэндавагініту — запалення сухажыльных похваў (часцей кісцей, перадплечча, галёнкі).

Больш уважліва стаўцеся да **прычоскі**. Туга сцягнуты на патыліцы «конскі хвост» можа прывесці да галаўных болю (асабліва, калі ў вас ёсць схільнасць да мігрэні).

Трэба ўмець правільна спаць, бо ад **позіцыі ў ложку** залежыць, у якім стане вы прачняцеся — бадзёрым або разбітым.

Натуральна, крыніцай болю могуць стаць **спіртныя напоі** ў вялікай колькасці, пераяданне і недаяданне, а таксама перанос цяжараў падчас якога-небудзь пераезду або перастаноўкі.

Працоўнае месца таксама мае вялікае значэнне — крэсла павінна стаяць правільна, рукі не павінны навісаць над клавіятурай і г.д.

Нарэшце, прычынай галаўнога болю можа быць нават **сэкс** — з-за яго павялічваецца крывяны ціск і напружанне мышцаў. Мужчыны, дарэчы, пакутуюць ад сэксуальных галаўных болю часцей, затое жанчыны часцей карыстаюцца імі як прычынай, каб ухіліцца ад блізкасці.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 13 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць прас, сокавыціскалку, электрасушылку або печ ЗВЧ. Розыгрыш прызоў адбудзецца **14 ліпеня 2011 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 23 ліпеня 2011 г.**

Дастаўку электрасушылак і печы ЗВЧ ажыццяўляе рэдакцыя. Астатнія прызы можна атрымаць у рэдакцыі **па 30 верасня 2011 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года і пашпарта. **Пасля 30 верасня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 17.05.11 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 17.05.11 па 30.09.11.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1892 ад 11.05.11, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2011 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ **на III кв. або 2-е паўг. 2011 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету

(індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. | перааддасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2011 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(паштовы індэкс) (адрас) (горад, населены пункт)

«Добра, што план з'явіўся, але ён выклікае шэраг пытанняў...»

План дзеянняў урада Рэспублікі Беларусь па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курса рубля, зацверджаны пастановай Савета Міністраў № 662 ад 25 мая 2011 года, напрыканцы мінулага тыдня з'явіўся на сайце ўрада. У гэтым дакуменце ў 35 пунктах прапісаныя меры па сацыяльнай абароне насельніцтва, па рэалізацыі фінансавай палітыкі, па абароне ўнутранага спажывецкага рынку, па рэгуляванні сітуацыі на валютным рынку, па ліквідацыі цэнавых дыспрапорцый у рэальным сектары эканомікі і па нарошчванні экспарту. З просьбай падзяліцца сваімі ўражаннямі ад гэтага плана дзеянняў мы звярнуліся ў Міністэрства эканомікі, Навукова-даследчы эканамічны інстытут Мінэканомікі, аднак па тых ці іншых прычынах даваць нейкія каментары на гэты конт паўсюль адмовіліся. Сваімі думкамі са «Звяздой» падзялілі толькі Георгій Грыц і Георгій Бадзей.

Георгій ГРЫЦ, кандыдат эканамічных навук, прафесар Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ, намеснік старшыні па інвестыцыйнай палітыцы і мадэрнізацыі эканомікі БНПА:

— Па-першае, дакумент гэты вельмі чаканы. Але адразу выклікаюць здзіўленне дата яго прыняцця і дата яго публічнага абмеркавання: 25 мая ён быў прыняты, і толькі ў пачатку чэрвеня (і то па просьбе і нават па патрабаванні бізнэс-супольнасці) ён быў апублікаваны. Сама назва таксама выклікае пытанне з пункту гледжання акцэнтаў. Дакумент называецца «План дзеянняў урада РБ па забеспячэнні збалансаванага развіцця эканомікі ва ўмовах змянення афіцыйнага курсу рубля». Але і кіраўнік дзяржавы, і ўсё грамадства гаворыць пра тое, што сёння мы трапілі ў крызісную хвалю, і спроба пазбегнуць слова «крызіс», спроба пазбегнуць слоў «антыкрызісныя меры» адразу наводзяць на думку, што тыя, хто рыхтаваў дакумент, або хаваюцца за нейкімі словамі, або не да канца разумеюць сур'ёзнасці мер, якія павінны былі б у гэтым дакуменце быць.

Калі казаць па сутнасці самога дакумента, то найбольш карэктна, з майго пункту гледжання, там прапісана першая частка наконт сацыяльнай абароны насельніцтва. Яна больш-менш адказвае на пастаўленыя пытанні, а пункты з'яўляюцца нечым накшталт нарматыўных актаў прамога дзеяння. Што тычыцца іншых раздзелаў, то яны выклікаюць больш пытанняў, асабліва па валютным рэгуляванні, па абароне спажывецкага рынку. Ну, напрыклад, «аптымізацыя ставак акцызаў на алкагольную прадукцыю і тытунёвыя вырабы ў мэтах іх паэтапнага збліжэння з узроўнем ставак, якія дзейнічаюць у Расійскай Федэрацыі...» Паніка спажыўцоў узнікае не ад таго, што наша насельніцтва недалёкае, а ад адсутнасці дакладнай інфармацыі — будуць цэны павышацца ці не будуць. Бо ніхто ж не сумняваецца, што праз месяц-два соль, халадзільнікі і тэлевізары на паліцах крам будуць. Людзі купляюць тавары таму, што яны падаражэюць. І нельга хавацца за рыторыкай «збліжэння з узроўнем ставак», трэба сумленна казаць, што гэта прывядзе да такога тэрміну да такога павышэння цэн. Ці вось «аптымізацыя рознічных цэн на нафтапрадукты, што рэалізуюцца на ўнутраным рынку, у мэтах ліквідацыі дыспарытэту цэн з сумежнымі дзяржавамі» — дык у мяне адчуванне, што маецца на ўвазе Прыбалтыка, Украіна і Польшча, бо калі пачнём глядзець на Расію, то там на нафтапрадукты цана ніжэй, нават пры ўсіх тых праблемах, якія там ёсць. Таму такая рыторыка, як мне здаецца, яшчэ болей выклікае ажыятаж на спажывецкім рынку. Тут няма элементу сумленнасці, адкрытасці, пра які кажа кіраўнік дзяржавы.

Таму я б гэты дакумент, з аднаго боку, адзначыў як станоўчы (бо нарэшце ён з'явіўся і мы бачым пэўныя крокі, элементы нейкай сацыяльнай абароны), а з другога боку, ён ставіць шэраг пытанняў, якія не маюць адказу. І больш таго, у гэтым дакуменце ў апошняй частцы наогул абазначаны стратэгічныя мэты: павышэнне экспартнага патэнцыялу, пашырэнне функцый Банка развіцця і г.д. Але калі ўжо казаць пра доўгачасовую стратэгію, то я б лепей парэкамендаваў узяць нейкую паўзу і на першым этапе распрацаваць нармальныя і зразумелыя для кожнага спажыўца меры на спажывецкім і валютным рынках, а потым шляхам кансалідацыі, шляхам праходжання экспертызы міжнароднай і бізнэс-супольнасцяў распрацаваць стратэгічны дакумент.

Георгій БАДЗЕЙ, старшыня праўлення Бізнэс саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя М.С. Куняўскага:

— План зыходзіць з таго, як быццам у беларускай эканоміцы нічога не адбылося, і нават не закранае відавочных пытанняў. Вядома, калі глядзець на афіцыйнае рашэнне Нацбанка, то рубель дэвальваваны на 56% — але гэта для набыцця нафты, газу, лекаў. А рэальны бізнэс і рэальнае жыццё сёння ідуць зусім па іншых стандартах, зыходзячы з зусім іншага кошту валюты — не 56%, а 250-300%. У гэтых параметрах сёння жыве рэальны бізнэс. І вось гэтага ўсе імкнуцца не заўважаць, як быццам такога і няма. А трэба было б якраз зыходзячы з такой сітуацыі і падыходзіць да распрацоўкі плана.

І меры па стрымліванні цэн трэба шукаць не ў зніжэнні надбавак, а ў зусім іншай сферы. Я выступаў у пятніцу на Нацыянальным Савеце па працоўных і сацыяльных пытаннях і казаў, што калі мы хочам сапраўды паўплываць на фарміраванне цэн, то калі ласка, ёсць такі інструмент як зніжэнне ставак ПДВ, якія прама звязаны з цэнамі — давайце вернемся ад 20% да хаця б тых жа 18%, якія сёння дзейнічаюць у Расіі.

Сёння трэба абараняць не толькі малаабароненыя слаі насельніцтва і пенсіянераў — давайце таксама падумаем, як зрабіць так, каб у прадпрыемстваў былі рэальныя магчымасці павышэння заработнай платы для тых, хто стаіць у станка. Для гэтага давайце літаральна з другога паўгоддзя разгледзім пытанне хоць бы аб зніжэнні стаўкі падатку на прыбытак. Гэта будзе зусім іншы падыход...

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЗЯЛЁНАЯ ЛІНІЯ

8-801-201-5555

Цяпер інфармацыю аб бяспечным выездзе за мяжу могуць атрымаць бясплатна і абаненты мабільных аператараў МТС і Velcom.

Калі раней бясплатна патэлефанаваць на «гарачую лінію» можна было толькі са стацыянарных тэлефонаў, то з гэтага года ўведзены новы «зялёны» нумар — 8-801-201-5555 — для абанентаў МТС і Velcom.

— Званкі бясплатныя па ўсёй тэрыторыі Беларусі, — удакладняе старшыня ГА «Клуб дзелавых жанчын» горада Брэста Ларыса ІСТОМАВА. — Сярод новых дадатковых паслуг і доступ на кароткі бяскодавы нумар 113. На яго можна патэлефанаваць бясплатна са стацыянарных тэлефонаў, праўда, пакуль толькі з Брэсцкай, Гродзенскай і Гомельскай абласцей. Усе ахвотныя могуць атрымаць і пісьмовыя кансультацыі па электроннай пошце hotline113@tut.by.

За 8 гадоў работы «гарачай лініі» было атрымана больш як 13 тысяч тэлефонных званкоў. З іх 69% — ад жанчын. У асноўным звяртаюцца па пытаннях працаўладкавання і законнай міграцыі, беларусаў цікавяць асаблівасці працаўладкавання ў розных краінах і правілы заключэння працоўных кантрактаў, бяспечны выезд і знаходжанне за мяжой. Жанчыны, якія збіраюцца замуж за іншаземца, таксама цікавяцца сваімі правамі. Уся інфармацыя прадстаўляецца кваліфікаванымі супрацоўнікамі «гарачай лініі» бясплатна і ананімна.

— Мы таксама, — дадала Ларыса Ісмаілава, — аказваем дапамогу пацярпелым ад гандлю людзям і іх сем'ям. За час нашай дзейнасці рэабілітацыйную і рэінтэграцыйную дапамогу атрымала 258 ахвяр гандлю людзьмі. «Гарачая лінія» таксама аказвае садзейнічанне ў вышуку беларусаў. Дзякуючы ў тым ліку і яе працы, на радзіму ўдалося вярнуць 108 чалавек.

Надзея ДРЫЛА.

Бяседныя песні

ЖАНЧЫНА Я...

Жыццё песціла і гартавала Валянціну Карэлікаву. Прырода надзяліла яе магутным творчым талентам, прывяла ў дзівосны свет музыкі. І Валянціна Фёдараўна годна спраўдзіла прыроднае прадвызначэнне. Яна закончыла Гомельскае музычнае вучылішча імя Н. Сакалоўскага (1973), Беларускую кансерваторыю па класе домра (1978). Навучанне сумяшчала з творчай дзейнасцю: працавала ў Палацы культуры чыгуначнікаў г. Гомеля, Беларускім харэаграфічным ансамблі «Харошкі» (тут атрымала ганаровае званне «Заслужаная артыстка Беларусі»). У ансамблі народнай музыкі «Бяседа» — з першага дня яго стварэння, і сумесная праца тут доўжылася каля двух дзесяцігоддзяў.

Але жыццёвыя перыпетыі не перастаюць выпрабоўваць характар Валянціны Карэлікавай на мужнасць, мэтанакіраванасць. Яшчэ немаўлём яна адчула навальнічны подых сямейных стасункаў. Нарадзілася 18 сакавіка 1954 года на поўначы Саюза — у Мурманскай вобласці. А праз паўгода яе перавезлі на Беларусь — да бабулі ў вёску Целяшы Гомельскага раёна. Трывала засталіся ў памяці гады (з 1961 да 1969) знаходжання ў Гомельскім дзіцячым доме № 1. Якія б цяжкасці не выпадалі, яна мудра выходзіла з розных сітуацый. Музыка здымае неспакой, прасвятляе душу. Артыстка авалодала ігрой амаль на ўсіх народных інструментах. Свае здольнасці яна паказала на трох сольных канцэртах, якія адбыліся на сцэнах лепшых канцэртных залаў сталіцы, стала першай выканаўцай шэрагу песень, сярод якіх «Вальс», «Будзьма!», «Жанчына я...».

Уладзімір Скарынкін, добра ведаючы характар артысткі, прысвяціў ёй верш «Жанчына я...», які неўзабаве быў пакладзены на музыку. Гэтая песня весела і вельмі раздумліва перадае сутнасць няўрымслівай асобы. Цяпер, калі столькі пройдзена і шмат перажыта, заслужаная артыстка Беларусі Валянціна Карэлікава ўспрымае жыццёвы шлях як маляўнічую даматканую стужку, з нацыянальным узорам, расквечаным чырвоным, зялёным і чорным колерамі. Але болей на ёй чырвонага ззяння, бо гэта і жыццёвая апантанасць, і радасць перамогі, дзе ўсё суладна з музыкай.

ЖАНЧЫНА Я

Верш Уладзіміра Скарынкіна
Музыка Вячаслава Шарапава

Жанчына я, мяне знявага
І нагаворы без прычын
Так не абразяць, як няўвага
І абыякавасць мужчын.
З рабра Адама, а не з гліны
Я Богам створана была
І не магу пражыць, мужчыны,
Без вашай ласкі і цяпла,
Без вашай ласкі і цяпла.

Прыпеў:*
Вы ружы мне дарыце
І падайце да ног.
Такой мяне любіце,
Якой прыдумаў Бог.

Хаваю хітрасць і каварства
Я ў тайніках сваёй душы.
Але аддаць гатова царства
За рай з хлапцом у шалашы.
Не вінавата я, што Ева
Салодкі забаронны плод
Сарвала ў райскім садзе з дрэва
І стала прагнуць асалод,
І стала прагнуць асалод.

Прыпеў.*

* *Прыпеў спяваецца двойчы.*

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.



ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА III КВАРТАЛ АБО 2-е ПАЎГОДДЗЕ 2011 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ
НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЖЫРАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ! ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	14 600 рублёў на месяц 87 600 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	13 400 рублёў на месяц 80 400 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	24 800 рублёў на месяц 148 800 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	22 200 рублёў на месяц 133 200 рублёў на паўгоддзе

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ»* (праз кіёск РУП «Белсаюздрук»)

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	13 250—13 350 рублёў на месяц 79 500—80 100 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	12 120—12 150 рублёў на месяц 72 720—72 900 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	19 591—22 511 рублёў на месяц 117 546—135 066 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	18 063—20 140 рублёў на месяц 108 378—120 840 рублёў на паўгоддзе

* Залежыць ад рэгіёна

кірмаш штотыднёвы рэкламны выпуск № 22 (684)
аддзел рэкламы 287 17 79

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Вясельная сукенка (400 тыс.), футэрка і інш., вячэрняя сукенка сіняя.
Тэл. МТС 755 71 56.

❒ Катэдж (незавершаны, гатоўнасць 76%), маскоўскі напрамак, пас. Калодзішчы, 14 сотак, вада, газ, ёсць ТУ.
Тэл. 8 017 208 26 13, 8 029 642 53 22.

❒ А/м «Форд Эскорт» 1994 г.в., хачбэк; 1,4; расход бензіну 5,5, добры стан. 2200 у.а.
Тэл. МТС 764 42 91.

❒ Тэрмінова дом у Бягомлі, усе камунікацыі, г/п, гараж, лазня. Цана дагаворная.
Тэл. 8 029 959 08 67.

❒ А/м «Фальксваген-Джэта», 1988 г.в., 1,6 к, ц/з, сіні, г/у, СД-МРЗ, новая гума, добры стан, 1650 у.а. Торг.
Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ А/м ЗАЗ-1102 «Тацрыя», прабег 6000 км, гаражнае захоўванне.
Тэл. 8 029 609 55 07.

❒ Кватэра 2-пакаёвая 3/5, 47х27х9, в/ч Станькава Дзяржынскага р-на, усе выгоды, 30 км ад Мінска.
Тэл. 8 029 854 00 99.

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

«ПРАПАЎЗЦІ АД СТАЛА ДА ШУФЛЯДЫ РАКАМ, ПАМЯТАЮЧЫ, ШТО ТЫ ЛЯЛЬКА...»

Жыццё за кадрам, альбо Як здымаюць «Калыханку»

Прасторны павільён Белтэлерадыёкампаніі, дзе «жывуць» Маляваныч і кампанія, ажывае кожны панядзелак а 10-й гадзіне. За дзень тут здымаюць адразу пяць выпускаў праграмы — на ўвесь тыдзень, таму акцёры Ірына Ганчар, Эмілія Пранскутэ, Уладзімір Варанкоў, Аляксандр Ждановіч і Алена Бікранёва могуць смела назваць бутафорскі пакой другім домам. Прынамсі, па панядзелках.

— Вось кажуць, што панядзелак — цяжкі дзень, — гаворыць рэжысёр «Калыханкі» Наталля ДАНДУКОВА. — Для нашай жа каманды ён цяжкі, пакуль мы не дайшлі да студыі *(усміхаецца. — Аўт.)*. **Там ужо пачынаюцца весялосць, жарты і розыгрышы. Для нас панядзелак — яркі дзень.**

Хто ў цераме жыве?

Сёлета якраз «Калыханку» назвалі лепшай праграмай для дзяцей і юнацтва падчас 7-й нацыянальнай прэміі «Тэлевяршыня», і, як трапна пажартаваў тады акцёр Аляксандр Ждановіч (ён жа Маляваныч), «дзякуй, што за 30-гадовую гісторыю «Калыханка» ўсё ж не засталася незаўважанай».

...На здымачнай пляцоўцы 10 сафітаў: у кадры — вечар. Ля мікшарскага пульта нясе вахту гукарэжысёр, мастак па касцюмах нарыхтоўвае чарговыя аксесуары для Яны і Топы. Максімальна сканцэнтраваная рэжысёр (яна пастаянна робіць паметкі ў сцэнарыі) і ўважлівы аператар — вочы праграмы.

Глядач не бачыць, як пад сталом, седзячы на падушках, а часта і проста, на кукішках, ляльками кіруюць акцёры. Не бачыць гэтых чаравікаў, адстаўленых убок, — нехта з артыстаў пераабуваўся; не бачыць прымацаванага да ножак стала сцэнарыя, па якім арыентуюцца акцёры. Не бачыць мінеральнай вады пад сталом, непрыкметным застаецца і маленькі тэлевізар, па якім акцёры адсочваюць карцінку з камеры. Але адно адчуваюць дакладна — шчырыя эмоцыі і пазітыўны настрой, які ад артыстаў перадаецца і лялькам.

Рэжысёр дае каманду. Хвілінная гатоўнасць. Паехалі.

— Мы часам адну «Калыханку» пішам трыццаць хвілін, а іншы раз — і чатыры з паловай гадзіны, — расказвае «Звяздзе» акцёр Уладзімір Варанкоў, які агучвае мядзведзяня Топу. — Шмат бывае драбязы, якую дэталізуюць сцэнарысты, таму даводзіцца дэманстраваць кожны жэст.

— У мяне кожны сцэнарый за ўсе 20 гадоў, якія я працую ў якасці Топы, пачынаецца са слёз, — працягвае з усмешкай Варанкоў. — Чытаю сцэнарый і дзіву даюся: «На дрэве вісіць Топа галавой уніз і трымае ў лапах арэлі, на якіх катаецца Яна...» Вы ўявілі? — Тут чалавек такое ці зробіць, а трэба, каб лялька. А такі сцэнарый — кожны другі. Нашы сцэнарысты часам настолькі захапляюцца, што забываюць пра акцёраў. «Топа і Яна падыходзяць да шуфляды, выцягваюць яе і пачынаюць там корпацца, а знайшоўшы неабходную рэч, прыносяць яе да стала». Усё добра, каб гэта рабіў чалавек. А ты прапаўзі ракам ад стала да шуфляды, высунь, пакалупайся, дастань і прынясі *(усміхаецца. — Аўт.)*. І ты — лялька!

Але часамі бывае наадварот: чым цяжэйшыя ўмовы ў сцэнарыі, тым больш нечаканым атрымліваецца эфект:

— Калі аднойчы напісалі, што Сплюшык катаецца на каньках на лёдзе, мы доўга думалі, як гэта зрабіць, — распавядае акцёр. — Бо лялька змайстравана такім чынам, што ногі ў яе не могуць рухацца. Але ў выніку Сплюшык у нас не толькі стаяў на каньках, але і катаўся, і нават падаў.

І рукі, і вочы ў акцёраў падчас здымак занятыя. Таму, каб не вучыць на памяць сцэнарыі да ўсіх пяці выпускаў, акцёры прымацоўваць сцэнарый да ножак стала, а для зручнасці абводзяць у гэтых паперках свае словы фламастарам:

— Мы спрабавалі ўжо за гэтыя гады сцэнарыі вучыць. Але калі стрымліваецца тэкст, знікае імправізацыя. А дзяцей не падманеш — таму, каб было прасцей, тэкст чытаем з лістоў.

«Хто звязвае шнуркі Маляванычу?»

І калі акцёраў, якія працуюць пад сталом, ніхто не бачыць, то акцёр Аляксандр Ждановіч працуе ў кадры. А як ён запамінае свае словы? Маляваныч — стрэляны верабей. Ён свае словы ... прымацоўвае да камеры.

— Зрок у мяне добры, — працягвае акцёр. — Ён і выручае — я вешаю тэкст на самую камеру і падглядаю *(усміхаецца. — Аўт.)*. А чытаць так, каб гэтага не заўважылі гледачы, — гэта сапраўднае мастацтва *(смяецца — Аўт.)*. За 15 гадоў, якія я правёў у вобразе Маляваныча, гэтым майстэрствам авалодаў цалкам.

Як расказала «Звяздзе» рэжысёр перадачы Наталля Дандукова, акцёры, якія працуюць пад сталом, — вялікія аматары да розыгрышаў.

— Часцей за ўсё, пакуль Маляваныч сядзіць на крэсле, яны прывязваюць яму шнуркі да ножкі стала альбо крэсла — і акцёр устае ўжо разам з крэслам *(смяецца. — Аўт.)*. Вось толькі я ніколі не паспяваю заўважыць, хто гэта робіць: Яна ці Топа...

— У нас заўжды весела, — прызнаецца актрыса Ірына Ганчар, якая агучвае лісічку Яну. — А яшчэ сцэнарыі касцюміраваныя!

Сцэнарысты: «Іграць дзяўчат-красунь Маляваныч адмаўляецца»

Сярод сцэнарыстаў «Калыханкі», як ні дзіўна, мужчын няма. Сюжэты да дзіцячай перадачы прыдумляюць жанчыны: Вольга Шчукіна, Ларыса Есарція, Алена Фурсава, Наталля Грэчышкіна і Вольга Асмолава. У кожнай з іх ёсць свой месяцовы тэмплан — 22 сцэнарыі «Калыханкі» на пяцярых. У выніку за месяц кожная падае па шэсць-сем тэм.

— З сямі тэм у аўтара прымаецца 4-5, — праводзіць ліквбез Ларыса Есарція, — Дзелім па-брацку: амаль у кожнай з нас раз на тыдзень выходзіць свая тэма. Загадчык аддзела сочыць, каб тэмы не паўтараліся. Выпуск адной «Калыханкі» доўжыцца 14 хвілін. Падводка — тры хвіліны. Гэта значыць, трэба напісаць каля 2,5—3 лістоў у друкаваным варыянце. Але адна рэч — напісаць, іншая — ажывіць на экране, дзе працуюць ужо ўсе разам: і рэжысёр, і аператар, і акцёр.

— А раней працавалі без тэмплана, — узгадвае сцэнарыст Алена Фурсава. — Гэта сёння трэба канкрэтныя тэмы заяўляць. Я часам лаўлю сябе на думцы, што на гэтую тэму я ўжо пісала *(смяецца. — Аўт.)*, але пасля падумаеш і знаходзіш нейкі іншы павarот. Галоўнае, каб маленькім было цікава. Мову стараешся наблізіць — глядзіш на свет вачыма дзіцяці.

Жартаўліва ўзгадваюць жанчыны і выпадак з акцёрам Аляксандрам Ждановічам:

— Маляваныч заўсёды просіць: давайце мне вобразы, чаму я ў вас заўсёды такі сухар. Дык мы яго і Кашчэем, і дамавым, і лешым, і піратам... Аднойчы мы загуляліся і... Тэма была «Гуканне вясны». І Маляваныч па сцэнарыі павінен быў пераапрануцца ў дзяўчыну-красуню — з вянком на галаве. Але іграць жанчыну акцёр адмовіўся. Давялося на хаду перарабляць сцэнарый — чучала лялькі зрабілі з саломы...

***

— Калі ў дзіцячым садку ў маёй унучкі пытаюць, ці праўда гэта, што яе дзядуля — Топа, яна адказвае: мой дзядуля толькі дапамагае Топу, — з гонарам адзначае акцёр Уладзімір Варанкоў. — Увогуле, выпускі «Калыханкі» стараюся не прапускаць. А апошнія тры з паловай гады, як нарадзілася ўнучка, прапусціць калыханку нельга зусім: роў па хаце стаіць такі, што ого-го! У такія хвіліны сваю працу люблю яшчэ больш *(усміхаецца. — Аўт.)*

Ілья ЛАПАТО.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Топ-5 фактаў пра «Калыханку»:

1. Назву «Калыханка» (ад слова «калыхаць») упершыню прыдумала рэдактар галоўнай рэдакцыі «Калыханкі» Ніна Шоба. Кажуць, гэтую назву жанчына прысніла.
2. У кадры герой Маляваныч носіць акуляры, але насамрэч зрок у акцёра Аляксандра Ждановіча добры і акулярамі ён не карыстаецца.
3. Усе акцёры «Калыханкі» маюць прафесійную адукацыю і працуюць у тэатрах.
4. Каб зняць напружанне пасля працоўнага дня, акцёр Уладзімір Варанкоў кожны панядзелак ходзіць у лазню.
5. Некаторы час усе мультфільмы ў праграме перакладаліся на беларускую мову. Але ад гэтай ідэі ў выніку адмовіліся: вельмі цяжка было знайсці беларускамоўных артыстаў, якія маглі б дакладна перадаць тэмбр галасоў вядомых акцёраў Папанава і Лявонава.

У сталіцы плануецца пабудаваць дэльфінарый

Яго плануецца адкрыць у Мінску ў 2014 годзе

— Гэта будзе эксклюзіўны культурна-забаўляльны комплекс, аналагаў якому няма, — расказаў дырэктар кампаніі «Дэльфасвет» Мікалай Агеенка.

Тэрыторыю пад новы аб'ект выдзелілі побач з заапаркам, а дакладней, па другі бок Свіслачы на скрыжаванні вуліц Ташкенцкай і Машынабудаўнікоў. Тут на шасці гектарах размесцяцца два вялікія будынкі. У адным з іх будуць штодзень праходзіць шоу з дрэсіраванымі жывёламі, сярод якіх не толькі дэльфіны, але і маржы, бялухі, марскія коцікі і нават сівуч — марскі леў. У гэтым жа будынку размесцяцца вялікі акварыум для экзатычных жывёл, дзе ахвотнікі змогуць паназіраць за акуламі, скатамі, каракаціцай і іншымі дзіўнымі насельнікамі марскіх глыбінь; а таксама спецыяльныя басейны: адзін для плавання і апускання з акваланга у кампаніі з дэльфінамі, другі — для дэльфінатэрапіі.

Другі будынак у комплексе стане паркам забаў. На плошчы 5 тыс. квадратных метраў з'явяцца каля 30 атракцыёнаў для наведвальнікаў усіх узростаў.

Вольга ЖАРЫНА,

«Мінск—Навіны».

Пажар на балконе з-за недакурка?

Пра пажар у кватэры на шостым паверсе дзевяціпавярховага жылога дома па вуліцы М. Багдановіча амаль у 20 гадзін у цэнтр аператыўнага кіравання пры Мінскі гарадскім упраўленні МНС паведамілі мінакі.

На месцы падчас разведкі пажарныя-выратавальнікі ўстанавілі, што адбылося ўзгаранне маёмасці на балконе і ў жылым пакоі трохпакаёвай кватэры. У выніку пажару закопчаная кватэра, а таксама пашкоджаны прадметы мэблі, тэхніка, аконныя рамы балкона суседняй кватэры. З кватэры, што гарэла, выратаваны сын гаспадыні і яго жонка, з вышэйшых паверхаў былі эвакуяваны чатыры чалавекі. Як мяркуецца, прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні неўстаноўленай асобы (кінуты недакурак з паверха, размешчанага вышэй).

Сяргей РАСОЛЬКА.

КІНО СА ШВЕДСКІХ БЕРАГОЎ

6 чэрвеня Швецыя адзначае сваё нацыянальнае свята — Дзень шведскага сцяга. А ў Мінску з 7 па 10 чэрвеня адбываецца свята кіно. Жыхары сталіцы маюць эксклюзіўную магчымасць абсалютна бясплатна паглядзець найноўшае шведскае кіно.

Кожны вечар а 19-й гадзіне з 7 па 10 чэрвеня ў сталічным кінатэатры «Цэнтральны» ў рамках Дзён культуры Швецыі ў Беларусі будуць праходзіць паказы шведскага кіно: «Дзяўчынка» (2009) Фрэдрыка Эдфельта, дакументальны фільм «Падпарадкаванне» (2010) Стэфана Ярла, «Добраахвотна-прымусова» (2008) Рубена Эстлунда і «Сумнеўна» (2008) Марыі Блум.

Паказы шведскага кіно сталі для Беларусі ўжо традыцыйнымі. Бо з года ў год мы маем цудоўную магчымасць паглядзець на вялікім экране цікавыя актуальныя кінакарціны шведскіх рэжысёраў. Унікальныя гэтыя паказы яшчэ і таму, што немэйнстрымавыя новыя замежныя фільмы айчынны кінапракат набывае надзвычайна рэдка: маўляў, гэта дорага і нерэнтабельна. Але ж беларускі глядач на такое кіно ёсць! Значыць, і паказваць яго трэба. Да таго ж, як ні дзіўна гэта гучыць, такія паказы падтрымліваюць і ўзровень беларускай нацыянальнай культуры, бо фільмы дэманструюцца на мове арыгінала з беларускімі субцітрамі.

Найбольшы інтарэс выклікаюць, напэўна, два фільмы. Карціна «Падпарадкаванне» спадабаецца не толькі аматарам дакументальнага кіно, але прыхільнікам здаровага ладу жыцця і праціўнікам хімічных дадаткаў і іншых шкодных хімічных рэчываў у прадуктах спажывання. «Падпарадкаванне» прысвечана сучаснаму «хімічнаму грамадству», якое бярэ адлік з часоў Другой сусветнай вайны. Паводле фільма, чалавецтва скарыстоўвае 500 млн тон хімікатаў штогод. І не трэба быць навукоўцам, каб разумець, што гэтая лічба расце кожны дзень. Фільм распавядае пра 100 000 хімічных рэчываў, якімі чалавек карыстаецца штодня, і пра тое, як яны ўплываюць на здароўе. Цікава, што на працягу ўсёй працы над фільмам рэжысёра Стэфана Ярла назіраў прафесар Стакгольмскага ўніверсітэта Оке Бергман: аналізаваў хімічны склад крыві аўтара і тлумачыў, што за хімічныя рэчывы там прысутнічаюць.

— Як высветлілася, у маёй крыві некалькі соцень іншародных хімічных элементаў! — не хаваючы шоку, распавядае Стэфан Ярл. — І гэта не харчовыя дадаткі, а хімічныя рэчывы, з якімі мы проста сутыкаемся ў штодзённым асяроддзі: вадкасці для паласкання (фталаты), інгібітары гарэння (PBDE), павярхоўна-актыўныя рэчывы (PFOS, PFOA) і г. д.

Калі вы хочаце даведацца больш пра тое, што ёсць шкоднага ў пральных парашках, ўсялякіх мыйных сродках і як найменш падвяргацца ўздзеянню шкодных рэчываў, якія там знаходзяцца, глядзіце фільм.

Яшчэ адзін своеасаблівы рарытэт — мастацкі фільм «Добраахвотна-прымусова», жанр якога вызначаецца як абсурдысцкая камедыя. Карціна распавядае пра межы, якія героі заракаліся ніколі не пераступаць. Але воляй лёсу яны трапляюць у жыццёвыя сітуацыі, якія прымушаюць герояў пераступіць усе магчымыя межы. Тонкі псіхалагічны фільм, пасля прагляду якога дакладна ёсць над чым паразважаць. Да таго ж стужка мае шмат салідных рэгалій. У тым ліку ўзнагароду за найлепшы фільм на фестывалі ў Бруселі (2008), прыз ФІПРЭСІ на фестывалі ў Маямі (2009) і інш. Прыемнага прагляду!

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

БЕЛАРУСКІ «АСТРАВОК» НА ЛІТОЎСКАЙ ЗЯМЛІ

ДЗЕ ён? Літаральна побач з беларуска-літоўскай мяжой, у Друскінінкаі, ці, як здаўна кажуць гродзенцы, у Друскеніках. Гэта — санаторый «Беларусь», які пабудаваны на сродкі нашага, рэспубліканскага бюджэту. Нядаўна карэспандэнт «Звязды» наведаў адну са старэйшых здраўніц знакамітага горада - курорта (створана ў 1946 годзе). І было прыемна пераканацца, што яна заслужана лічыцца там сярод лепшых.

...Пасля перасячэння беларуска-літоўскай мяжы дзясяткі аўтамабіляў з запоўненымі гаручым бакамі недзе "растваряюцца", і тут, у Друскеніках, вы трапляеце быццам у зусім іншую, далёкую ад розных праблем рэальнасць. Якія там візы, валютны курс, чэргі на пагранпераходзе, салярка ці бензін? Гэта недзе далёка, быццам у іншым жыцці. А тут, у прыватнасці, і паняцця такога няма, як "гадзіна пік" з яго транспартнымі нязручнасцямі. Насустрач — лічаныя машыны, ды і пешаходаў зусім мала на вуліцах. Мо, думаю, усе цяпер папраўляюць здароўе лячэбнымі працэдурамі ў санаторыях, а "ў людзі" выйдуць толькі на вячэрні праменад?

Праўда, ад рэальнага жыцця ўсё ж нікуды не дзецца. І вось яна, "карцінка з натуры". Яшчэ адзін са "старажылаў" курорта, санаторый "Нямунас", куды прыязджалі з усіх куткоў былога СССР, па нейкіх прычынах страціў ранейшых гаспадароў і, пакуль не знайшоўшы новых, ужо даўно мазоліць вочы пустуючай шматпавярхоўкай. Тым больш цікава: а як жа жывецца яго суседу?

Санаторый "Беларусь" знаходзіцца ў цэнтральнай частцы курорта, у лесапаркавай зоне ля Нёмана. Літаральна побач — буйнейшы ва Усходняй Еўропе аквапарк, бюветы з мінеральнай вадой, гарадская плошча забаў, мемарыяльны музей мастака і кампазітара Мікалоюса Канстанцінаса Чурлёніса. А неўзабаве, таксама ў непасрэднай блізкасці ад беларускай здраўніцы, завершыцца будаўніцтва круглагадовай крытай лыжнай трасы.

Спыняюся на аўтастаянцы ля санаторыя "Беларусь". Малады мужчына заўважае, што аўтар гэтых радкоў не выключыў фар, у Літве з ўключаным святлом фар неабходна рухацца ў любы час сутак. У нас такую норму, памятаеце, таксама ўвялі, аднак неўзабаве адмянілі. Дзякую за падказку (калі б не ўключыў святло падчас руху і трапіў на вочы паліцыі, то, мабыць, не мінаваць буйнога штрафу) і цікаўлюся, адкуль ён прыехаў у Друскенікі. Аказваецца, з Гомельшчыны. А побач — машыны з нумарнымі знакамі іншых беларускіх абласцей, а таксама з літоўскімі, польскімі. Звычайная справа, як патлумачыў крыху пазней галоўны ўрач санаторыя Андрэй Кобель. Прыязджаюць таксама з Расіі, Германіі, Ізраіля і іншых краін, што сведчыць аб канкурэнтаздольнасці беларускай здраўніцы на курортным рынку. Рады ўсім, з той толькі розніцай, што для беларусаў расцэнкі некалькі меншыя.

— Вітаю на беларускім "астраўку" літоўскай зямлі, — сустракае карэспандэнта "Звязды" Андрэй Кобель.

Нічога сабе, думаю, "астравок", калі даведваюся аб яго маштабах. У штаце санаторыя каля 400 (!) супрацоўнікаў, у тым ліку каля 70 — з беларускім пашпартам. Ёсць і шмат беларусаў, якія стварылі ў Друскеніках сем'і, атрымалі кватэры і прынялі літоўскае грамадзянства. Але пры гэтым не страцілі пашаны да сваіх каранёў. У санаторыі, дарэчы, ёсць таварыства "Спадчына", праводзяцца святы нацыянальнай культуры. А ў школе пры здраўніцы для дзяцей, якім патрабуецца працяглая па часе медыцынская дапамога (з беларускай вучэбнай праграмай і поўным камплектам падручнікаў), стварылі музей беларускіх народных промыслаў — ткацтва, вышыўкі.

На шчасце, нашаму "астраўку", як распавёў кіраўнік санаторыя і на свае вочы ўбачыў журналіст, хвалі пераходнага перыяду ад савецкай планавай да сучаснай рынкавай эканомікі, у адрозненне ад таго ж "Нямунаса", не пашкодзілі. Больш за тое, за апошні час здраўніца, якая ўваходзіць у сістэму Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі, атрымала, так бы мовіць, другое дыханне. Асабліва пасля ўводу ў 2007 годзе да паслуг кліентаў новага дзесяціпавярховага комплекса.

Андрэй Кобель прапануе спачатку азнаёміцца са здраўніцай. У якасці "гіда" — яго намеснік па медыцынскай частцы Джэма Кісель — дарэчы, наша зямлячка з вёскі Новая Руда Гродзенскага раёна. Цяпер карпусы санаторыя запоўнены на сто працэнтаў (увогуле 539 ложкаў), ды і на ліпень — жнівень усе месцы ўжо заказаны. Профіль здраўніцы — лячэнне захворванняў органаў стаўнікава-кішачнага тракту, апорна-рухальнай сістэмы, неўралагічных захворванняў, у тым ліку цэрэбральнага паралічу ў дзяцей. Дзіцячы кірунак у санаторыі "Беларусь" заўсёды быў прыярытэтным і такім застаецца і зараз. Але ўжо на новым узроўні: каб дзіця не проста прыехала адпачыць, а каб дасягнуць максімальнага аздараўленчага выніку. Прычым створаны ўсе ўмовы для знаходжання ў санаторыі дзяцей разам з бацькамі (больш падрабязна з умовамі атрымання пуцёўкі ў санаторый "Беларусь" можна азнаёміцца ў кожным абласным падраздзяленні Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні).

— Мы бачым, што лячэнне ў нас вельмі эфектыўнае, амаль 99 працэнтаў — ёсць станоўчая дынаміка, — зазначае Андрэй Кобель. — Дзякуючы таму, што ўжо ўмеем не толькі граматна выкарыстоўваць беларускі бюджэтны складальнік. Штогод абараняем у Кіраўніцтве справамі Прэзідэнта Беларусі бізнэс-план і ўжо навучыліся самі зарабляць грошы, маем прыбытак, які, згодна з нашым статутам, накіроўваецца толькі на далейшае развіццё прадпрыемства, набыццё самага сучаснага дыягнастычнага і лячэбнага абсталявання. Можам, так бы мовіць, залезці ва ўсе "адтуліны" чалавечага арганізма і паглядзець, дзе патрэбна лячэнне.

Дарэчы, у Друскеніках толькі ў санаторыі "Беларусь" прапануюцца сапрапелевыя грязевыя аплікацыі, якія актывізуюць ахоўныя сілы арганізма і садзейнічаюць выздараўленню. У так званым саляным пакоі лечаць хранічныя захворванні дыхальнай сістэмы, скуры. Прымяняюць і гірудатэрапію — лячэнне п'яўкамі. Маюць уласную водалячэбніцу, басейн з падводным струмневым масажам, саўну... А яшчэ тут ёсць трэнажорная і фітнэс-залы, кінаканцэртная зала, бібліятэка, більярдная...

Як вырашаюцца для беларускіх грамадзян візавыя пытанні?

— Я вельмі ўдзячны Пасольству Літвы ў нашай краіне за той добры крок, які ім зроблены: шэсць тысяч бясплатных віз для тых беларусаў, хто едзе не проста адпачываць — лячыцца, — гаворыць Андрэй Кобель.

Дарэчы, нядаўна ў Друскеніках Савет самакіравання вызначыў мясцовую пошліну за карыстанне інфраструктурай — два літы за кожную ноч, праведзеную ў горадзе. Гэтыя сродкі мяркуецца накіраваць на добраўпарадкаванне курорта, сквераў і паркаў. Аднак дзяцей, якія прыехалі на лячэнне ў санаторый "Беларусь", гэтая пошліна не тычыцца. Яшчэ адзін добрасуседскі крок.

...Перад ад'ездам у Гродна знаёмлюся, і не толькі ў меню, з асартыментам страў, што прапануюцца гасцям здраўніцы. Гэта, асабліва для іншаземцаў, як сапраўдная "школа" беларускай кухні. Нічога дзіўнага, калі даведваешся, што загадчыца харчовага падраздзялення санаторыя Галіна Бекіш (каля 600 месцаў — дзве сталовыя і кавярня) родам з вёскі Парэчча Гродзенскага раёна. Наш чалавек на зусім не чужой для нас літоўскай зямлі.

Барыс ПРАКОПЧЫК. Фота аўтара.

Пуцёўкі ў санаторый "Беларусь" выдаюцца на падставе даведкі аб стане здароўя, пры наяўнасці адпаведных профілю гэтай здраўніцы медыцынскіх паказанняў і адсутнасці проціпаказанняў, для чаго бацькам трэба звярнуцца у камісію па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні сваёй арганізацыі. Гэтыя пуцёўкі бясплатныя. Што ж тычыцца пуцёўкі для лячэння дзіцяці і аднаго з бацькоў, то яна зараз каштуе 2 мільёны 370 тысяч рублёў. Прычым бацькі плацяць толькі 15 працэнтаў ад гэтага кошту.

Ёсць і так званы камерцыйны складнік. Любы ахвотны можа звярнуцца ў рэгіянальны філіял дзяржаўнай установы «ЦэнтрКурорт». Цэны — у залежнасці ад нумара. Напрыклад, у чэрвені адзін дзень у двухмесным аднапакаёвым нумары — з разліку 36,7 еўра, у аднапакаёвым аднаместным — 45,1 еўра.

Наша даведка

Друскенікі былі звычайнай вёскай, пакуль кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі сваім дэкрэтам ад 20 чэрвеня 1794 года не аб'явіў гэтыя мясціны здраўніцай. А ў 1837 годзе пасля таго, як былі надрукаваны вынікі праведзеных там аналізаў мінеральнай вады, рускі імператар Мікалай I зацвердзіў праект курорта.

Што лечыць друскеніцкая мінеральная вада?

Яна эфектыўная пры лячэнні страўнікавых, кішэчных, мышачных, сустаўных, сардэчна-сасудзістых, гінекалагічных захворванняў, а таксама хвароб пазваночніка, нервовай сістэмы.

Чым карысная тарфяная гразь?

Лячэбныя гразі прымяняюцца пры захворваннях злучальнай тканкі, шкілетна-мышачнай сістэмы, органаў стрававання, суставаў, нерваў, дыхальнай сістэмы.

Якое паветра?

Суперэкалагічнае. Мяккі клімат, іанізаванае паветра ў спалучэнні з сасновымі лясамі і адсутнасцю ў радыусе 50 кіламетраў прамысловасці, якая б забруджвала навакольнае асяроддзе, — ячшэ адзін лячэбны фактар курорта.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 июня 2011 года проводит 2-й повторный открытый аукцион на 9-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
4.	Самолет Ан-24Б № 99902203, дв. Аи-24 с. 2 № Н4912105, дв. Аи-24 с. 2 № Н4012035, дв. ТГ-16 № АТ945005, 5 402 посадки, 3 КВР-1994 г.	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1969	5 118	650 000 000	65 000 000
6.	Вертолет Ми-26 № 34001212131, дв. Д-136 № 2251364001063, дв. Д-136 № 2251364001064, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 722А8В017	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1987	594	3 870 000 000	387 000 000
7.	Вертолет Ми-26 № 34001212104, дв. Д-136 № 2251364001067, дв. Д-136 № 2251364001068, вспомогательная силовая установка ТА-8В № 622А8В006	н.п. Мачулищи, в/ч 06752	1986	593	3 680 000 000	368 000 000
8.	Вертолет Ми-26 № 34001212018, КАУ-140 № 82110014030, КАУ-140 №821100140032, КАУ-140 №821110140041, КАУ-140-01 № 821033010004, дв. ТА-8В № 042А8В058, 1 КВР-1990 г.	н.п. Мачулищи в/ч 06752	1983	1 774	2 270 000 000	227 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж в 11.00 **16 июня 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 часов **14 июня 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **16 июня 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в Центре банковских услуг № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 июня 2011 года проводит 8-й повторный открытый аукцион на 9-м открытом аукционе по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
52	АТМЗ-4,5-375 (автотопливомаслозаправщик) с/о 821216 на Урал-375 ш. 390155, дв. 784793, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1982	4 866 36 м/ч	16 000 000	1 600 000
53	АЦ-5,4-375 (автоцистерна), с/о 10924 на Урал-375 ш. 353707, дв. 418709, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1981	8 525	10 000 000	1 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж в 11.00 **16 июня 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 часов **14 июня 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **16 июня 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в Центре банковских услуг № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 июля 2011 года проводит 11-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег/наработка в м/ч (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
63	Топливозаправщик ТЗ-22М (без тележки) в составе: с/о А831098 с дв. ГАЗ-52-04 № 014256 на п/прицепе ЧМЗАП-5524П ш. 12555; тягач КрАЗ-258Б1, ш. 577823, дв. 418683, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	38 503 1 026	35 000 000	3 500 000
64	ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиационный), с/о А8341216 на МАЗ-5334 ш. 55422, дв. 655610, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	49 224 1 417	25 000 000	2 500 000
65	АЦ-8-5334 (автоцистерна), с/о А8730666 на МАЗ-5334 ш. 98844, дв. 802848, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1987	30 424 284	40 000 000	4 000 000
66	АЦ-8-5334 (автоцистерна), с/о А8320362 на МАЗ-5334 ш. 50277, дв. 638342, 4 кат.	н.п. Михановичи, в/ч 52188	1983	2 578 28,5	40 000 000	4 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж в 11.00 **14 июля 2011 г.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до 17.00 часов **12 июля 2011 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **14 июля 2011 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 278 06 97, факс 224 20 01. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by**

У ДЭЛІ З'ЯВІЛІСЯ «НІЧЫЙНЫЯ» АЎТО КЛАСА «ЛЮКС»

У сталіцы Індыі сталі з'яўляцца кінутыя шыкоўныя аўтамабілі самых дарагіх сусветных марак: Bentley, Aston Martin, Rolls-Royce, Ferrari, Lamborghini. Такіх пакінутых машын налічваецца ўжо больш за 40.

Індыйскае ўпраўленне па зборы звестак аб прыбытках падазрае, што нейкі брытанскі бізнэсмен і прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса Паўночнай Карэі і В'етнама рэалізавалі ў Індыі праз мясцовую сетку аўтасалонаў схему перапродажу сагнаных машын, за кароткі час паклаўшы сабе ў кішэнь мільёны долараў. Усяго за 4-5 гадоў дзеяння гэтай схемы злачынцы змаглі рэалізаваць на рынку Індыі да 400 аўтамабіляў класа "люкс". На іх працягваюць ездзіць індыйскія палітычныя дзеячы, кіназоркі Балівуда, знакамітыя гульцы ў крыкет і шматлікія бізнэсмены. Але зараз яны будуць змушаны пазбаўляцца ад іх або даказваць, што з'яўляюцца добрасумленнымі пакупнікамі. А давесці гэта будзе цяжка, бо ўсе машыны былі прададзены па зніжаным кошце.

Справа ў тым, што попыт у Індыі на аўтамабілі класа "люкс" надзвычай высокі, але імпартныя мыты на іх складаюць 100% ад цэнніка.

СВЯТА ПРОЙДЗЕ НА ЎЗРОЎНІ

У Ганцавічах усё прыведзена ў рух. Цэнтр горада, як і навакольныя вуліцы, у рыштаваннях. Нават узнікае сумненне, што да верасня ўдасца здзейсніць усё задуманае. Да Дня беларускага пісьменства ўжо засталося менш чым тры месяцы.

З чэрвеня на нарадзе ў Ганцавічах адказныя асобы абмяркоўвалі падрыхтоўку да свята. Перад тым, як наведаць аб'екты, у зале пасяджэнняў райвыканкама адбылася кароткая размова.

Для падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства мясцовая ўлада прасіла 232 мільярды рублёў, а ў выніку спыніліся на 92 мільярдах. Са спісу аб'ектаў, якія будуць адноўлены, выключылі Школу мастацтваў, Дом рамёстваў.... Але фінансаванне некаторых аб'ектаў яшчэ не вырашана.

Віцэ-прэм'ер краіны Анатоль Тозік падкрэсліў: «Грошай не хапае, але ці многа трэба, каб прывесці ў парадак школу-інтэрнат? Неабходна мабілізаваць людзей і на месцы рабіць захады... Нешта можна зрабіць і без грошай».

Удзельнікі нарады наведалі гарадскі сквер, пабывалі каля ўнівермага, краязнаўчага музея, гарадскога Дома культуры, мясцовага аддзялення «Белпошты», кінатэатра... А гэта далёка не ўсе аб'екты, якія неабходна абнавіць. На Алеі пісьменства будзе ўстаноўлены помнік Якубу Коласу. У прынцыпе, гэта і някепска. Але ці будзе ён мець мастацкую каштоўнасць? Якраз на помніку Анатоль Тозік і засяродзіў увагу. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар указаў на складанае фінансавае становішча абласнога камбіната «Мастацтва», які трэба падтрымаць.

Адбылася размова і каля мясцовай паліклінікі, якая таксама абнаўляецца.

— Такія аб'екты мы робім не спецыяльна да Дня пісьменства. Неабходна, каб усё было ў норме. Вунь бальніцу ў Лунінцы здолелі зрабіць лепшай у Беларусі, — адзначыў кіраўнік вобласці.

Непрыкметна размова набыла сацыяльнае адценне, і віцэ-прэм'ер А. Тозік заявіў:

— Калі ёсць дзеці, то яны абавязаны глядзець бацькоў. Як у нас бывае? Сын ездзіць на дарагім «Мерседэсе», а маці кінута на ўтрыманні дзяржавы. Так не павінна быць.

Калі агляд аб'ектаў закончыўся, выпала магчымасць задаць некалькі пытанняў віцэ-прэм'еру.

— Анатоль Афанасьевіч, ходам падрыхтоўкі да свята вы задаволены?

— Думаю, што да Дня пісьменства Ганцавічы будуць абноўлены. Работа ідзе, хоць першапачаткова сумненні былі.

— Работа маштабная, з размахам. А як наконт таго, што настаў час эканоміць у сацыяльна-культурнай сферы?

— Магчыма, лепшая эканомія будзе, калі мы навучымся зарабляць грошы, аказваць паслугі. Вунь рэстаўравалі палацы ды замкі, і што далей? Ад іх таксама павінна быць аддача. Супрацоўнікі музея не павінны сядзець склаўшы рукі, а працаваць — у музеях павінны быць наведвальнікі. Акрамя гэтага, эканоміць можна і на штатах — яны бываюць у нас раздутымі.

— А хто іх павінен скарачаць? Мясцовая ўлада, абласная...

— Мясцовая ўлада сама тут ініцыятыву наўрад ці праявіць, у яе свой інтарэс. У такім выпадку неабходна прывесці ў дзеянне адміністрацыйны рэсурс, які і будзе стымуляваць працэс.... Але я хачу яшчэ раз паўтарыць: калі б мы працавалі так, як кітайцы, то жылі б лепш за ўсіх у Еўропе.

А калі падводзіліся вынікі работы нарады, на трыбуну падняліся міністры. Алег Праляскоўскі паведаў, што напярэдадні свята ў Ганцавічах будзе праведзены «круглы стол» з удзелам замежных пісьменнікаў. Міністр інфармацыі пералічыў, на што былі выдзелены грошы яго ведамствам і падкрэсліў, што Дзень пісьменства ўжо даўно стаў значнай падзеяй у жыцці нашай краіны.

Выступленне міністра культуры Паўла Латушкі было даволі эмацыйным.

— Пісьменства немагчыма аддзяліць ад культуры, а фінансуе свята Міністэрства інфармацыі. Што, мы не маглі б выдзеліць на краязнаўчы музей 30 мільёнаў? Маглі б, але зрабіць гэтага не можам, бо ў Міністэрства фінансаў свой расклад. Ведаеце, я для культуры гатовы зняць апошнюю кашулю...

Міністр інфармацыі не стаў пярэчыць, і ў зале ўстанавіўся прыўзняты настрой.

Кіраўнік вобласці запатрабаваў, каб усе аб'екты былі закончаны ў тэрмін — адпаведна з графікам. «Будаўнікам неабходна крыху папрацаваць і ў доўг. За дажынкі, здаралася, разлічваліся на працягу года. Грошы патрэбны, але спачатку патрэбна асвоіць выдзеленыя», — сказаў К. Сумар.

У заключным выступленні Анатоль Тозік падкрэсліў:

— Неабходна больш інфармацыі на беларускай мове, бо дзе яе сёння можна пачуць, як не на Палессі? Будзем спадзявацца, што на гэты раз свята пройдзе лепш, чым у мінулыя гады.

Ганцавічам пашанцавала, што Дзень пісьменства будзе праводзіцца менавіта тут. Адноўчы старшыня райвыканкама Уладзімір Столяр падчас размовы ўздыхнуў: «Каб мне пяцьдзясят мільярдаў, то я з раёна «цацку» зрабіў бы».

Не магу сказаць пра раён, а вось Ганцавічы праз тры месяцы непазнавальна зменяцца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Ганцавіцкі раён.

Ці былі людзі да Адама?

Дыскусійная трыбуна

У суботнім артыкуле «Пра цану і бясцэннасць чалавека і яго жыцця» протаіерэй Г. Рой вяртаецца да дыскусіі, якія распачалі і вядуць на старонках «Звязды» прадстаўнікі духавенства.

Гэта ўжо другі артыкул протаіерэя, а перад ім выказаўся епіскап Гарадзенскі і Ваўкавыскі Арцемій. Царкоўныя іерархі і багасловы сёння атрымалі поўную свабоду выказваць свае погляды, бо чаго варта заява епіскапа «Няхай свет прагнецца пад нас». Я такой свабоды не маю. Гэта вялікі рускі паэт Аляксандр Пушкін мог напісаць «Казку пра папа і яго работніка Балду». Праўда, сёння знайшоўся разумнік у расе, які замяніў папа на купца і назваў А. Пушкіна «глыбока веруючым чалавекам», прычым быццам бы забыў, што паэт з'яўляецца аўтарам «Гаўрыіліяды»!

Выходзячы з гэтага, я не буду ў чарговы раз уцягвацца ў палеміку, а спынюся толькі на выказванні протаіерэя *«Надта цікава мне, як багаслову, тэорыя сп. Свістуновіча пра тое, што, аказваецца, згодна з біблейскім сюжэтам (!), да Адама і Евы таксама жылі людзі. З прадстаўніцай гэтага роду быццам бы і ажаніўся братазабойца Каін. Перачытайце, калі ласка, сп. Свістуновіч уважліва 4 главу кнігі Быцця. Па тэксце Біблії няма абсалютна ніякіх падстаў для такога роду сцвярджэння».*

Адгорнем разам з чытачамі Біблію (Быццё, раздзел 4) і будзем спадзявацца, што тэкст у нашых бібліях адзін і той жа.

«Адам пазнаў Еву, жонку сваю....» — так пачынаецца гэты раздзел. Калі кіравацца Бібліяй, то на гэты момант на Зямлі жывуць толькі двое — Адам і Ева.

Ева зачала і першым нарадзіўся Каін, а затым Авель. І ўжо, адпаведна з Бібліяй, на Зямлі чацвёра — Адам з Евай і двое іх сыноў.

Але здарылася трагедыя: «паўстаў Каін на Авеля, брата свайго, і забіў яго» (раздзел 4, п. 8).

За тое забойства Бог пакараў Каіна. «Ты будзеш выгнаннікам і бадзягам на зямлі», — сказаў Усявышні.

Пасля забойства Авеля на Зямлі засталося толькі трое — Адам з Евай і Каін — іх сын.

А зараз мы чытаем:

«І пайшоў Каін ад твару Госпада: і пасяліўся ў зямлі Нод, на ўсход ад Эдэма» (раздзел 4. п. 16).

І даведаемся, што Каін ажаніўся.

«І пазнаў Каін жонку сваю, і яна зачала. І нарадзіла Еноха. І пабудаваў ён горад, і назваў горад па імені сына свайго — Енох» (раздзел 4, п. 17).

Адсюль і пытанне. Адкуль у Каіна ўзялася жонка? Мы памятаем, што, паводле Біблii, на Зямлі пакуль што жылі толькі трое. Пазней жаніўся і сын Каіна, а значыць, зноў паўстае пытанне.

Але вернемся да Адама і Евы.

«І пазнаў Адам яшчэ жонку сваю і яна нарадзіла сына і дала яму імя — Сіф. Таму што, гаварыла яна, Бог паклаў мне другое семя, замест Авеля, якога забіў Каін» (раздзел 4, п. 25).

Вось і атрымліваецца, што гэта не мая тэорыя, а біблейскі аповед. Калі Біблію ўспрымаць як гістарычна-мастацкі твор, то асаблівых праблем не ўзнікае, але калі мы навуку падмяняем Бібліяй, нас чакаюць непераадольныя праблемы. Багаслоў, напрыклад, павінен адстойваць тэзіс, што свет быў створаны за шэсць дзён і «чалавек разумны» з'явіўся...

У часы Мікалая Каперніка багасловаў цікавіла, колькі анёлаў можа памясціцца на кончыку іголкі. «Вучоныя»-схаласты праводзілі дыспуты і даказвалі, спрачаліся, а ў гэты час малавядомы канонік ужо ведаў, што Зямля круціцца вакол Сонца.

Сёння царкоўнікі чакаюць, калі свет пад іх прагнецца, а разважаць пра анёлаў ужо нявёмка — казка. Але ж з дапамогай казуістыкі і казку можна выдаць за быль.

«Не ведаю, ці адносіць сябе сп. Свістуновіч да якой-небудзь хрысціянскай царквы...», — пытаецца протаіерэй Г. Рой. Крыху нават крыўдна. Няўжо мой апанент не заўважыў, што я не маю ніякіх адносін да рэлігіі, а тым больш «да якой-небудзь хрысціянскай царквы». Магчыма памыляюся, але хіба не хрысціянства паставіла шлагбаум на шляху да Бога і павесіла над ім шыльду: «Ніхто не прыходзіць да Айца, як толькі праз Мяне» (ад Яна, разд. 14, п. 6). І як гэта больш за мільярд мусульман прыйшло да Бога без Хрыста?

Купал маёй Царквы — неба, а свабоднаму чалавеку загон і пастухі не патрэбны.

Калі прускі кароль Фрыдрых II (1740 — 1786 г.г.) наведаў Расію, то захацеў пабываць у храме. Падчас службы кожны раз, як толькі святар заводзіў: «Госпаду Богу памолімся!», кароль прыходзіў у захапленне.

Маліцца Богу па камандзе? Да такога нават у Прусіі не маглі дадумацца.

Дык што, і ў XXI стагоддзі трэба маліцца па камандзе?

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

14 июля 2011 г. проводит открытый аукцион с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Площадь, га	Целевое назначение	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, инженерно-технических условий	Условия проведения аукциона	Объекты недвижимости, подлежащие сносу, и зеленые насаждения, подлежащие вырубке	Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельных участков и сносом, расположенных на них объектов, возмещаемых победителем аукциона землепользователям, бел. рублей	Срок аренды (лет)	Затраты на подготовку документации, бел. рублей	Начальная стоимость, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	ул. Войсковая (бывшая территория воинской части)	0,5175	строительство зданий административно-хозяйственного и производственного назначения	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	На земельном участке произрастает древесно-кустарниковая растительность с отдельно стоящими деревьями. Снос объектов недвижимости производится в установленном законодательством порядке	размещение объекта коммунального хозяйства либо объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автозаправочных и газонаполнительных станций)	здание	56 610 000	50	3 215 105	212 144 232	21 214 000
2	ул. Советская, в районе жилых домов № 163А и № 167А	0,7418	строительство бизнес-центра		участок имеет ограничения в использовании: охранная зона ливневой канализации, подземной кабельной линии связи, водопровода, подземной кабельной линии электропередачи. Подъезд к участку осуществляется по существующей дорожной сети (ул. Советская). Снос объектов производится в установленном законодательством порядке.	проектирование и строительство здания не менее 7 этажей с использованием современных строительных материалов; обеспечить строительство парковочных мест согласно действующим градостроительным нормам; объемы благоустройства прилегающей территории согласовать с администрацией Железнодорожного района г. Гомеля	капитальное строение с инв. № 350/С-80025 по ул. Советская, 163А;	44 320 000	50	2 375 572	481 769 526	48 176 900
								36 080 000				
							капитальные строения с инв. № 300/С-2766 по ул. Советская, 165А;	30 810 000				
								61 620 000				
							капитальные строения с инв.№ 300/С-1806 по ул. Советская, 167А;	61 330 000				
								58 930 000				
							зеленые насаждения, г. Гомель, ул. Советская, 163А;	1 000 000				
								810 000				
							зеленые насаждения, г. Гомель, ул. Советская, 165А;	510 000				
								1 010 000				
							зеленые насаждения, г. Гомель, ул. Советская, 167А.	2 920 000				
								2 800 000				
								Итого 302 140 000				

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объект выставляется на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту в натуре, с проектом договора на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

3. **Аукцион состоится 14 июля 2011 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляются:

4.1 юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

4.2 иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

4.3 представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

4.4 при подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

5. Победитель обязан:

5.1 кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона в белорусских рублях или иностранной валюте по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату платежа.

5.2. Победитель аукциона обязан подписать договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) в течение 15 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона.

6. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням с 9.00 до 17.00 по 8 июля 2011 г. включительно в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: (г. Гомель, ул. Советская, 21, каб. № 4). Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.40 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Примечание. Лот № 1 выставляется на аукцион повторно: газета «Звязда» от 14 января 2011 г.

Контактные телефоны: 77 69 35; 77 67 27, факс: 77 48 85. Наш сайт – www. gorod.gomel.by

Наведванне лясоў — пад забаронай

У сувязі з высокім класам пажарнай небяспекі, які наблізаецца, уводзяцца забароны на наведванне лясоў. Адпаведныя рашэнні прымаюцца мясцовымі выканаўчымі органамі.

Так, паводле інфармацыі прэс-службы Мінлясгаса, у канцы мінулага тыдня было забаронена наведваць лясныя ўгоддзі на тэрыторыі Лунінецкага, Пінскага і Столінскага раёнаў Брэсцкай вобласці, а таксама Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Чацвёрты клас пажарнай небяспекі назіраўся ў больш чым дзесяці раёнах краіны — пераважна па Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Больш за ўсё ўзгаранняў зафіксавана ў лясах Брэсцкай вобласці — 53. 39 пажараў адбылося на Гомельшчыне. Менш за іншых пацярпелі лясы Віцебскай вобласці. Тут адбылося 10 узгаранняў на плошчы 4,8 гектара.

У сувязі са складаным становішчам Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае грамадзян захоўваць правілы пажарнай бяспекі ў лясах. Знаходзіцца ў лясных масівах можна толькі ў тых месцах, дзе ёсць спецыяльна абсталяваныя месцы для адпачынку, стаянкі турыстаў. Распальванне вогнішчаў на іх дазваляецца толькі ў мангалах ці спецыяльна абсталяваных (абкладзеных каменем і абараных) вогнішчах. Забараняецца ўезд на ўсе лясныя дарогі. Парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў лясах і на тарфяніках або забароны на іх наведванне, калі яны не пацягнулі нанясенне шкоды, пагражае папярэджаннем або накладаннем штрафу ў памеры да 875 тысяч рублёў. За распальванне вогнішчаў у забароненых месцах можна атрымаць папярэджанне або штраф да 420 тысяч рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯК ВЫ ЗМАГАЕЦЕСЯ СА СПЯКОТАЙ?

«А я думаю так...»

Той, хто стагнаў зімой ад холаду, можа радавацца: лета прыйшло. Як заўсёды, прыйшло яно не адно, а з гарачым сонцам. Хоць у нас не Дубай, дзе +47, але свайго загару таксама хапае. Што ж рабіць, каб не абгарэць? Дзе знайсці прахалоду ў гарачы чэрвеньскі дзень? Як змагацца са спякотай?

Юлія БУКА, уладальніца аграсядзібы (в. Валодзькава, Глыбоцкі раён):

— Як жа з ёй змагацца? Ніяк не змагаемся (*усміхаецца*. — **Аўт.**). Як гаспадару, вядома ж, складана: кароў у абед не падаіць, на агародзе сохне ўсё (капусту яшчэ дасаджваю, дык трэба паліваць штодзень), ячмень шкада. Добра, як дажджу няма: усяго трэба ў меру. Але нашым гасцям, якія прыязджаюць адпачыць на сядзібу — выгода. Заўчора, вунь, мінскія ўвесь дзень з возера не вылазілі...

Канстанцін ДРАПЕЗА (дуэт «Аляксандра і Канстанцін»):

— На шчасце, у нас ёсць аўтамабіль і сабака. І як з'яўляецца вольная хвіліна, мы з Аляксандрай, беручы сабаку, выязджаем за горад. Бо вядома: тут заводы, асфальт... Бяром з сабою шмат вады, садавіны і гародніны. За Мінскам у нас ёсць любімае месцейка, дзе вельмі ўтульна: свежая прырода, рэчка. Купацца яшчэ не купаліся, але затое гуляем з сабакам. Абавязкова карыстаемся крэмам для загару.

Іван РОЎДА, дэкан філалагічнага факультэта БДУ:

— Трэба падысці на пляж, там спытаць (*смяецца*. — **Аўт.**). У прынцыпе, спосабы дастаткова вядомыя. Піць трэба больш: толькі не гарэлку, а ваду. Больш знаходзіцца ў цені. І па магчымасці, зранку і ўвечары прымаць душ. Што да нашых студэнтак, якіх на факультэце большасць, то з улікам 30 градуснай спёкі робім скідку на дрэс-код. Ды і хлопцам таксама. Адзінае, калі дзяўчаты лягчэй апранаюцца, хлопцам ад гэтага толькі гарачэй (*усміхаецца*. — **Аўт.**).

Катажына ШАЎРУК, фатограф і маладая мама:

— О, мы з сям'ёй з'ехалі на Мінскае мора ад спякоты і да гарачай вады. Таму зараз пойдзем змагацца на пляж. Як маладая мама магу сказаць толькі, што ў дзіцячым пакоі на дзень не адсланяем шторы, каб там было не спякотна. Гуляем толькі пасля чацвёртай гадзіны, бо мая беласкурая Данка вельмі лёгка абгарае. Ну і любімая гульня для яе — залезці ў купальніку ў ванну і гуляць у мора.

Павел ЛАЗОВІК, радыёвядучы:

— Трэба ўжываць шмат пітной вады і менш сядзець пад кандыцыянерам. Ва ўсім павінен быць баланс. Бо напрыклад, пяць гадзін у студыі без кандыцыянера не вытрымаеш, а пад кандыцыянерам — загубіш звязкі. Што да адзення, то варта апранаць натуральныя тканіны, больш хадзіць у адзенні светлых лёгкіх колераў.

Тамара ГАНЧАРОВА, кіраўнік мадэльнага агенцтва:

— Мне падабаецца гарачыня. Зіма ў нас сёлета зацягнулася, таму я доўга чакала лета. А гарачыню я люблю і атрымліваю ад яе задавальненне. У любым выпадку, калі горача — трэба сысці ў цень. Яшчэ я люблю плаваць у басейне. Вечарам магу з'ездзіць на Мінскае мора і паназіраць, як садзіцца сонца.

Апытваў Ілья ЛАПАТО.

БЕЛАРУСКАЕ САФАРЫ — ГЭТА РЭАЛЬНА!

На свае вочы

Да сёлетняга сезону адпачынкаў Нацыянальны парк «Прыпяцкі» падрыхтаваў новы турыстычны прадукт, прэзентацыя якога адбылася з удзелам прадстаўнікоў расійскіх і беларускіх турыстычных кампаній, масмедыя дзвюх краін.

Увогуле, спецыялісты турыстычнай індустрыі і аматары адпачынку ў сэрцы беларускага Палесся ўжо прызвычаіліся да таго, што «Прыпяцкі» ледзь не штогод прапануе новыя маршруты, праграмы, экскурсіі. На гэты раз «разыначкай» стаў Парк дзікіх жывёл і сапраўднае сафары, падчас якога можна наблізіцца да аленяў, дзікоў і зуброў на адлегласць «стрэлу» нават непрафесійнай фотакамеры. Вясёлы цягнічок, з камфортнымі адкрытымі вагончыкамі, абсталяваны такім жа рухавіком, што і тэхніка, з якой вядзецца падкорм жывёлы. Таму лясныя жыхары не толькі не разбягаюцца пры яго набліжэнні, але нават праяўляюць павышаную цікавасць і без усялякай апаскі набліжаюцца на 30-50 метраў.

Для навічкоў сярод наведвальнікаў нацпарку сапраўдным адкрыццём стала прагулка на катарах і маторных лодках па затоках «беларускай Амазонкі» з яе ўнікальнымі пойменнымі дубровамі. Нездарма тут гняздуюцца больш за 200 відаў птушак! Многіх з іх можна было пабачыць на свае вочы, а вопытныя егеры асцярожна, каб не нашкодзіць, дэманстравалі нават

кладкі ў гнёздах. Сапраўдным падарункам некалькім экіпажам стала відовішча заплыву дзіка праз Прыпяць. Гэта прыгожая і моцная жывёліна адважна змагалася з зусім не слабай плынню і хутка схавалася ў хмызняку на супрацьлеглым беразе. Дзе яшчэ такое пабачыш?

Аднак распарадзіцца ўнікальнай некранутай прыродай і ператварыць частку першароднай прыгажосці ў эколага-турыстычны прадукт — справа не з лёгкіх. Кіраўніцтву «Прыпяцкага» на чале з генеральным дырэктарам Сцяпанам Бамбізам гэта ўдалося. Як прызнаецца сам Сцяпан Мікалаевіч, турыстычны напрамак ім давялося некалі распачынаць ледзь не з навеса з мангалам. Ніякіх дадатковых выгод не было. Сёння да паслуг наведвальнікаў і сучасны атэль з рэстаранам, боўлінгам, більярдам, басейнам, і камфартабельныя базы, і гасцявыя домікі, і разнастайныя цікавыя экскурсіі, якія не дадуць сумаваць на працягу ўсяго наведвання жамчужыны Палесся.

...Вяртаючыся ў шумную, мітуслівую сталіцу, абмяркоўвалі з калегамі сітуацыю на рынку турыстычных паслуг Беларусі. Бясспрэчна, Беларусь як краіна, дзе прырода адчула на сабе найменшае ўздзеянне чалавека, вельмі цікавая для іншаземных турыстаў. Сапраўды, эка- і этнатурызм зараз на піку папулярнасці. Аднак, каб скарыстацца сітуацыяй у няпросты для турызму час, «дранікаў і вышыванак», якія ў вялікай колькасці прапануюцца замежнікам некаторымі аграсядзібамі і нават больш буйнымі ўстановамі, ужо недастаткова. Патрэбен комплексны падыход. Такога кшталту, як у «Прыпяцкім». І чым хутчэй гэтым вопытам скарыстаюцца калегі, тым больш шанцаў не страціць пакуль даволі перспектыўны турыстычны патэнцыял Беларусі.

Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.
Фота аўтара.

Яна і ён

ХТО ТАКІ ПАДАБЦАСНІК?

Давайце паспрабуем разабрацца, які сэнс мы ўкладваем у гэтае слова?

Ёсць такія меркаванні.

«Падабцаснік — гэта муж, над якім дамінуе жонка. Падабцаснік — безнадзейна закаханы ў сцерву чалавек».

«Падабцаснік — мужык, які прыняў, што жонка ў доме галоўная. Асноўныя важныя рашэнні прымае яна, а ён не спрачаецца — ён у яе на пабягушках (пры гэтым, напэўна, суцяшае сябе думкамі тыпу: «Ну, гэта ж усе дзеля сем'і, дзеля дзяцей і ўсё такое»)».

«Падабцаснікамі становяцца не толькі мужыкі, першапачаткова слабыя духам, але вельмі часта нармальныя, моцныя духам мужыкі, якія расслабіліся, займеўшы жонку. І ў выніку яна ўзяла ўладу ў сям'і ў свае рукі, пры гэтым і яе характар з часам стаў не вельмі добрым. Аднак гэта не значыць, што мужык павінен быць дэспатам, павінна быць залатая сярэдзіна, і муж — галоўным».

«Падабцаснік — гэта калі на жонцы ўся сям'я і дом трымаецца. Іншых тлумачэнняў не бачу».

«Можа быць і такі варыянт: усё па факце трымаецца на мужчыне (хоць і падабцасніку), а жанчына ўсё выдае за свае дасягненні».

«Падабцаснік мае сваё меркаванне — мабыць, проста эмацыйна або яшчэ як залежыць ад партнёра (комплексы ўсякія), а можа, і «усё ўжо вырашыў» (немінучы парыў адносін, і проста трэба перачакаць да моманту, калі можна будзе сказаць «я сыходжу» і не справакаваць істэрыку, якая ўжо абсалютна не патрэбная). Альбо гэта проста чалавек, якому абы ляжаць і рохкаць (гэта ўжо выхаванне), і яшчэ мноства праяў. У любой з іх падабцаснiцтва — гэта вельмі дрэнна і зневажальна, калі ў цябе ў штанах нешта ёсць, — бо гэта ёсць уласнае і грамадскае прызнанне факту дазволу маніпуляцыі сабой, другараднай ролі, ад чаго мужчына самім сабой быць перастае».

«Мужчыны катэгорый «сямейнік», «жанацік» не маюць нічога агульнага з «падабцаснікам». Але адваротнае меркаванне даволі распаўсюджана і часам дастаўляе нязручнасці ў мужчынскай кампаніі. Але ўсе ў курсе чаму, ды і выглядае гэта цалкам годна: «Ды ну вас з гэтым усім, я толькі жонку хачу!», чым якіясьці каламутныя адмазкі: — «Му-му, мяне мая ізноў біць-лаяць будзе, а потым яшчэ і не дасць...».(гэтая клініка вядомая, але бывае, на жаль)».

«Калі ёсць у сям'і гармонія — і добра: кожны знаходзіць таго, з кім хоча быць (або з кім зручна). Мужыку добра, што за яго жонка ўсё вырашае, — можа з сябрамі піва і не папіць. А калі трэба, можна і дома. Жонка заўсёды ведае, што па першым яе свістку муж тут як тут. Але ён і не асабліва супраціўляецца. На самай справе павінен быць баланс, залатая сярэдзіна ва ўсім, а перабор рана або позна дасць аб сабе знаць. Я не люблю бегаць на задніх лапках, ды і ад другой паловы таксама такога не патрабую — воля ва ўсім».

У слоўніку Ожагава можна знайсці наступнае: «Падабцаснік — гэта муж, які знаходзіцца ў поўным падначаленні ў жонкі (у яе пад абцасам)».

Але ў нашай штодзённасці гэтаму паняццю — «падабцаснік» — часам прыпісваецца і іншы сэнс. Чаму многія могуць успрыняць гэтае слова як абразу? Ці можа слова «падабцаснік» ужывацца ў добрым сэнсе? Ці можна назваць гэтым словам адданага жонцы мужчыну або чалавека, які ўсе свае дзеянні ўзгадняе з жонкай?

Няма адчування, што мы ўсё пераблыталі, змяшалі «мух з катлетамі»?

Давайце ж разбяромся! Раскладзём усё па палічках.

Для пачатку ўспомнім анекдот.

Сядзяць леў і бык, гарэлку п'юць. Раптам у льва зазваніў тэлефон, ён адказвае:

— Так, дарагая. Вядома, дарагая. Ужо іду.

І кажа быку:

— Ну, добра, бык, я пайшоў, жонка чакае.

— Леў! Ды ты што? Ты ж —- ЛЕЎ, цар звяроў, а не падабцаснік! Не можаш жонку на месца паставіць? Мая і піскнуць у мой бок не асмеліцца!

— Дык гэта таму, што ў цябе жонка — карова, а ў мяне — ільвіца!

І што, Леў — падабцаснік, паколькі падпарадкоўваецца жонцы, дазваляе ёй сабой кіраваць? Ён яе так баіцца або паважае? Дзе канчаецца тая тонкая мяжа паміж бязвольнасцю, сляпым падначаленнем і павагай, паміж грэбаваннем уласным меркаваннем і прыслухоўваннем да меркавання жонкі?

Дык якія яны, падабцаснікі? Моцныя, упэўненыя ў сабе, або, наадварот, мямлі без права голасу, «мамчыны сынкі»?

Пачнём ад жаночага пачатку! Гэта значыць, каб у мужчыне жыў падабцаснік, жанчына першапачаткова павінна быць ільвіцай! Так? Або, проста сцервай.

А хто такая сцерва?

Сцерва заўсёды думае пра сябе, яна эгаістычная. Ставіць уласныя інтарэсы, уласнае меркаванне вышэй за ўсё. Яна ўпэўненая ў сваёй прывабнасці. Яна недаступная, а калі «здабыча» атрымана цяжкай працай, яе больш шануеш. Сцерва часта маніпулюе — у ход ідзе ўвесь арсенал жаночай зброі: і спакусlівасць, і скандалы, і пуга, і пернік, і байкоты, і слёзы.

Мусіць, сцервай таксама можна назваць жанчыну з нянростым, цяжкім характарам, схільнай да яркага выплюхвання эмоцый. Яна ўладная, агрэсіўная, крыўдлівая, запальчывая, раўнівая і залішне самалюбівая. Пагадзіцеся, з такой жанчынай не проста ўжыцца. І ёй падыдзе мужчына, які валодае некаторымі асаблівымі ўласцівасцямі — памяркоўнасцю і цярпеннем, згодлівасцю, здольнасцю саступаць і суцяшаць, а дзе трэба — і перакананаць яе ў сваёй сіле. Гэта значыць, з такой жанчынай можна ўжыцца, толькі падпарадкоўваючыся ёй. Значыць, муж у яе — падабцаснік?

А можа, ільвіца не абавязкова сцерва? А проста яна — сапраўдная жанчына, якую мужчына кахае, для якой ён хоча нешта рабіць, з якой хоча жыць, з якой адчувае сябе сапраўдным ільвом!

Чаму мы называем «падабцаснікамі» не толькі мужчын, якія бязвольна падпарадкоўваюцца сваёй «палове», не маюць уласнага меркавання, але і сапраўдных мужчын, якія здзяйсняюць сапраўдныя ўчынкі, для якіх меркаванне жонкі важна, як і ўласнае (такое ёсць), прыстойныя, арыентаваныя на сямейныя каштоўнасці, якія проста ўмеюць кахаць?

У любым выпадку, калі мужчына стаў «падабцаснікам», ён захацеў гэтага сам! І навошта праводзіць нейкія грані? Кожны выбірае той шлях, па якім яму ісці камфортна!

Важныя дробязі

НІЧОГА МЫ НЕ ДРАМАТЫЗУЕМ!

У ЖАНЧЫН САПРАЎДЫ 1300 ПРЫЧЫН ДЛЯ СЛЁЗ

Калі скласці сярэднюю працягласць сітуацый, у якіх жанчына лье слёзы і сур'ёзна злуецца, атрымліваецца велізарная лічба — 53 гадзіны ў год. Такія вынікі новага апытання, праведзенага брытанскімі даследчыкамі сярод сваіх суайчыннiц. У анкетаванні прынялі ўдзел каля чатырох тысяч прадстаўніц цудоўнай паловы чалавецтва.

Штодня жанчыны сутыкаюцца, як мінімум, з чатырма фактарамі, якія або проста раздражняюць, або правакуюць крыўду. За дванаццаць месяцаў іх колькасць дасягае 1300.

Кожны дзень негатыўныя эмоцыі атручваюць жыццё ў сярэднім па 8 хвілін 46 секунд. Часцей за ўсё жанчыны плачуць па панядзелках — нездарма гэты дзень называюць «цяжкім». Сярод найбольш распаўсюджаных прычын для слёз лідзіруюць праблемы ў стасунках з каханым чалавекам. 65% удзельніц апытання хвалююцца з прычыны высокіх цэн і столькі ж, па меншай меры, раз у тыдзень бурчаць з-за няўдалай тэлевізійнай праграмы. 64% жанчын пастаянна незадаволены надвор'ем, а 58% — бытавымі турботамі.

Каля 50% рэспандэнтак непакояцца аб нядобрасумленнай працы ўрада (во як!).

ЧЫМ ВЫШЭЙШЫ ІНТЭЛЕКТ, ТЫМ СКЛАДАНЕЙ ДАЮЦЦА СПАТКАННІ

Навукоўцы ўніверсітэтаў Кембрыджа і Гарварда прыйшлі да высновы, што разумным людзям (а, паводле іх падлікаў, гэта ўсяго 5% насельніцтва) вельмі цяжка знайсці тэмы для размовы на спатканнях. І чым вы разумнейшы, тым больш праблем у вас будзе пры сустрэчах з супрацьлеглым полам. Высокаадукаваныя людзі падчас свайго жыцця набываюць веды, якія не толькі не дапамагаюць ім наладжваць адносіны, але нават перашкаджаюць. Гаворка аб высокіх матэрыях у кавярні або бары здаецца дзіўнай, адпуджвае і не выклікае ніякай цікавасці ў супрацьлеглага полу. Акрамя таго, разумныя асобы рэдка надаюць увагу выбару адзення, якая прыцягвала б позіркі супрацьлеглага полу.

Таму калі ў вас не вельмі «клеіцца» ў асабістым жыцці — з гонарам прылічвайце сябе да 5% найразумнейшых людзей планеты!

«НА МОЙ ВЕК МУЖЧЫН ХОПІЦЬ!»

Мужчыны ўсё-ткі любяць разумных, нягледзячы на ўсе іх запэўніванні і анекдоты. Так што пажадана быць эрудыраванай, чытаць кнігі, і не толькі дэтэктывы і жаночыя раманы, але і класікаў. І не глядзець суткамі «мыльныя» тэлесерыялы. Разбірацца не толькі ў тым, якога колеру сёння ў модзе туфлі, але і ведаць як мінімум парачку вялікіх жывапісцаў.

Не трэба спрабаваць абавязкова прывязаць да сябе мужчыну. Калі ён не хоча быць з вамі — значыць, гэта не ваш мужчына. У вас ёсць свабода выбару, і ў яго ёсць свабода выбару. Не забывайце пра гэта. Вам жа не патрэбен любы аб'ект у штанах? Некаторыя жанчыны са страху (а раптам іншага ўжо не будзе!) гатовыя цярпець абсалютна ўсё!

Чым больш жанчына трывае, тым менш яе паважае мужчына. Ваша жаночая годнасць — гэта ваша карона. Насіце яе па-каралеўску. Паважайце род мужчынскі ў цэлым і кожнага мужчыну ў прыватнасці. Калі вы ўпэўнены, што ўсе мужчыны сво..., то прыстойны мужчына ніколі не з'явіцца на вашым гарызонце.

Дрэннае і добрае не маюць полу. У кожным з нас ёсць чорнае і белае, і часта толькі ад нас залежыць, якім менавіта бокам да нас паварочваецца той або іншы чалавек.

Выкіньце з галавы несусветнае глупства аб тым, што мужчын менш, чым жанчын. Замяніце яе жыццесцвярджальнай думкай: — «На мой век мужчын хопіць». І вывучыце яе на памяць. Калі вас разбудзяць у дзве гадзіны ночы — гэта першае, што вы павінны сказаць. Тады вам сустрэнецца менавіта ваш мужчына!

Падрыхтавала Ева АДАМАВА.

Падрабязнасці

Трымаўся за антэну...

Як мы паведамлялі, на Абуз-Лясноўскім палігоне каля Баранавічаў падчас штабных вучэнняў загінуў старшы лейтэнант са Слоніма, які служыў у 111-й артылерыйскай брыгадзе, што дыслакуецца каля Брэста.

Поўную прычыну няшчаснага выпадку цяпер высвятляе камісія Міністэрства абароны і следчая група Беларускай ваеннай пракуратуры. Вядома толькі, што афіцэр атрымаў траўмы ў выніку электрычнага разраду ад высакавольтнай лініі электраперадач. Ён трымаўся за антэну, калі ваенная тэхніка праходзіла пад высакавольтнай лініяй.

Сяргей ЧЫГРЫН.

Факт

Салярка ў цане

Двое жыхароў в. Агароднікі (Камянецкі раён) «папрацавалі» ноччу на тэрыторыі ААТ «Усход-Камянец» у в. Волчын. Навучэнец сельгаскаледжа і механізатар злілі з трактароў 200 л саляркі, але былі затрыманы аховай.

А каля в. Пінкавічы (Пінскі раён) супрацоўнікі міліцыі і дзяржкантролю «тармазнулі» аўтамабіль «УАЗ-3301», на якім беспрацоўны перавозіў 600 л дызпаліва, якое канфіскавалі.

Сціплая суседка

У Ганцавічах сусед зайшоў да суседкі, а калі вярнуўся дамоў, то ўбачыў, што знікла банкаўская картка.

Пазней жанчына растлумачыла, што картку ў яе забыў сусед. А вось чаму яна зняла з рахунку суседа 520 тысяч....

Ударыла токам

Позна вечарам жыхарка г. Давыд-Гарадок вырашыла падключыць электрапомпу на прысядзібным участку. 48-гадовая жанчына была смяротна траўмавана электратокам.

Калі спякотнае надвор'е...

Толькі за 4 чэрвеня на Брэстчыне ўтапілася чацвёра.

Падчас купання ў р. Мухавец утапіўся беспрацоўны з Брэста, а ў Кобрыне пайшоў на дно гэтай жа ракі жыхар в. Зарэчка з Драгічынскага раёна.

У р. Піна, таксама купаючыся, захлынуўся 26-гадовы пінчук.

Недарэчнасцю можна лічыць смерць 50-гадовага мужчыны з в. Малыя Арлы (Столінскі раён). Пераязджаючы р. Ветліца, ён упаў з павозкі і ўтапіўся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Наўздагон

ПАМЫЎСЯ САМ — ПРЫБЯРЫ СВАЮ ПЛАНЕТУ...

У славуты Ружанскі палац мы прыехалі не ў свята, а назаўтра, бо на мэце мелі грунтоўнае знаёмства з выдатным помнікам нашай супольнай з суседзямі гісторыі і архітэктуры. У свята гэта не вельмі зручна рабіць, бо ў гаспадароў — свае сцэнарыі і свае акцэнты, а для кожнага з нас былі больш важнымі ўласныя ўражанні ад сустрэчы з сапраўдным дыяментам нашай даўніны.

Дык вось, пра ўражанні. Былі мы ў Ружанах не рана, недзе пад абед, бо з Мінска выехалі ў 8 раніцы. Палац, вядома, уражвае — нават пасля таго, як яго бязлітасна, па-варварску пашкуматалі войны і людзі, якія вырашылі будаваць светлую будучыню без палацаў. Старажытныя муры вабяць сваёй грунтоўнасцю, прадуманасцю формаў, веліччу, што нагадвае і пра веліч твайго народа. Нямала папрацавалі рэстаўратары — гатовая ўязная брама, скончаныя знешняя і ўнутраная аздоба ўсходняга флігеля. Але ўсё гэта ты бачыш потым, а найперш цябе непрыемна здзіўляюць рэшткі ўчарашняй раскошы — непрыбраная гара смецця ля ўваходу, пустыя пластыкавыя бутэлькі і пакеты з-пад соку, абгорткі ад марозіва на тэрыторыі палаца. Што дае падставу арганізатару нашай паездкі і вялікаму рупліўцу на ніве зберажэння нашых гістарычных каштоўнасцяў, старшыні Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антону Астаповічу горка пажартаваць: вы можаце ўбачыць тут напамін пра культуру адразу некалькіх стагоддзяў — XVII, калі палац будаваўся, XVIII — калі перабудоўваўся, і нашага — калі ўсё засыпаем пластыкавым смеццем... Адзінокая бабуля цягае па тэрыторыі свае вазкі, куды збірае смецце толькі па ёй адной зразумелым прынцыпе, заадно не забывае прадэгуставаць рэшткі недапітых напояў з бутэлек...

Безумоўна, свята — гэта вялікая праца. Нямала людзей папрацавала, каб яго арганізаваць, падрыхтаваць, удыхнуць душу. Але чаму тыя, хто прыехаў назаўтра (у нядзелю, між іншым, у святочны дзень) павінны псаваць свае ўражанні ад доўгачаканай сустрэчы з перлінай нашай палацавай архітэктуры (якіх не так у нас і многа)? Вядома, усё адразу не схопіш, штаты ў мясцовых камунальнікаў, відаць, не такія ўжо і вялікія (калі яны наогул ёсць). А мы самі? Відаць, у вялікім пасёлку нямала школьнікаў, членаў БРСМ, ды і піянеры, хутчэй за ўсё ёсць. Чым не патрыятычнае выхаванне — хуценька, па-гаспадарску прыбраць тэрыторыю палаца, які ёсць візітовай карткай (прычым якой шыкоўнай!) тваёй малой радзімы! Ды многім пакаленням хопіць тут працы, каб мець зусім адметнае месца на планеце — заснаванае продкамі, дагледжанае нашчадкамі. Між іншым, наш экскурсійны аўтобус быў у той дзень не першым у Ружанах. Былі турысты і меншымі групкамі. Хочацца, каб уражанні людзей ад сустрэчы з сапегаўскім шэдэўрам былі яркімі, чыстымі, выклікалі гонар за продкаў, прымушалі быць вартымі іх.

Уладзімір ЗАЛУЖНЫ.

Считать недействительным страховой полис серии ВС № 3234546 и квитанцию 1-Су № 026473 по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ «Белкоопстрах».

ОАО «Красный Октябрь» (место нахождения: г. Витебск, проспект генерала Людникова, 10) извещает акционеров о проведении 8 июня 2011 года в 9.00 по адресу: г. Витебск, проспект генерала Людникова, 10 (помещение в читальном зале библиотеки) по инициативе директора ОАО «Красный Октябрь» внеочередного общего собрания акционеров со следующей повесткой дня:

1. О совершении ОАО «Красный Октябрь» крупной сделки с ОАО «Белинвестбанк».

2. О наделении директора ОАО «Красный Октябрь» полномочиями на совершение ОАО «Красный Октябрь» крупной сделки с ОАО «Белинвестбанк».

С документами по вопросам повестки дня можно ознакомиться в помещении читального зала ОАО «Красный Октябрь» с 7 июня 2011 года в рабочие дни с 13.00 до 17.00.

Регистрация участников внеочередного общего собрания акционеров будет проводиться 8 июня 2011 года с 8.30 до 9.00 в помещении библиотеки ОАО «Красный Октябрь» на основании документа, удостоверяющего личность, или доверенности.

Список акционеров, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет составлен по состоянию на 7 июня 2011 года.

Справки по телефону в г. Витебске: 8 0212 24 73 18.

УНП 300003144

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Адказы на сканворд

Па гарызанталі: Лабанёўскі. Снад. Пастаў. Аброк. Танір. Аса. Гарэт. Радок. Мангабей. **Па вертыкалі:** Штанге. Канадец. Кабра. Анапа. Сёмін. Мара. Гарэ. «Аса». Анарос. Кант. Стаяс. Бараца. Анке. Нік. Спагам. Аск. Ятаган. Сонка. Асад. Сума. Пором. Ікбыя. «Ака». Анан. Кандат. Хакі. Гамак. Рыс. Парабела. Барон. Раска. Эстрада. Растоў.

ВЯСЕЛЬНЫ АБРАДАВЫ ВЯНОК

Як адзін з галоўных вызначальных атрыбутаў, вянок выкарыстоўваецца і ў вясельнай абраднасці. Вянок нявесты стаў сімвалам яе дзявоцкасці, цнатлівасці. Замужнія жанчыны вянкоў не насілі, не надзявалі на галаву вянкоў і тыя жанчыны, якія бралі шлюб другі раз. Не мела права надзяваць вянок на вяселлі тая дзяўчына, якая страціла цнатлівасць да замужжа. У народзе так і казалі: «Згубіла (або страціла) свой вянок».

● Вясельны вянок плялі як з жывых, так і са штучных кветак (папяровых, зробленых з накрухмаленай тканіны), упрыгожвалі рознакаляровымі, пераважна чырвонымі, стужкамі. Звычайна вянкі плялі напярэдадні вяселля сяброўкі нявесты ці «маладухі» (маладыя жанчыны, якія ў гэтым годзе не выйшлі замуж), суправаджаючы працэс спецыяльнымі абрадавымі песнямі. У некаторых рэгіёнах вянок замянялі абручом, каронай, упрыгожанай бісерам, павязкай, стужкай вакол галавы.

● Вянок, які меў форму круга, пакідаў адкрытай толькі цемянную частку галавы. Таму спачатку галаву накрывалі спецыяльнай «тонкабранай тканінай», або «вэлюмам», а потым надзявалі вянок. Такім чынам, вянок з вэлюмам на сённяшні дзень утвараюць адзіны галаўны ўбор нявесты. Але, перш чым надзець вянок, паўсюдна праводзілі абрад, калі дзявочую касу распляталі і запляталі дзве касы, якія таксама ўказвалі на новы статус нявесты. Прычым жаніх і яго дружына павінны былі «выкупіць» касу нявесты ў брата ці іншых сваякоў.

● Звычайна ўсе гэтыя дзеянні праводзіліся напярэдадні вяселля. На Гомельшчыне вянок нявесце надзявалі ў час выпечкі вясельнага каравая, каб цеста ўзнялося як мага вышэй.

● У час вяселля надыходзіў пэўны момант, калі з галавы нявесты здымалі вянок — сімвал дзявоцкасці і надзявалі (павязвалі) галаўны ўбор замужняй жанчыны — хустку. Трэба адзначыць, што ў залежнасці ад рэгіянальных традыцый і звычаяў вянок з галавы нявесты здымалі ці перад першай шлюбнай ноччу, ці пасля яе або пасля падзелу вясельнага каравая ў хаце жаніха.

● Часцей за ўсё гэта рабілі жанчыны (звычайна свякроўка), у паўднёвых рэгіёнах — мужчыны (свёкар, кум, сват, дзевер). Затым зноў-такі сват ці шафер меральі вянок незамужнім дзяўчатам. Лічылася, якая з дзяўчат першай пасля нявесты надзене яе вянок, тая раней за астатніх возьме шлюб. Таму строга прытрымліваліся традыцыі, каб першай вянок надзела старшая шаферка, а затым астатнія дзяўчаты ў адпаведнасці з узростам, заканчваючы самай малодшай: «Кожнай ягадцы свой час». Часам, перш чым распачаць гэты абрад, вянок трэба было выкупіць тым, хто прыйшоў на вяселле і сам марыў выйсці замуж, — г. зн. моладзі. Пасля таго, як вянок завяршыў «круг», яго вярталі маладым і вешалі над іх галовамі — у чырвоным куце.

● Але і пасля вяселля рытуальныя дзеянні з удзелам вясельнага вянка і вэлюму не заканчваліся: вясельны вянок клалі пад пярыну ў першую шлюбную ноч ці зашывалі ў падушку нявесты; распляталі яго стужкі і кветкі і ўпрыгожвалі імі абразы ў «чырвоным» куце. Вянок маглі схаваць у самым аддаленым куточку, у куфэрку, далей ад людскога вока. Крадзеж вясельнага вянка ці вэлюму прадказваў бяду, хуткае растанне, бясплоднасць, хваробы дзяцей.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.40	21.37	16.57
Віцебск —	4.22	21.35	17.13
Магілёў —	4.30	21.27	16.57
Гомель —	4.36	21.15	16.39
Гродна —	4.57	21.51	16.54
Брэст —	5.07	21.42	16.35

Месяц

Першая квадра 9 чэрвеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Івана, Ферапонта.*

К. *Яўгеніі, Адрыяна, Антонія, Густава, Роберта, Яраслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

7 чэрвеня

Дзве даты

1918 год — у Вільні, у знакамітай друкарні Марціна Кухты, выдадзена «Беларуская граматыка для школ» Браніслава Тарашкевіча. У ёй аўтар абагульніў і замацаваў пісьмовыя традыцыі, якія складваліся ў той час у выданні мастацкай, навукова-папулярнай і публіцыстычнай літаратуры, у друку; улічыў здабыткі тагачаснай лінгвістычнай навукі і вопыт папярэднікаў. Граматыка перавыдавалася 6 разоў.

1956 год — карпарацыя Sony прадставіла публіцы першы хатні відэамагнітафон, які каштаваў 995 долараў. Але да масавага пакупніка першыя бытавыя запісваючыя відэамагнітафоны хлынулі з прылаўкаў магазінаў толькі 7 чэрвеня 1969 года. Натуральна, у Японіі. А ў СССР яны пачалі паступаць у канцы 80-х гадоў. Спачатку ў крамы «Бярозка» за чэкі. У 1988 годзе ва Уладзівастоку відэамагнітафон прапаноўваўся па цане, роўнай паўтара аўтамабіля «Волга».

Цытата дня:

«Характар чалавека ніколі не раскрываецца так яскрава, як тады, калі ён апісвае характар іншага чалавека».

Жан Поль (1763—1825), нямецкі пісьменнік.

Віншую **Святлану Уладзіміраўну ПРАЖЭНІК** з 50-годдзем! Здароўя, поспехаў, шчасця.

Сяброўка Ніна.

Усміхнемся!

Два мядзведзі размаўляюць:

— Я ўчора з'еў некага, а каго — не ведаю: спіна чорная, жывот белы, лапкі брудныя...

— Гэта ж дачнік!

☺

Заўтра я ў гаражы рамантую машыну. А паслязаўтра дома — печань.

☺

— Дачушка, ты чаму сёння прыйшла дадому без перагару? Ты што, пасварылася з дзяўчатамі?

☺

Расійскія футбалісты выйшлі на поле ў сваіх традыцыйных колерах: белыя футболкі, сінія трусы, чырвоныя твары...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 2677. Нумар падпісаны ў 19.30 6 чэрвеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12